ЛіМ

Літаратура і мастацтва

газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

15 ЧЭРВЕНЯ 2001г. № 24/4108 КОШТ 128 РУБ.

МЫ ТУТ ЖЫВЁМ

Генадзь ПАШКОЎ:
"На гэтай зямлі жывём і будзем жыць мы. Жывуць і будуць жыць дзеці нашы, унукі. Тут наша мова гучыць. Тут атуляюць нашы песні. І тут наш лёс агульны. А калі ён агульны, то што нам дзяліць і чаго падладжвацца пад некага, хто на гэтым расколе пасля хціва паласуецца".

4

І МЫ НЕ АДЗІНОКІЯ

Сяргей ЗАКОННІКАЎ:
"Ніхто не запалохае нас і сёння. Беларускія пісьменнікі — не ворагі свайму народу".

5

ДЫК БУДЗЕМ ЖА ВОЛЬНЫМІ...

Вячаслаў АДАМЧЫК:
"Вучыць адзін аднаго трэба найперш уласнымі творамі, а не парадамі, да якой групоўкі прыналежаць, ці да смехаты складзенымі спісамі ці спісанымі пастановамі з забытых сталінска-жданаўскіх дырэктыў",

7

КРУГІ

Верш Васіля МАКАРЭВІЧА

8

ЗІМОВЫ ДОЖДЖ

Апавяданне Веры ЛОЙКІ

9, 12

У РОЗДУМЕ...

З дзённікавых запісаў Пятра ПРЫХОДЗЬКІ

13—15

Наша песня, наша мова...

"Мы не згубімся ў сусвеце..." — зліваўся з музыкай і лунаў у вечаровым паветры трапяткі радок. Адгукаўся ў сэрцы: мо і сапраўды — не згубімся? Пакуль не страчана слова беларускае, самабытнасць айчыннай культуры, суладдзе нацыянальнай паэзіі ды сакавітай мелодыі...

Шосты раз, пераадолеўшы доўгае, трохгадовае маўчанне, прайшло гэтак чаканае многімі свята — Нацыянальны фестываль беларускай паэзіі ды песні "Маладзечна-2001". Дзякуючы тэлетрансляцыям, завітала яно ці не ў кожны дом.Кожны змог адчуць атмасферу падзеі, паслухаць выступленне Прэзідэнта Беларусі, пад патранатам якога адбываўся гэты фестываль, паглядзець асноўныя канцэртныя праграмы, што разгортваліся на вялікай песеннай эстрадзе ў цэнтры Маладзечна. Тры вечары не пакідаў сцэну заслужаны калектыў — Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі на чале з мастацкім кіраўніком фестывалю М.Фінбергам. Шчыравалі вядомыя салісты, папулярныя ансамблі народнай музыкі, маладыя спевакі...

Пачаткоўцы спаборнічалі за фестывальны прыз — аўтамабіль "Жыгулі". Ды галоўнай узнагародай была ўсё ж гарачая ўдзячнасць публікі, якая, не зважаючы на непагадзь, захоплена і зычліва наведвала-падтрымлівала ўсе імпрэзы. А яны вызначаліся разнастайнасцю: у залах, на гарадскіх пляцоўках адбываліся літаратурныя сустрэчы, выступленні беларускіх паэтаў: В.Іпатавай, Л.Дранько-Майсюка, Н.Гальпяровіча, М.Шабовіча, А.Пісьмянкова... Прайшоў аўтарскі вечар кампазітара У.Будніка. Ладкаваліся праграмы знаных дзяржаўных акадэмічных калектываў: народнага хору імя Г.Цітовіча, народнага аркестра імя І.Жыновіча, харавой капэлы імя Р.Шырмы. Сімвалічнымі госцямі завіталі ў Маладзечна "Музы Нясвіжа" — вытанчанае водгулле нядаўняга музычнага фэсту...

За тры дні прагучала больш як 170 самых розных песенных твораў; дэбютавала больш за 20 маладых выканаўцаў (Гран-пры атрымаў Д.Качароўскі з Ваўкавыска, цяпер — новы саліст Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі). Штовечар "зала пад адкрытым небам", разлічаная на 3 тысячы месцаў, перажывала аншлаг. А колькі гледачоў збіралася паблізу галоўнай фестывальнай пляцоўкі, а ля тэлеэкранаў!.. Зрэшты, пра тое, што маглі бачыць і чуць удзельнікі, госці ды цікаўныя назіральнікі маладзечанскага свята, мы распавядзём больш падрабязна ў бліжэйшы ж час.

Н.К.

На здымках: галоўная фестывальная пляцоўка; удзельнікі фестывалю "Спяваем з аркестрам!" выступілі пад кіраўніцтвам М.Фінберга і ў Маладзечне; сёлетні лаўрэат Д.Качароўскі ды старшыня Маладзечанскага гарвыканкама М.Чурсін "выпрабоўваюць" Гран-пры.

Фота Г. ЖЫНКОВА

БУДЗЬМА РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы! Пачалася падпіска на "ЛіМ" на другое паўгоддзе 2001 года. Падпіску можна аформіць у любым паштовым аддзяленні. Кошт індывідуальнай падпіскі на адзін месяц — 690 рублёў, на тры — 2070 рублёў, на паўгода — 4140 рублёў. Кошт ведамаснай падпіскі на адзін месяц — 1800 рублёў, на тры — 5400 рублёў, на паўгода — 10800 рублёў.

Індывідуальны індэкс — 63856.
Ведамасны індэкс — 63857.

КОЛА ДЗЁН

Дзіўныя, нават дзівосныя парадоксы падкідвае жыццё! На пачатку мінулага стагоддзя край наш быў у стане нацыянальнага анабіёзу. У дадатак у свеце ўсё большую сілу набывалі інтэрнацыяналісцкія тэндэнцыі. Тым не менш, і мы, беларусы, збудзіліся і, услед за іншымі народамі Еўропы, памкнуліся да свайго нацыянальнага адраджэння і нават зрабілі досыць рашучую спробу стварыць сваю незалежную, суверэнную дзяржаву.

Сёння на цыферблаце гісторыі — пачатак дваццаць першага стагоддзя. Ды, на жаль, мы па-ранейшаму ў нацыянальнай летаргіі, прытым ці не глыбейшай, чым стагоддзе назад. Максім Багдановіч з болем гаварыў тады, што й душу народа абакралі — "у ёй нават мовы няма". Мова якраз была, яна жыла ў народзе, але не была запатрабавана тагачасным беларускім грамадствам. Сёння ж сітуацыя з мовай горшая. Татальная русіфікацыя цягам стагоддзяў зрабіла сваю справу. Дайшло да таго, што беларуская мова не запатрабавана да жыцця ў сваёй жа, беларускай па назове, дзяржаве! Ды ці ўсё гэтак безнадзейна, як хацелася б сённяшнім ворагам беларушчыны? Свядомыя беларусы не павінны паддавацца роспачы і адчаю. Нас уратуе, з нашай, вядома ж, дапамогай, чарговы парадокс гісторыі. Працэсы ўсеагульнай глабалізацыі жыцця на планеце выдаюць непераадольнымі? Як сказаць! Глабалізацыя спараджае і магутны адваротны працэс — цікавасць, абвастрэнне інтарэсу да нацыянальнага, роднага, крэўнага. Народы не хочуць быць шэрай аднароднай масай. Яны жадаюць быць самімі сабою. І ў гэтым ажыўленні, вяртанні да свайго і мы, беларусы, у рэшце рэшт знойдзем сябе, сваё месца, "свой пачэсны пасад".

Знойдзем, спадарове! Абавязкова знойдзем!

ГАДАВІНА ТЫДНЯ

Мінула 20 гадоў, як чалавецтва сутыкнулася з "чумой новага стагоддзя" — СНІДам. За гэты час ад яго памерлі 22 мільёны чалавек, 36 мільёнаў з'яўляюцца ягонымі носьбітамі. Прагрэсія — страшная, проста жахлівая! І прасвету на пазбаўленне чалавецтва ад гэтае хваробы пакуль што няма, хоць высілкі робяцца велізарныя. На жаль, у ліку краін, дзе СНІД досыць адчувальна заявіў аб сабе, — і наша Беларусь. Мо гэта й выпадкова, але найбольш хворых на СНІД — на самай пацярпелай ад Чарнобыля Гомельшчыне...

ЛІХВЯР ТЫДНЯ

Друк паведаміў пра "безыменнага" глыбоцкага ліхвяра, які за два ўсяго гады "зарабіў", даючы людзям пазыку пад працэнты, амаль 6 мільёнаў рублёў. Паведамленне выклікае неадназначную рэакцыю. З аднаго боку, мераючы ўсё "савецкімі" меркамі, хочацца ўслед за многімі сказаць: ганьба ліхвяру! З другога ж боку... Не ён, ліхвяр, ішоў да людзей, а людзі ішлі да яго і прасілі выручыць, дапамагчы. Дык — за што ганьба? І якім чынам фінансавая міліцыя падлічыла "несумленны" заробак чалавека? І ці правамоцна, як паведамляецца, узбуджэнне супраць яго крымінальнай справы? Новы час — новыя праблемы...

ЗЕМЛЯКІ ТЫДНЯ

У Бераставіцы шануюць землякоў. У раённай бібліятэцы створана партрэтная галерэя людзей, чый лёс спалучыўся з гэтым кутком Бацькаўшчыны. Ёсць тут партрэты народнага героя Кастуся Каліноўскага, славутага мастака Напалеона Орды, слыннага музычнага дзеяча Рыгора Шырмы, падпольшчыка-рэвалюцыянера Сяргея Прытыцкага, паэта Івана Леткі, былога старшыні славутага калгаса "Гвардыя" Андрэя Варанецкага... Галерэя — плён творчасці мясцовых мастакоў Мікалая Жлабовіча і Аляксандра Ваўчка. Добры прыклад для іншых тое, што зроблена ў Бераставіцы. З любові і пашаны да славутых землякоў таксама пачынаецца Радзіма...

АПЕРАЦЫЯ ТЫДНЯ

Слаўная рэчка Лясная, што цячэ паблізу Белай вежы ў Камянцы, вальней і нават шпарчэй панесла сваю плынь. Больш чым дваццаць гадоў яе рэчышча было перагароджана патанулым пантонным мостам, у выніку чаго Лясная абмялела, заглеілася, зарасла трыснягом. Нарэшце яго паднялі, і рэчка акрыяла. Аперацыю на "горле" рэчкі правялі тутэйшыя дарожнікі і механізатары. А колькі яшчэ нашых рэк, рэчак і рачулак чакаюць паратунку?!

ТЭЛЕНАВІНЫ ТЫДНЯ

У часе сустрэчы з калектывам студыі "Беларусьфільм" А. Лукашэнка заявіў аб маючых адбыцца сур'ёзных зменах у кіраўніцтве Першага нацыянальнага тэлеканала. Ён таксама паведаміў, што на базе "СТБ" будзе створаны другі тэлеканал Беларусі. Праўда, калі гэта адбудзецца — невядома. А вось час вяртання ў эфір "8 канала", толькі ўжо на частаце № II, вядомы дакладна: выканаўчы дырэктар ЗАТ "8 канал" П. Чарнаморац паведаміў, што канал пачне вяшчанне з ліпеня. І ўсё ж, як кажуць, дай Бог, калі б гэтыя тэлеканалы былі сапраўды нацыянальнымі...

БРАКАНЬЕРСТВА ТЫДНЯ

Пра гэты ганебны факт распавяла газета "Рэспубліка" за 12 чэрвеня ў допісе Ю. Далінінай "Самы... на дарозе". Аўтарку здзівіла і абурыла відовішча, убачанае на гомельскай трасе каля Лапічаў, што на беразе Свіслачы. Дзесяткі маладых і немаладых людзей прадавалі праезджым... самоў. Сом — рэдкая ў Беларусі рыба, яна толькі год назад, як сцвярджае аўтарка допісу, "выпісана" з "Чырвонай кнігі". Рыба зайшла ў Свіслач на нераст, і вось гэтае матачнае пагалоўе браканьеры бязлітасна знішчаюць. Сапраўды, "ніколі прагныя і дурныя не стануць багатымі, і гэта тычыцца не толькі тых, хто трымаў рыбу ў руках, але і тых, хто купляў яе..."

АДНАЎЛЕННЕ ТЫДНЯ

Грамадскае аб'яднанне "Культурна-асветны цэнтр Язэпа Драздовіча" з Германавіч Шаркоўшчынскага раёна набыў у вёсцы Алашкі гэтага ж раёна сядзібу выдатнага беларускага садавода Івана Сікоры з намерам аднавіць ягоны дом і здзічэлы без догляду ягоны славуты сад. Кіраўнік цэнтра — Ада Райчонак. Паспрыяйце ёй і яе памочнікам-энтузіястам у гэтай добрай справе, добрыя людзі! Памажы ім, Магутны Божа!

У Саюзе беларускіх пісьменнікаў

Адбылося грамадскае абмеркаванне праекта помніка Барысу Сачанку на Маскоўскіх могілках. У пасяджэнні камісіі па творчай спадчыне пісьменніка прынялі ўдзел аўтар праекта скульптар Б. Пуставой, старшыня СБП В. Іпатава, родныя Барыса Іванавіча Сачанкі, прадстаўнікі выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя", сябры камісіі С. Андраюк, Я. Сіпакоў, М. Мятліцкі, пісьменнікі А. Вярцінскі, А. Савіцкі, Я. Каршукоў і іншыя.

Скульптару былі выказаны пажаданні і прапановы, якія ён павінен улічыць пры вырабе помніка. Ён будзе ўстаноўлены ў кастрычніку гэтага года.

●

Два дні гасцямі Чачэрскага і Кармянскага раёнаў Гомельшчыны былі ўдзельнікі творчай акцыі Міністэрства культуры "Майстры мастацтваў — працаўнікам вёскі". Цёпла прымалі чытачы Чачэрскай раённай бібліятэкі пісьменнікаў Навума Гальпяровіча і Анатоля Зэкава. На яе прыйшлі настаўнікі, мясцовыя літаратары, навучэнцы школ і ПТВ, работнікі раённых устаноў культуры. Гасцям было зададзена шмат пытанняў пра пісьменніцкі з'езд, які адбыўся ў сталіцы, пра творчасць пісьменнікаў-землякоў. З увагай слухалі прысутныя вершы сталічных аўтараў і сваіх таварышаў. Адчувалася, што прысутныя засумавалі па такіх спатканнях, бо апошняя падобная сустрэча ў раёне адбылася ў 1993 годзе.

Не менш цікавымі і цёплымі былі сустрэчы пісьменнікаў у Чачэрскім РДК, а ў Карме яны прынялі ўдзел у вялікім канцэрце на цэнтральнай плошчы райцэнтра.

●

Як ні разу да гэтага было насычана паэтычным словам свята беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. У цэнтральным парку пры вялікім наплыве народу адбыліся паэтычныя чытанні. Пра свой творчы шлях і грамадзянскую пазіцыю гаварыла Вольга Іпатава. Яна прачытала новыя вершы, адказала на шматлікія пытанні прысутных. Цікавымі былі сустрэчы маладзечанцаў з паэзіяй Алеся Пісьмянкова, Леаніда Дранько-Майсюка, Навума Гальпяровіча, Міколы Шабовіча.

А на другі дзень у парку сталічныя пісьменнікі выступалі разам з маладзечанскімі літаратарамі — удзельнікамі мясцовага аб'яднання "Купалінка",

Больш за дзве сотні маладзечанцаў сабралася ў цэнтральную бібліятэку на вечарыну, прысвечаную творчасці народнага пісьменніка Беларусі Ніла Гілевіча. Была прадстаўлена кампазіцыя пра жыццёвы і творчы шлях Ніла Сымонавіча, чыталіся яго вершы. У вечарыне прынялі ўдзел Вольга Іпатава, Леанід Дранько-Майсюк, Навум Гальпяровіч, Алесь Пісьмянкоў. Гледачы з вялікай цікавасцю і ўвагай сустрэлі іх выступленні, цёпла прымалі кожны верш, задавалі пытанні, прасілі аўтографы. Удзельнікі гэтай сустрэчы запрашалі пісьменнікаў прыязджаць часцей, жадалі нашаму творчаму саюзу і яго кіраўніцтву поспехаў у справе прапаганды роднай літаратуры, выказвалі падтрымку дзейнасці старэйшай творчай суполкі краіны.

Н. К.

Прыняты ў Саюз беларускіх пісьменнікаў

Гаспадыніч Павел Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1980 годзе ў Кіеве. Студэнт філалагічнага факультэта БДУ. Друкаваўся ў газетах "Сям'я", "Чырвоная змена", "Звязда", "ЛіМ", часопісах "Маладосць", "Першацвет", "Беларусь". У 2000 г. у "Бібліятэцы часопіса "Маладосць" выйшла кніга прозы "Вырай пачуццяў".

Рэкамендавалі Генрых Далідовіч, Уладзімір Дамашэвіч, Андрэй Федарэнка і секцыя прозы.

Лайкоў Янка (Іван Уладзіміравіч), нарадзіўся ў 1979 годзе ў вёсцы Мётча Барысаўскага раёна. З вершамі ў друку выступае з 1995 года. Аўтар зборнікаў паэзіі "Акрэц паветра" (дадатак да часопіса "Першацвет", 1998 г.) і "Логіка пасткі" ("Бібліятэка часопіса "Маладосць", 2000 г.). Зараз жыве і працуе ў роднай вёсцы.

Рэкамендавалі Рыгор Барадулін, Алесь Пісьмянкоў, Віктар Шніп і секцыя паэзіі.

Кукса Валянціна Міхайлаўна, нарадзілася ў 1951 годзе ў вёсцы Гнеўчыцы Іванаўскага раёна. Скончыла Брэсцкі педінстытут. Жыве і працуе ў Брэсце выхавацелем дзіцячага сада. У 1999 годзе ў "Бібліятэцы часопіса "Маладосць" выйшла кніга "Іверыла ў цуд".

Рэкамендавалі Васіль Жуковіч, Зінаіда Дудзюк, Генрых Далідовіч і секцыя прозы.

Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1950 годзе ў вёсцы Шмідзельшчына Талачынскага раёна. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Кандыдат гістарычных навук. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ў галіне публіцыстыкі. Працуе ў газеце "Звязда". Аўтар кніг дакументальных аповесцяў і публіцыстыкі "Нацдэмы", "Айчыны верныя сыны", "Дзеля гэтага варта жыць".

Рэкамендавалі Алесь Марціновіч, Уладзімір Паўлаў, Генрых Далідовіч і секцыя публіцыстыкі.

Рублеўскі Сяргей Васільевіч, нарадзіўся ў 1954 годзе ў вёсцы Бабча Лепельскага раёна. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут. Рэдактар абласной газеты "Народнае слова". Друкаваўся ў часопісах "Полымя", "Маладосць", "Крыніца", штотыднёвіку "ЛіМ". Аўтар кнігі "Апостраф", выдадзенай у 2000 годзе.

Рэкамендавалі Франц Сіўко, Барыс Пятровіч, абласное аддзяленне СБП і секцыя прозы.

ІМПРЭЗЫ

У Ракуцёўшчыну, да Максіма...

У канцы траўня аматары беларускай паэзіі і прыхільнікі творчасці Максіма Багдановіча па ініцыятыве Маладзечанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі зноў традыцыйна сустракаліся ў Ракуцёўшчыне. Тут, ля Максімавага каменя, з прачулым словам звярнуўся да прысутных маладзечанскі краязнаўца і супрацоўнік бібліятэкі Міхась Казлоўскі. Прачытаўшы радкі з "Санета" паэта, выбітыя на камені, ён заклікаў не забывацца на іх, верыць у тое, што паэтычнае слова ўвогуле не павінна згубіць сваёй моцы, спаконвечнай сілы ў цяперашні час, калі, здаецца, найбольш гучна "размаўляюць" грошы, а мова навейшых тэхналогій — найпрэстыжная ў параўнанні з мовамі нацыянальнымі... "Засохлыя зернейкі" беларускай мовы — здольныя будуць і пасля неспрыяльнага перыяду "ў гаршку" занядбанасці "з глебы на прастор прабіцца!"

Потым у Ракуцёўскім музеі-філіяле сталічнага музея Максіма Багдановіча гучалі вершы Віктара Шніпа, Людкі Сільновай, Таісы Трафімавай, паэтаў, біяграфіі якіх звязаныя з маладзечанскай зямлёй — гэткай прыгожай, натхняльнай і ўдзячнай, якой яна была, здаецца, усім у той цёплы, сонечны дзень: мясцовым школьнікам, настаўнікам, паэтам, супрацоўнікам музея, краязнаўцам, бібліятэкарам.

Гасцям падарылі кветкі і кніжкі з вершамі маладзечанскіх паэтаў, прафесіяналаў і аматараў.

С. Л.

ВЕЧАРЫНЫ

Юбілей кафедры

У Мінскім Лінгвістычным дзяржаўным універсітэце адбылася вечарына з нагоды дзесяцігоддзя кафедры беларускай мовы і літаратуры. Да юбілею тут адкрыўся цэнтр беларускай мовы і культуры. Яго заснавальнікамі сталі рэктар Наталля Баранава і прарэктар Галіна Бабінская.

На вечарыне выступоўцы, што свабодна размаўляюць на трох-пяці замежных мовах, свае віншаванні выказвалі толькі на роднай беларускай.

Студэнты англійскага факультэта падрыхтавалі святочны канцэрт, рамансы і песні выконваліся па-беларуску. Прысутнічалі студэнты розных курсаў, розных груп: "французы", "немцы", "англічане" з вялікай беларускай душой.

Два апошнія гады на чале калектыву беларускай кафедры стаіць Пятро Васючэнка. Ён змог наладзіць работу кафедры ў адпаведнасці з патрабаваннямі нашага часу і гэта дало свой плён: адкрыўся беларускі цэнтр культуры і мовы.

Людміла ГРЫГАРОВІЧ

ПАДЗЕЯ

Жыве "Берагіня"

Па часе ўсё сплыве,
Замоўкне ва ўспаміне.
А Беларусь жыве!
Не згіне "Берагіня"!

Гэтыя радкі народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін прысвяціў цудоўнаму калектыву народнага танца і песні "Берагіня" Мётчанскай сярэдняй школы Барысаўскага раёна, які нядаўна адсвяткаваў сваё пяцігоддзе. Ініцыятарам і стваральнікам гэтага унікальнага калектыву стаў Мікалай Аляксеевіч Козенка. Ён знайшоў падтрымку ў дырэктара Мётчанскай адукацыйна-выхаваўчай установы "Школа-садок" Уладзіміра Піліпавіча Лайкова.

Сапраўднае прызнанне прыйшло да калектыву ў 1999 годзе на фестывалі фальклорнага мастацтва ў г. Акцябрскі, дзе ён быў прызнаны лепшым. З гонарам прадстаўляла "Берагіня" мастацкую культуру Барысаўшчыны таксама на міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях народнага танца "Палескі карагод" (г. Пінск), "Сожскі карагод" (г. Гомель), "Беларуская полька" (г. Чачэрск), на якіх была ацэнена дыпломамі лаўрэатаў і спецыяльнымі прызамі.

Поспехі калектыву, які аднаўляе і вяртае да жыцця спрадвечнае народнае мастацтва, звязаны і з дзейнасцю музычнага кіраўніка гурта настаўніцы Антаніны Анатольеўны Абрамовіч.

Пра гэта ўсё ішла гаворка ў падчас святкавання пяцігоддзя ансамбля, якое адбылося ў вёсцы Мётча. У гэтым мерапрыемстве прынялі ўдзел навукоўцы і педагогі з Нацыянальнай акадэміі навук на чале са старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, кандыдатам мастацтвазнаўства Тамарай Варфаламеевай, намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Навум Гальпяровіч, галоўны рэдактар штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" Алесь Пісьмянкоў, намеснік старшыні Барысаўскага райвыканкама Святлана Герасімовіч, загадчыца раённага аддзела адукацыі Таццяна Чэрнікава, загадчык аддзела культуры Міхаіл Храпко, госці з Гомельшчыны, Міншчыны.

Адбыліся фальклорныя чытанні, вялікая вечарына ў Мётчанскім сельскім Доме культуры, выступ дзіцячых фальклорных калектываў пад адкрытым небам на канцэртнай пляцоўцы каля школы.

Свята народнага мастацтва, якім стаў юбілей "Берагіні", засведчыла яшчэ раз, што далучэнне да вытокаў з юнацкага ўзросту — жыватворная крыніца, якая дае сілы на служэнне Беларусі. А гэта значыць, што мётчанская "Берагіня" аберагае не толькі свой Мядоцкі край, а і ўсю Беларусь.

Нічыпар ЧАРНЫШ
Фота М. КОЗЕНКІ

ВІНШУЕМ!

Прэміі Федэрацыі прафсаюзаў

5 чэрвеня ў Белай зале рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў адбылося ўручэнне прэмій Федэрацыі прафсаюзаў за дасягненні ў літаратуры, мастацтве, журналістыцы і самадзейнай творчасці. Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Уладзімір Ганчарык, адкрываючы святочнае мерапрыемства, зазначыў, што ўсе ўганараваныя прэміяй творцы робяць агульную і пашанотную справу — будуюць дзяржаву Беларусь, сапраўды дэмакратычную, прававую і незалежную.

Прафсаюзныя прэміі ўручаны: за літаратурныя творы — пісьменнікам **Міколу Лук'янаву** і **Міколу Чарняўскаму; за канцэртныя праграмы** Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору РБ імя Цітовіча — **Міхасю Дрынеўскаму; за работы ў галіне тэатральнага мастацтва** — заслужанаму артысту Беларусі, прафесару Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў **Уладзіміру Мішчанчуку** і народнаму артысту Беларусі **Юрыю Траяну; за работы ў галіне кінамастацтва** — рэжысёру-дакументалісту **Віктару Аслюку; за творы жывапісу і прыкладнога мастацтва** — мастакам **Вячаславу Паўлаўцу** і **Людміле Пятруль; за дасягненні ў журналістыцы** — публіцысту, рэдактару аддзела часопіса "Беларусь" **Алесю Гібкоўскаму; за актыўную работу па развіцці народнай культуры** — дырэктару Палаца культуры шклозавода "Нёман" г. Бярозаўка **Таццяне Бічэўскай** і загадчыцы бібліятэкі Адкрытага акцыянернага таварыства "Фандок" г. Бабруйска **Людміле Лапыш; за дасягненні ў самадзейнай мастацкай творчасці — народнаму ансамблю песні і танца "Брэстаўчанка"** ОАО "Брэсцкі электрамеханічны завод" і **народнаму ансамблю танца "Белая Русь"** рэспубліканскага Палаца культуры "Юнацтва" г. Мінска.

Наш кар.

КАНЦЭРТЫ

І музыка гучыць...

У самым цэнтры старажытнага Мінска, у Траецкім прадмесці, знаходзіцца гасцёўня У. Галубка (філіял Дзяржаўнага музея тэатральнай і музычнай культуры РБ), супрацоўнікі якой заўсёды падтрымліваюць і дапамагаюць юным талентам. Невыпадкова напрыканцы мая тут прайшоў творчы вечар кампазітара Ісхакбаевай Шушано Аўнераўны. У канцэрце прынялі ўдзел вучні дзіцячай музычнай школы № 1 імя Л. Александроўскай. Менавіта пры гэтай школе створаны Дзіцячы музычны салон, мастацкім кіраўніком якога зяўляецца Ш. А. Ісхакбаева.

Шушано Аўнераўна шмат увагі надае музыцы для дзяцей. Яна стварае інструментальныя п'есы, песні, музычныя кампазіцыі.

У той вечар у выкананні яе вучняў гучала шмат выдатных твораў. Вельмі прыемна было назіраць і за бацькамі, якія прыйшлі падтрымаць сваіх дзяцей і, у той жа час, хваляваліся не менш, чым юныя музыканты.

З першымі акордамі ў памяшканні гасцёўні ўсталявалася надзвычай добразычлівая атмасфера. І гэта невыпадкова: многія творы, якія прагучалі ў гэты вечар, былі напісаны самімі дзецьмі. Павіншаваць юных талентаў прыйшлі прафесар, заслужаны дзеяч культуры М. Солапаў, народная артыстка Ірына Шуміліна.

Гэты цудоўны канцэрт не мог не крануць сэрцы дарослых. Хочацца, каб такіх выдатных мерапрыемстваў, якія падтрымліваюць юных музыкантаў, праводзілася як мага больш.

Л. КАМАРОЎСКАЯ,
загадчыца гасцёўні У. Галубка

ПОШТА

Пераможцы — ліцэісты

Было вельмі прыемна прачытаць у Вашай газеце пра перамогу ў прэстыжным Міжнародным конкурсе па навучанні рабоце на фондавым рынку Цэнтра эканамічнай адукацыі Каліфарнійскага універсітэта каманды юнакоў з Беларусі.

Асабліва ж прыемна тое, што двое з трох удзельнікаў гэтай каманды, Аляксей Анейчык і Цімафей Кузьмініч, — выпускнікі нашага ліцэя. Думаем, гэта — невыпадкова. У ліцэі чытаецца курс эканомікі, кожныя два гады набіраецца група з правава-эканамічным ухілам. У гэтым годзе каманда ліцэя ў другі раз будзе браць удзел у семінары па бізнесе "Business Week" у Цэнтральным Вашынгтонскім Універсітэце. А ў мінулым годзе нашыя навучэнцы зрабілі там такую сенсацыю ўзроўнем сваёй падрыхтоўкі, што кіраўніцтва гэтага семінара, у якім, дарэчы, прымаюць удзел буйныя прадпрымальнікі, прадстаўнікі сусветна вядомых фірм, такіх, як Boeing, Microsoft і г. д., вырашылі правесці адзін з семінараў у Беларусі — так зацікавіла іх краіна, адкуль прыязджаюць такія дзеці. Так што з 24 па 29 жніўня ў Мінску адбудзецца міжнародны семінар па прадпрымальніцтве "Business Week", у якім, апроч беларускіх і амерыканскіх падлеткаў, возьмуць таксама ўдзел іхнія аднагодкі з Польшчы і Балгарыі, якія выказалі просьбу да нас далучыцца.

Карыстаючыся нагодай, хачу абвясціць, што маем яшчэ вакантныя месцы і запрашаем вучняў 10-11 класаў беларускіх школ, якія цікавяцца бізнесам і добра валодаюць англійскай мовай, паўдзельнічаць у дадатковым конкурсе на ўдзел у семінары "Business Week". Конкурс адбудзецца 18 чэрвеня 2001 года. Заявы падаваць па адрасе: 220050, Мінск, Кірава, 21, пак. 6, "Business Week". Тэлефон для даведак 227-32-77.

Уладзімір КОЛАС,
намеснік дырэктара

АБСЯГІ

ВІЦЕБШЧЫНА...

Полацкія скарбы

У Музеі архітэктуры Сафійскага сабора прайшла выстава "Залатыя і срэбныя скарбы полацкай зямлі". Сярод экспанатаў IX—XVIII стагоддзяў — ювелірныя вырабы, упрыгожванні. Таксама прадстаўлены манеты, знойдзеныя ў Полацку ў другой палове XX стагоддзя. Асабліва цікавая калекцыя манет: яны з розных краін — Арабскіх Халіфатаў, Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, — але ўсе мелі абарачэнне ў Беларусі.

Большая частка скарбаў выстаўляецца ўпершыню. Экспанаты ўваходзяць у склад музейнага збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

Грошы для прытулку

Пад назовам "Дабрыня — гэта святло" ў Полацку прайшоў дабрачынны канцэрт. Атрыманыя сродкі пераведзены на рахунак дзіцячага сацыяльнага прытулку, які быў зарганізаваны летась. У імпрэзе прымалі ўдзел мастацкія калектывы і выканаўцы з Полацка і Ушачаў. У "лепшых" традыцыях апошніх гарадскіх імпрэз канцэрт праходзіў на расейскай мове (толькі дзве песні прагучалі па-беларуску).

Т. ХМАРКА

ГОМЕЛЬШЧЫНА...

Кіеў вітае беларусаў

У Кіеве адбылося міжнароднае свята славянскай пісьменнасці і культуры "Славянскі свет вітае новае тысячагоддзе", у якім удзельнічалі прадстаўнікі Беларусі, Украіны, Расіі і Польшчы. Упрыгожылі мерапрыемствы выступленні ўзорнага хору "Звонкія галасы" Гомельскай дзіцячай музычнай школы № 1 імя Чайкоўскага пад кіраўніцтвам Галіны Крэс. Беларускую дэлегацыю на свяце ўзначальваў дырэктар гэтай навучальнай установы, заслужаны работнік культуры РБ Уладзімір Курылін.

Выступілі юныя гомельскія музыканты ў Кіеўскай арганнай зале, ва Украінскім славянскім доме, Нацыянальнай бібліятэцы, перад дзеячамі культуры і навукі ўкраінскай сталіцы. Асаблівай папулярнасцю карысталася песня Васіля Раінчыка "Квітней, Беларусь!"

Гастролі коласаўцаў

У Гомелі пачаў гастролі Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа з Віцебска. Яго калектыў з'яўляецца гонарам нашай нацыянальнай культуры. У Гомель тэатр прывёз свае лепшыя спектаклі, у тым ліку "Я, грэшніца" А. Дударава, "Чума на вашы дзве сям'і" Р. Горына, "І паміраючы, дрэвы стаяць" А. Касоны, "Шагал... Шагал..." У. Драздова, "Дакрануцца вуснамі да нябёсаў" Т. Уільямса.

У рэпертуары коласаўцаў і музычная казка для дзяцей "Жыла, была Сыраежка".

Дэбют мастака

Росту майстэрства маладых жывапісцаў спрыяе Гомельская мастацкая вучэльня. Яе нядаўні выпускнік Вадзім Стрэльчанка жыве ў Рэчыцы. Зараз у абласным цэнтры адкрыта яго персанальная выстава. Для маладога творцы характэрны філасофскі падыход да вырашэння тэматыкі, сур'ёзныя адносіны да абранай прафесіі.

Аляксей ШНЫПАРКОЎ

БРЭСТЧЫНА...

Спадчына ў надзейных руках

На працягу трох гадоў на Брэстчыне дзейнічае каардынацыйны савет аблвыканкама па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Ініцыятарам яго стварэння стаў кандыдат гістарычных навук вядучы спецыяліст аблвыканкама па захаванні мінуўшчыны Леанід Несцярчук. Дзейнасць мясцовых краязнаўцаў дае канкрэтны плён.

За гэты час каардынацыйны савет вобласці, стварыўшы аналагічныя падраздзяленні ў гарадах і раёнах Брэстчыны, правёў 26 пасяджэнняў, разгледзеў 120 актуальных пытанняў збяражэння матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, ва ўсіх гарадах і раёнах вобласці створаны кадравы корпус спецыялістаў па ахове помнікаў, распрацавана перспектыўная праграма аднаўлення архітэктурнай спадчыны, на 16 аб'ектах ужо вядуцца рэстаўрацыйныя работы, устаноўлена 195 ахоўных дошак і 11 мемарыяльных знакаў у гонар знакамітых суайчыннікаў.

Станоўчы вопыт Брэстчыны ў гэтым накірунку вывучаецца Пастаяннай камісіяй па культуры, адукацыі, навуцы, і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Наш кар.

МАГІЛЁЎШЧЫНА...

Храм чакае фундатара

З 1885 па 1900 год у мястэчку Бялынкавічы Касцюковіцкага раёна была ўзведзена царква Успення Прачыстай Багародзіцы. У 57-м храм разбурылі камуністы. Захаваўся толькі фотаздымак будынка, зроблены ў 37-м. Яго адшукала настаўніца Бялынкавіцкай школы Тамара Мухарэўская. Педкалектыў выступіў з ініцыятывай адраджэння славутага храма. Настаўнікаў падтрымаў мясцовы райвыканкам. Школьнікі разам з Мухарэўскай ачысцілі тое месца, дзе калісьці стаяла царква. Справа зараз за фінансаваннем. Але жыхары спадзяюцца на лепшае і вераць, што пры жыцці пабачаць храм у сваёй вёсцы.

Уладзімір КАПАЕЎ

МІНШЧЫНА...

Сёлетні год — год Янкі Лучыны

Шостага ліпеня Беларусь адзначыць 150-гадовы юбілей Янкі Лучыны (Івана Неслухоўскага) — слыннага мысляра, знакамітага паэта-дэмакрата, для якога нацыянальная ідэя ўвасобілася як ідэя жыццёва праўдзівая, рацыянальная і гуманістычная...

У рамках урачыстых святкаванняў 25 траўня ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адбылася рэспубліканская навуковая канферэнцыя "Янка Лучына ў кантэксце самаідэнтыфікацыі беларускай літаратуры". Ладзілі канферэнцыю Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАН Беларусі, Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Францішка Скарыны, Беларускі дзяржаўны універсітэт і Польскі інстытут у Мінску.

У навуковай канферэнцыі бралі ўдзел Л. Уладыкоўская-Канаплянік, У. Гніламёдаў, У. Мархель, У. Конан, іншыя навукоўцы і даследчыкі літаратуры.

Наш кар.

ЧАСАПІС

Калі запальваюцца зоркі

Музычнае жыццё на сцэне Беларускай акадэміі музыкі сілкуецца разнастайнымі імёнамі. Увесну напярэдадні дзяржаўных экзаменаў сапраўдным святочным шэсцем праходзіць шэраг канцэртаў вучняў акадэміі. 2001 год асабліва парадаваў і здзівіў слухачоў не толькі высокім узроўнем прафесійнай падрыхтаванасці студэнтаў, але і вялікай колькасцю яркіх творчых індывідуальнасцей, маладых зорак фартэпіяннай эстрады. Пад моцныя апладысменты, на "ура!" прайшлі канцэрты ўжо вядомых у айчынных музычных колах выканаўцаў — А. Пятрова, Д. Маслюка, В. Фаміна ды інш.

Прыемнай і вельмі цікавай з'явай сталася выступленне на сцэне акадэміі студэнткі пятага курса Алены Лузан (клас Юрыя Гільдзюка).

Асаблівае ўражанне — ад яе канцэртнай праграмы. Дастаткова назваць кампазітараў, прадстаўленых у ёй, каб уявіць складанасць піяністычнай задачы: І. С. Бах, Л. ван Бетховен, П. Чайкоўскі. Такое кола аўтараў вымагала ад выканаўцы тонкага адчування стылю, майстэрства вобразнага пераўвасаблення, з чым Алена выдатна справілася.

Праграму адкрыла бліскучая "Французская уверцюра" І. С. Баха, у якой Алена прадэманстравала глыбокае веданне і адчуванне бахаўскай творчасці, філасафічнасць мастацка-эстэтычнага мыслення кампазітара. Значны інтэлектуальны ўзровень данясення музычнага матэрыялу, высокапрафесійнае валоданне тэхнічнымі рэсурсамі інструмента, інтэрпрэтатарская свабода ў трактоўцы музычнага тэксту сведчаць пра сталасць мастацкага погляду выканаўцы.

Не менш уразіла і 24-я саната Бетховена (ор. 130). Як цёпла, з любоўю была данесена Аленай музыка гэтага цудоўнага твора, як тонка і ясна была "праспявана" кожная фраза, па-майстэрску выкананы кожны штрых! Адэкватнае раскрыццё драматургіі бетховенскага цыкла яшчэ раз выявіла ў піяністцы сур'ёзнага, удумлівага музыканта.

Выдатна былі ўвасоблены і п'есы П. Чайкоўскага (ор. 19), прасякнутыя грацыёзнай танцавальнасцю і лірычнай песеннасцю, што адпавядала чулай натуры Алены Лузан.

Спадзяёмся, што ў беларускім фартэпіянным выканальніцтве зазіхаціць і яе зорка.

Вольга УРУБЛЕЎСКАЯ,
студэнтка Беларускай акадэміі музыкі

Калі ўсё будзе добра...

Тэатр "Дзе-Я?", з якім ахвотна супрацоўнічаюць маладыя рэжысёры, паспяхова заканчвае сёлетні тэатральны сезон. Два прэм'ерныя спектаклі — "Іванаў" А. Чэхава (рэж. Р. Таліпаў) і "Мяшчанскае вяселле" Б. Брэхта (рэж. М. Лашыцкі) — атрымалі станоўчыя водгукі прэсы. Расце цікавасць да самабытнага нацыянальнага калектыву з боку глядацкай аўдыторыі. Стабілізуецца сам творчы калектыў. З'явілася рэальная надзея і на паляпшэнне ўмоў працы: Мінгарвыканкам рашэннем ад 15 мая г. г. бярэ на свой баланс будынак кінатэатра "Радзіма", які належаў аб'яднанню "Кінавідэапракат" і дзе тэатр доўгі час арандаваў адну з залаў. "Далей у такіх умовах існаваць проста немагчыма", — лічыць дырэктар тэатра В. Мартэцкі.

Калі ўсё будзе добра, то неўзабаве можа збыцца мара заснавальніка тэатра Міколы Трухана, і "Дзе-Я?" займее ўласную сцэнічную пляцоўку.

Галіна ЗІНКЕВІЧ

"Полымя", № 3

Нумар адкрываецца падборкай новых вершаў М. Дуксы. Паэзія прадстаўлена таксама вершамі Г. Каржанеўскай, Я. Каршукова, Р. Бялячыца. Часопіс працягвае друкаваць "Песні матчыны з Вушаччыны" ў запісе Р. Барадуліна. Змешчаны аповесць А. Федарэнкі "Нічые", "Зацемкі з левай кішэні" Л. Галубовіча, зрэз (аўтарскае вызначэнне жанру) П. Місько "Ядвіня". У раздзеле "Спадчына" прапануецца "Сватаньне" Н. Чарноцкага (уступнае слова і падрыхтоўка да друку Г. Запартыкі). "Трагічны лёс музея" — развагі Ю. Усяневіч пра Музей рэвалюцыі, які да вайны працаваў у Мінску. "Крытыка і літаратуразнаўства" прадстаўлены артыкуламі Г. Кісялёва "Феномен Альгерда Абуховіча" і А. Марціновіча "Асяніна Аляксея Зарыцкага". А. Гардзіенка рэцэнзуе кнігу М. Касцюка "Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі" ("Асэнсаванне сапраўднай гісторыі"). Кнігу М. Мікуліча "Максім Танк. На скразняках стагоддзя" прачытвае А. Раманчук ("Дзеля праўды і памяці"). На завяршэнне нумара — раздзел "З рэдакцыйнай пошты", у якім змешчаны ліст Э. Самусенкі "Апраўданы суслік".

XIII З'ЕЗД БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Мы тут жывём

Калі б гадоў пятнаццаць-дванаццаць таму магло здарыцца немагчымае і мы тады б здолелі зазірнуць у сённяшні дзень, то пэўна б ад святочнага настрою, які пры ўсім панаваў на мінулых з'ездах, ад таго палымянага імпэту выступоўцаў, дзе нярэдка зводзіліся і рахункі між сабой, ад таго імкнення людзей збоку трапіць на такі з'езд, дзе прамовы заўсёды ў адрозненне ад афіцыёзу гучалі свежа, неардынарна і смела, — не багата чаго б засталося.

Сёння мы ў іншым свеце. І не багата святочнасці і непрадвызначанасці лёсу, у адчуванні сваёй незапатрабаванасці.

Ці думалі мы калі, як у 1989 годзе, праводзілі агульнапісьменніцкі, няхай сабе і справаздачна-выбарчы партыйны сход, на працягу двух дзён (першы — восем гадзін; другі — чатыры), калі вылівалася столькі душэўнай эмацыянальнай энергіі, разумовага імпэту, што прыйдзем да таго, калі шмат чаго бязвартна згубім, па сутнасці — надзейна падсячом сук, на якім спрытна ўладкаваліся і даволі бязбедна жылі. Ці думалі мы тады, што на сённяшні пісьменніцкі форум ужо некаторыя і пайсці не захочуць і не прыйшлі, і некаторыя пажылыя, і некаторыя маладыя, не бачачы сэнсу ў гэтым. Асобныя з іх і публічна таго не хавалі.

Саюз пісьменнікаў сёння відавочна згубіў найбольш адчувальную ў мінулым функцыю — сацыяльнага абаронцы творчага чалавека. Той **рынак**, у які мы трапілі і не без нашага актыўнага ўдзелу, — жорсткі і непераборлівы. Сёння можна гаварыць аб зніжэнні тыражу кніг, аб крытычным змяншэнні іх колькасці, аб змяншэнні ліку чытачоў. Можна знайсці і прычыны, і віноўнікаў. Але ёсць працэсы, якія адбываюцца ў свеце, і іх вініць бессэнсоўна.

Не толькі ў нас, але і ў суседзяў, далёкіх і блізкіх, катастрафічна губляецца цікавасць да кнігі мастацкай. Сапраўды мастацкай, а не бульварнай. Гэта можа пацвердзіць кожны кнігавыдавец. А ў іх сёння ёсць багата матэрыялаў для параўнання і аналізу. І найбольш пераканаўчыя — назіранні са штогадовых міжнародных кніжных кірмашоў: Мінскага, Маскоўскага, Варшаўскага і таго, што праходзіць у Франкфурце-на-Майне. Мастацкую кнігу ўсё больш адцясняе дзелавая кніга, літаратура даведачная. Прагматычны рынак дыктуе сваё. Ужо і ў нас дыктуе сваё папярэдні разлік прыбытку, бо найперш ад яго залежыць сёння стан дзяржаўнага і недзяржаўнага выдавецтваў, якія цяпер, дарэчы, згодна статуту называюцца прадпрыемствамі. І сёння лёс ужо кнігі вельмі часта прадвызначае не яе мастацкая вартасць, а чытацкі попыт. А ён часта непрадказальны. І гэта ва ўмовах, калі кожны кнігавыдавец, падпарадкоўваючыся сучасным эканамічным законам, мусіць як найхутчэй прадаць кнігу, атрымаць прыбытак і частку яго закласці ў выданне новай, зноў жа прыбытковай кнігі.

Чыя сёння з прысутных кніга прыбытковая? На беларускай, рускай мовах? Чый раман? Чый зборнік вершаў? Спытайце гэта ў Марчука. У Алеся Камароўскага. У многім наша нацыянальная літаратура трымаецца сёння выключна дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, так званай датацыі. І вельмі добра, што частка гэтай датаванай літаратуры ідзе на камплектаванне бібліятэк, у тым ліку і школьных, якія сёння таксама жывуць небагата. Гэта тое, што ў сённяшніх варунках не дае забыцца на многія нашы імёны сярод сталых чытачоў і знаёміць з імі маладых. Дастаткова таго, ці не — іншая справа. Тут і саюзу трэба праявіць сябе, асэнсаваўшы абавязкі ў новым свеце, калі ранейшыя з іх проста адпалі ці выканаць іх немагчыма. Саюз сёння згубіў у асноўным ролю сацыяльнага абаронцы пісьменніка. Хто б якую палітычную аснову не падводзіў, але гэта функцыя Саюза пісьменнікаў для яго радавых членаў была асноўная, бо стварала някепскія ўмовы для працы і як тады казалі — для вывучэння жыцця. Ды і творчая падтрымка таксама змянілася. Яна больш каля выдавецтваў, часопісаў, дзе пісьменнік можа ўбачыць, хоць мала ацэнены ў грашовым эквіваленце, але вынік уласных творчых мукаў.

Дзе ж тут месца Саюза пісьменнікаў як грамадска-творчай структуры? Мабыць, ён павінен стаць духоўным каардынатарам паміж больш дробнымі творчымі суполкамі. А яны ўжо ёсць — і аб'яднанне маладых літаратараў, і Міжнароднае аб'яднанне пісьменнікаў "Паслы славянства", цэнтр якога ў Мінску, і ўжо грукаюць ва ўсе дзверы хлопцы з афіцыйна зарэгістраванага літаратурнага аб'яднання "Полоцкая ветвь" і ў энцыклапедыі патрабуюць месца і пра сваё згуртаванне і пра свае "персаналіі": у іх на рахунку не менш пяці кніжак!

А. Бутэвіч і У. Ліпскі

М. Мушынскі і А. Вярцінскі

І ўсё ж, разам з тым, Саюз пісьменнікаў, хоць у значна меншай долі, павінен аднавіць сваю функцыю сацыяльнага абаронцы. Тут могуць быць два шляхі.

Першы — у супрацоўніцтве, у цесным і разумным супрацоўніцтве з дзяржаўнымі структурамі. Тактыка "станавіцца ў рожкі", як паказала жыццё, ні да чога добрага не прыводзіць для большасці з нас. Падкрэсліваю — **для большасці з нас!**

Другі шлях — трэба нарэшце зарабляць грошы самім. Тым больш, што і матэрыяльная база нейкая ёсць. Тут мы спазніліся на гадоў дзесяць, наіўна верачы абяцанням і безвыніковым для нас патугам дамарошчаных прадпрымальнікаў.

Што датычыцца ўвогуле ацэнкі працы кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў, то я хацеў бы сказаць наступнае.

Крытыкаваць можна. Але ж крытыкаваць — не працаваць. І тым больш у такіх умовах. Не хапала паслядоўнасці, цвёрдасці, а то і звычайнага такту. Але ж і ўмовы не падобныя на ранейшыя. Сёння пасада кіраўніка саюза, а іх, як вядома, некалькі, — у параўнанні з мінулым не "пасадная", не ганаровая, а што ні ёсць — рабочая, і тут не святочны фрэнчык найчасцей апранаць даводзіцца, а нешта больш сціплае, прыдатнае для калюг і лужынаў на шляху.

Ацэньваючы працу былога кіраўніцтва, як мне здаецца, не трэба яго бэсціць, як і дужа нізка кланяцца яму. І Вольга Іпатава, і Навум Гальпяровіч, і Уладзіслаў Мачульскі, і ўвесь астатні штат ажно да бухгалтараў рабілі сваю справу і трэба, мабыць, ім сказаць сціплае дзякуй за тое, што давеславалі наш човен да сённяшняга дня без асабліва прыкметных стратаў. Але новы склад кіраўніцтва павінен праявіць значна большую актыўнасць у стваральным накірунку.

Дарэчы, апярэджваючы будучыя рашэнні, прапаную ліквідаваць памылку былога з'езда аб раздзяленні Літфонду і Саюза пісьменнікаў. Літфонд не павінен быць асобнай арганізацыяй, бо ў іншым выпадку ён можа лёгка стацца аб'ектам прыхватызацыі.

І апошняе... І крыху раней, і асабліва перад з'ездам пераднавальнічна лунала шмат у якіх выступленнях — "раз'яднанне". Розныя станцыі і газеткі ажно рукі паціралі, як чакалі жаданай костачкі, якую пасля можна будзе доўга ласа абгрызаць, інтэрвіруючы "пераможцаў" і "пацярпелых", ды праецыруючы гэта на агульнадзяржаўную карту і палітычную кухню.

Хочацца, каб гэтыя спадзяванкі былі марнымі, і каб нас, як у часы, якія згадаў я на пачатку выступлення, не выкарыстаў нехта, пакінуўшы пасля ні з чым.

Мы сапраўды розныя. Па паглядах. Па перакананнях. Па-рознаму ацэньваем падзеі. Гэта заканамерна і правільна. Інакш бы нашай літаратуры хапіла б аднаго-двух прозвішчаў.

Таму, мне здаецца, неправамерна ў нашым разнадум'і бачыць раскол. Але разам з тым нельга і нечую думку, няхай яна нават належыць і пэўнаму невялікаму калектыву, прымаць як агульную думку саюза. Кожная адозва павінна быць канкрэтна аблічнай. І гэта, думаю, будзе ўспрымацца нармальна і пісьменнікамі, і грамадствам.

Іначай вольная душа адчуе дыктат, насілле, а там ужо і трэшчыны пойдуць на раскол. Перараджэнне творчай арганізацыі ў палітычную непазбежна і апраўдана прывядзе да расколу.

Ці трэба гэта сёння?.. У нас адна зямля, палітая крывёю, пасыпаная чарнобыльскай атрутай. На гэтай зямлі жывём і будзем жыць мы. Жывуць і будуць жыць дзеці нашы, унукі. Тут наша мова гучыць. Тут атуляюць нашы песні. І тут наш лёс агульны. А калі ён агульны, то што нам дзяліць і чаго падладжвацца пад некага, хто на гэтым расколе пасля хціва паласуецца.

Генадзь ПАШКОЎ

І мы не адзінокія

Яшчэ ў верасні 1988 года, за паўтара месяца да вядомых усім нам падзей, звязаных з Курапатамі, газета "Звязда" пад рубрыкай "Пагаворым шчыра" надрукавала мой артыкул "Іншага шляху няма". У ім узніміліся самыя набалелыя праблемы беларускага жыцця. Гаворка ішла пра катастрафічнае пагаршэнне здароўя людзей, якое падточвае Чарнобыль і ўвогуле складаная экалагічная сітуацыя на Беларусі, пра "суперінтэрнацыяналізм" і павальны нацыянальны нігілізм, пра закрытыя беларускія школы і агульны бядотны стан роднай мовы, пра атмасферу дэмагогіі, кар'ерызму, хлусні, угодніцтва і абыякавасці, якая пануе ў грамадстве і не менш, чым радыяцыя, нішчыць не целы, а душы людзей. А штуршком для напісання гэтага артыкула стаў разгон міліцыяй і дружыннікамі пікета "Талакі", які праводзіў збор подпісаў у абарону роднай мовы ў Купалавым скверы. Але найперш тады давялося бараніць мілых, разумных і мужных дзяўчат і юнакоў. І ў скверы, і на старонках газеты. Цытую адзін радок артыкула: "Трэба не палохацца, а радавацца, што многія людзі, і асабліва моладзь, пачынаюць выходзіць са стану ачмурэння.., летаргіі, што ў іх абуджаецца нацыянальная самасвядомасць, пачуцці павагі да гісторыі свайго народа, любові да роднага краю, жаданне зрабіць для яго нешта карыснае, што яны ўспамінаюць неўміручыя словы Купалы: "Людзьмі звацца".

І сапраўды, углядаючыся ў светлыя, узнёслыя аблічча, мне радасна думалася і верылася, што з цяжкасцю, з пакутамі, але мы, беларусы, нарэшце станем на шлях праўды і справядлівасці, бо іншага шляху для нармальных людзей няма.

З таго часу прайшло дванаццаць гадоў, а мне здаецца, што цэлая эпоха. Увогуле, хоць я нарадзіўся пасля вайны і мне трубіць да пенсіі яшчэ болей, чым пяць гадоў, часам адчуваю сябе глыбокім старцам, бо заспеў уладніцтва і Сталіна, і Хрушчова, і Брэжнева, і Андропава, і Чарненкі, і Гарбачова, бо столькі дурноты нагледзеўся за сваё жыццё. Але гэта між іншым.

А тады была пара светлых надзей і спадзяванняў, веры ў змены да лепшага. І змены адбываліся. Часам Беларусь на шляху абнаўлення вырывалася нават наперад, абганяла, скажам, тую ж Украіну, і суседзі па-добраму зайздросцілі нам. І вось нарэшце, бяскроўна, без усялякіх намаганняў, набыта дзяржаўная незалежнасць. Трэба радавацца і берагчы яе. Трэба закасваць рукавы і будаваць свой дом. Шэсць гадоў апошняга беларускага адраджэння паказалі, што да яго з разуменнем ставяцца шматлікія суайчыннікі, і не толькі беларусы, а і людзі ўсіх нацыянальнасцей, якія жывуць тут. Але імпэт хутка скончыўся.

І аказалася, што я глыбока памыліўся наконт шляху. Можна не толькі таптацца на месцы, блукаць у трох соснах, імітуючы нейкі рух, але і павярнуць назад. Ды і не проста назад, а з вывертамі. Аказваецца, можна ўсё: і гандляваць сваёй незалежнасцю, дзяржаўнасцю, зноў закрываць беларускамоўныя дзіцячыя садкі, класы і школы, жыць шчасліва ў чарнобыльскай зоне жорсткага радыяцыйнага кантролю, даказваць, што Курапаты — гэта не злачынства сталінскіх катаў, а справы рук нямецкіх фашыстаў і г. д. Гэта дазваляем усе мы. Я ўсёй душою люблю свой народ. У беларускім характары шмат добрых рысаў. Але я люблю не бяздумна. Мне бачна і ўсё адмоўнае, што адбылося і адбываецца на роднай зямлі, у народзе. Беларусы, як і іншыя славяне, ва ўсе часы вылучаліся унікальным самаедствам, звычкай глядзець на ўсё сваё, як на нешта правінцыйнае, другаснае, а заглядаць у чужы рот.

Трэба шчыра сказаць, мы самі вінаваты, што ніяк не здолеем сцвердзіць сябе. Можна спасылацца на розныя акалічнасці, абставіны, прычыны — і мінулыя, і сённяшнія, — але горкая праўда застаецца.

Надта марудна выспявае ў народзе нацыянальная самасвядомасць, разуменне таго, што без дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, без адраджэння роднай мовы, культуры, без новага эканамічнага мыслення і практыкі, без новай унутранай і знешняй палітыкі нам не выжыць у сённяшнім жорсткім, прагматычным свеце, дзе кожны народ дбае, як і належыць, у першую чаргу пра сябе, пра свой дабрабыт, пра сваіх нашчадкаў, пра сваю будучыню. І ніякія напышлівыя словы пра братэрства і вялікую дружбу не могуць прыхаваць працэс асіміляцыі беларусаў, які пачаўся надта даўно і не спыняецца зараз. Дарэчы, сёння ў Беларусі гінуць адразу дзве мовы: беларуская і руская, а верх бярэ ўбогая трасянка.

А ўвесь свет зараз глядзіць на нас і дзівіцца праімперскай, прарасійскай заангажаванасці, самазабойчай ахвярнасці беларусаў, якім без крыві і ўзрушэнняў выпаў нарэшце шанц пабудаваць сваю дзяржаву, стаць сапраўдным народам у еўрапейскай супольнасці.

Усе апошнія гады ў Беларусі дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі нагнятаецца атмасфера падазронасці, варожасці да ўсяго нацыянальнага, патокі беспадстаўных абраз, бруду і хлусні скіраваны ў адрас самых вядомых, таленавітых літаратараў. Асабліва ганебнае тое, што аб'ектам сваіх пастаянных нападак пісакі і радыё-тэлетрубадуры выбралі франтавіка, які з гарматамі-"саракапяткамі" і са сваім стралковым узводам прайшоў усю вайну, які пасечаны кулямі і асколкамі, але, на наша шчасце, выжыў і стаў сусветнавядомым пісьменнікам, — Васіля Уладзіміравіча Быкава. Абражаюць яго нават і асобныя калегі па літаратурным цэху. Яго няспынна цкавалі дома, не даюць на старасці гадоў спакойна папрацаваць, выказаць сябе, свой унікальны дар і ў Фінляндыі, і ў Германіі, дзе ёсць хоць нейкія людскія ўмовы для творчасці.

Канешне ж, усё гэта ўплывае на агульны духоўны стан грамадства. Цытую ананімку, якая даслана ў рэдакцыю часопіса "Полымя": "Продажные твари! Строите свое счастье готовя горе народу своей брехней! Но народ видит кто есть кто. Сколько веревочке не виться, а конец Вам будет.

Народ.

У нас в Витебске против Вас целое движение".

Вось так ні больш ні менш. Праўда, словы вам і вас напісаны з вялікай літары. Не думаю, што з павагі, проста ад непісьменнасці. Невядома, чыя публікацыя выклікала такі гнеў і нянавісць ананімшчыка. Вось я і хачу спытаць у сябе, і ў вас, шаноўныя калегі: хто ж гэта ўсіх нас купіў і за якія грошы? Можа, за тую месячную зарплату, пенсію, якіх хапае толькі на некалькі ходак у краму па прадукты, ці за ганарары, якія ў параўнанні з 1991 годам зменшыліся ў 9 разоў, ды і тыя можна атрымаць толькі праз некалькі месяцаў?

Тым не менш, працуючы ў цяжкіх, а ў маральным плане, часам, і экстрэмальных умовах, многія пісьменнікі знаходзяць душэўныя сілы на сапраўдныя мастацкія адкрыцці. Літаратурны працэс заўсёды рухаецца толькі асабістым адказам таго або іншага пісьменніка на выклік абставін, рэалій жыцця. Канешне, знешні ціск быў і раней, ёсць ён і сёння. Але ніхто не можа кантраляваць унутранае развіццё ідэй, іх вырашэнне творцам. Якраз асоба, і перш за ўсё асоба творчая здольна стварыць сваю суверэнную прастору быцця, свой свет. Пра гэта сведчыць літаратурная практыка трох гадоў, якія прайшлі з часу мінулага з'езда. Звярнуся да канкрэтыкі на прыкладзе часопіса "Полымя". Сапраўды, як адзначалася на нядаўнім пасяджэнні рэдкалегіі, захоўваць высокі мастацкі ўзровень часопіса зараз нялёгка. Знізілася не толькі актыўнасць пісьменнікаў, але і якасць твораў, якія прапануюцца рэдакцыі. Атмасфера няпэўнасці, разгубленасці, якая пануе ў грамадстве, выразна праяўляецца і тут.

Аднак многія творы, надрукаваныя ў "Полымі", сведчаць, што беларускія пісьменнікі маюць значныя набыткі, спасцігаючы ісціну пра гэты свет і чалавека ў ім. Усімі якасцямі сапраўднай літаратуры пазначаны новыя апавяданні, аповесці, раманы Васіля Быкава, Янкі Брыля, Івана Шамякіна, Вячаслава Адамчыка, Анатоля Кудраўца, Віктара Казько, Алеся Жука, Янкі Сіпакова, Вольгі Іпатавай, Генрыха Далідовіча, Валянціны Коўтун, Барыса Пятровіча, Андрэя Федарэнкі, Алеся Наварыча, Міколы Захаранкі, Людмілы Рублеўскай, ёсць параўнаўча новае імя — Сяргей Рублеўскі; паэзія Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Ніла Гілевіча, Васіля Зуёнка, Уладзіміра Някляева, Мар'яна Дуксы, Алеся Пісьмянкова, Раісы Баравіковай, Казіміра Камейшы, Міколы Мятліцкага, Леаніда Дранько-Майсюка, Віктара Шніпа, і да нядаўна прынятага ў Саюз беларускіх пісьменнікаў Янкі Лайкова; драматургія Аляксея Дударава, Алеся Петрашкевіча, Сяргея Кавалёва; крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы, даследаванні Віктара Каваленкі, Дзмітрыя Бугаёва, Уладзіміра Конана, Уладзіміра Гніламёдава, Валянціны Локун, Алеся Марціновіча, Вольгі Шынкарэнкі, Язэпа Янушкевіча, Тамары Нуждзіной, Любові Гарэлік. І гэты пералік, канешне, няпоўны.

Што тычыцца наладжвання матэрыяльнай гаспадаркі саюза, то тут не трэба вынаходзіць веласіпед, а неабходна звярнуцца да вопыту суседзяў, скажам, літоўцаў. Там ва ўласнасці пісьменніцкай арганізацыі ёсць Дом літаратара, два дамы творчасці, дзве кнігарні, створана выдавецтва, маюцца памяшканні для літаратурных часопісаў. Выданне мастацкай літаратуры і саміх пісьменнікаў фінансава падтрымліваюць і дзяржаўныя органы, і розныя фонды. Гэта ўсё разам і дае плён.

Хацелася б, каб больш актыўна для прапаганды беларускай літаратуры выкарыстоўваліся ўсе бібліятэкі нашай краіны. Зараз людзі не маюць магчымасці выпісаць часопісы, купіць кнігу, яны сталі часцей наведваць бібліятэкі. Гэта таксама трэба ўлічваць пры фарміраванні бібліятэчных фондаў.

У наш нялёгкі час, калі людзі ўвесь дзень займаюцца здабываннем кавалка хлеба, а ўвечары спажываюць тэлевізійнае маскультурнае "печыва", розныя шоу, спушчаныя зверху (дарэчы, калі заходзіць пра іх гаворка, то мне заўсёды ўяўляецца, як сядзіць залаты віцязь на віцебскім славянскім базары і лускае семкі), то яны прагматычна ставяць пытанне: "А што гэта нам дае?" Сапраўды, што ж дала і дае ўсім нам беларуская літаратура? Паспрабуем уявіць сабе, што яна знікла. Усё вакол нас ёсць, а яе няма. Няма ні мудрай спадчыны Скарыны, ні палымянага слова Багушэвіча і Цёткі, ні прарочай паэзіі Багдановіча і Купалы, ні Коласавай "Новай зямлі", ні Мележавых Ганны і Васіля, ні герояў твораў Караткевіча, Быкава, Брыля. І кожны беларус адчуе сябе душэўна збяднелым, асірацелым. Уявіць такое проста немагчыма. Беларуская літаратура, як і літаратуры кожнай нацыі, урасла ў плоць і кроў народнага жыцця, вызначае нашу адметнасць у свеце. І дзякуй Богу, што з кожным годам памнажаецца яе багацце, бо зноў нараджаюцца таленты, бо расце пісьменніцкая думка і вучыцца знаходзіць нешта новае, важнае для падтрымання беларускай існасці на гэтай зямлі.

І мы не адзінокія ў сваёй нялёгкай працы. Людзі чытаюць нас, вераць нам. Я раней працытаваў ананімку, але іх няшмат. А цяпер толькі па некалькі радкоў з масы пісем, якія (не прыміце толькі за нейкую пахвальбу) я атрымліваю: "Беларускія пісьменнікі зрабілі вялікую справу. Яны за шмат гадоў з сялянскай мовы стварылі літаратурную беларускую мову, якой могуць і павінны карыстацца адукаваныя людзі. Задача новых пакаленняў пісьменнікаў, развіваючы гэтую мову далей, стварыць сілы ў народзе, якія будуць рухаць наша грамадства ў бок пазнання сваёй гісторыі і культуры... Калі вы ёсць і вы змагаецеся, нам лягчэй жыць, і мы пачынаем таксама ўступаць у барацьбу за лепшую будучыню народа. Яўген Кудраўцаў".

"...ведайце: нашы людзі (простыя людзі), палешукі-беларусы, удзячны Вам за вялікую Вашу барацьбу за справядлівае жыццё, за праўду, за развіццё нацыянальнай культуры. Знайце, Сяргей Іванавіч, што з Вамі многа (вельмі многа!) нас. Поспехаў Вам! З павагай Аляксандр Галавач".

"Падпісвацца на газеты і часопісы на сваю пенсію ўжо цяпер не разгонішся. Вось так, нас, простых людзей, стараюцца трымаць у цемнаце, каб мы менш ведалі, што робіцца ў свеце, каб былі больш пакорнымі і трывалі здзекі палітыкаў... А ўся перабудова для нас, сялян, была б у тым, каб з тых танкаў, што рэжуць на металалом, нарабілі б нам усякай малой тэхнікі, малых трактарцоў і г. д, ды прадавалі б гэтыя машыны не па сумашэчых цэнах. Коней жа звялі, і нам нечым апрацаваць свой агарод. Мы, старыя сяляне, на гэтых трактарцах змаглі б яшчэ апрацаваць які гектар зямлі.., напахаць удовам бульбы і ячменю, каб карміць жывёлу. А будзе жывёла, будзе да хлеба і скварка не толькі для нас, а і для нашых дзяцей і ўнукаў, якія кінуліся на "лёгкае жыццё" ў гарады. Вось была б для нас і ўся перабудова. Прабачце, часу няма пісаць, ужо развідняецца. Нізка кланяюсь Вам, ваш чытач Акім Старахатні".

Сэрца шчыміць, чытаючы такое. Вось яна, сярмяжная праўда пра наша жыццё. Вось чаму пісьменнікі не могуць жыць па прынцыпе: "Пасля нас хоць патоп", які заўсёды на ўзбраенні бюракратыі. Яны будзілі і будуць будзіць грамадства, дбаць пра лепшую беларускую долю.

Я ведаю, што некаму не спадабаюцца мае словы, але не баюся новых нападак і нейкіх аргвывадаў. Нас не запалохалі пагромы рэдакцый часопісаў і газеты "Літаратура і мастацтва" ў студзені 1991 года і ў ноч пасля мінулага пісьменніцкага з'езда, хоць іх ініцыятары так і не былі выяўлены. Ніхто не запалохае нас і сёння. Беларускія пісьменнікі — не ворагі свайму народу. Мы будзем жыць і ствараць разам з народам, разам з усімі сумленнымі людзьмі, якія хочуць дабра і шчасця Беларусі.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

І. Кананові́ч, В. Коўтун і У. Гніламёдаў



Л. Баршчэўскі і У. Арлоў

ЧАСАПІС

"Сузор'е дабрыні"

Вячаслаў Зайцаў нарадзіўся ў 1948 годзе ў вёсцы Выгода на Капыльшчыне. Скончыў Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум і факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. А далей дамо слова лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР Леаніду Дайнеку: "Жыве ў Смалявічах лёгкі на пад'ём усмешлівы чалавек Вячаслаў Зайцаў, ён жа — Адам Выгодскі. Журналіст, адказны сакратар раённай газеты "Край Смалявіцкі", нарысіст, гумарыст, пісьменнік-бытапісальнік, тонкі знаўца вясковага побыту і сялянскай душы. Колькі гадоў запар я працаваў адказным сакратаром, быў "начальнікам штаба", як называюць гэтую няпростую пасаду іранічна-красамоўныя рагатуны. Але ж тое дзеелася ў літаратурным часопісе, у ціхім сталічным кабінеце, а тут — раёнка, шум, гвалт, сяўба, жніво! Бясконцы калаўрот спраў, рэзкія гукі і фарбы рэальнага, а не кінематаграфічнага жыцця".

Словы гэтыя Л. Дайнека прамаўляе ў прадмове "Святло зямное" да кнігі А. Выгодскага "Сузор'е дабрыні", што выйшла ў "Беларускім кнігазборы". Запрашае: "Разгарніце гэтую кніжку, прайдзіце разам з аўтарам па зялёнай смалявіцкай зямлі".

Сапраўды, а чаму б і не "прайсціся", пазнаёміўшыся з аповедамі (так А. Выгодскі называе свае апавяданні), замалёўкамі, нарысамі і ўспамінамі, напісанымі, як сказана ў анатацыі, за апошнія тры гады, а "бадай усе яны пабачылі свет у мясцовым і рэспубліканскім друку". Дарэчы, як можна даведацца з анатацыі, А. Выгодскі піша і вершы. Праўда, у зборнік ніводзін з іх не трапіў.

Што да прозы, дык яна моцная дакументальнай асновай. Лёгка заўважыць, што тыя ці іншыя сітуацыі, пададзеныя аўтарам, непрыдуманыя. Гэта тычыцца і герояў, якія ўзяты з самога жыцця. А. Выгодскі, пішучы той ці іншы аповед, бачыў перад сабой іх прататыпаў. Калі ж вобразы атрымліваюцца збіральнымі, дык яны тыповыя, як тыповыя і сітуацыі, у якія трапляюць персанажы. Аднак знаёмасць сюжэтных хадоў не перашкаджае А. Выгодскаму заставацца самім сабой, ствараючы і адпаведную атмасферу і глыбока зазіраючы ў душу тых, пра каго ідзе гаворка.

Цікавым атрымаўся аповед "Чужыя", у якім расказваецца, як сын прывыкае да бацькі, які некалі кінуў сям'ю, а цяпер вярнуўся назад. "Мельнічыха" — лёс жанчыны, якая шмат перажыла ў вайну, змагалася з ворагам, але з-за сваёй сціпласці нічога не гаворыць аб гэтым вяскоўцам, а тыя пра яе гераічнае мінулае не здагадваюцца, бо яна нядаўна пераехала сюды. "Як будзем жыць, суседзе?" — таксама няпростая маральная сітуацыя. А. Выгодскі пакідае чытача сам-насам з героямі, можна толькі здагадвацца, як будуць жыць далей суседзі, паміж якімі нечакана, як кажуць, прабегла кошка.

Ды і нарысы (напрыклад, "І жыве яго Карпілаўка", "Сузор'е дабрыні", "Шчасце Хведара Прывалава") — няпростыя людскія лёсы, няменш складаныя характары. А. Выгодскі ўмее падаць чалавека так, каб раскрыўся ўсімі гранямі. З'яўляецца такое адчуванне, што яго добра ведаеш і пачынаеш захапляцца, бо бачыш — справамі таго заслужыў. Наконт гэтага мае сваю думку і Л. Дайнека: "Восем гадоў (так склаўся лёс) працую я ў Смалявіцкім раёне і ведаю ўсіх людзей, пра якіх піша Вячаслаў Зайцаў. Ведаю Мікалая Неўмяржыцкага, Фёдара Прывалава, Яўгена Кульваноўскага... Самабытныя людзі, моцныя кіраўнікі..." А таму і моцныя, што адчуваюць сувязь з роднай зямлёй не на словах, а на справе. Да ўсяго любяць гэтую зямлю, стараюцца, каб яна давала як мага большую аддачу, а дзеля гэтага і з'яўляюцца сапраўднымі гаспадарнікамі, дзякуючы якім і ёсць на нашым стале хлеб. А. Выгодскі ўмее быць і па-сапраўднаму лірычным, калі харастро роднай прыроды перадае ў сваіх замалёўках. Часам гэта як бы споведзь, што з'яўляецца на адным уздыху. Ад захаплення хараством мясцін, якія сталі для цябе дарагімі і блізкімі, як і на Капыльшчыне, на якой нарадзіўся. Дый, разважыўшы, ці трэба праводзіць нейкую мяжу. Усё гэта наша зямля. Наша Беларусь. Пра яе і людзей, якія працуюць, каб заўтрашні дзень роднай краіны быў шчаслівым і светлым, і піша А. Выгодскі.

Міхась ГЕНЬКА

УРАЖАННЕ

Камертон трывогі і болю

ШТРЫХІ ДА ТВОРЧАГА ПАРТРЭТА Адольфа ВАРАНОВІЧА

Здараюцца ж і аддухі, якія ахарошваюць шэрасць будзёншчыны, — чытала апавяданні пісьменніка Адольфа Варановіча, сабраныя ў кнігах прозы "Высокі падмурак", "Агні хат", "Жывая душа", а часткай параскіданыя ў часопісных публікацыях. Што ні твор — то свет, дзе свая мастацкая краса. Патрапіла нарэшце на апавяданне "Крыж" ("Полымя", № 1, 1998). Як кажуць, адолела на адным дыханні. Быццам у спякотны поўдзень нагбом выпіла кубак свежай вады. Адклала міжволі часопіс убок. Захацелася — усё роўна каб лепей пазнаць смак той гаючай вады — на момант агледзецца вакол сябе, паразважаць, прымераць: што ж сапраўды каштоўнае ў нашым жыцці?! што адбываецца з намі?! ці цэнім тое, што дадзена Богам? — адным словам, як нясём крыж, які ўзваліў на нашы плечы лёс...

Можна сцвярджаць, што апавяданне "Крыж" філасофскім падтэкстам, мастацка-эстэтычнай танальнасцю, выяўленчай інструментоўкай у значнай меры характарызуе творчыя шуканні і здабыткі пісьменніка ў апошнія гады. На першы погляд, у апавяданні аўтар заводзіць галоўнага героя Мікалая Зарэцкага, мастака тэкстыльнага камбіната, у палон выпадковасцей, што тычацца выключна яго. Неяк пасля работы ён, злы і раздражнёны, ішоў на бацькоўскі сход у школу, дзе вучылася дачка Святлана. Аднак планы нечакана парушыліся — па дарозе яго дагнаў сябрук, запрасіў у гараж выпіць па чарцы. З гэтага, здавалася б, дробнага факта пачалася ў апавяданні дзея; праз яе павароты — то спакойна-плаўныя, то раптам імклівыя — у праявах штодзённай будзёншчыны адбіліся духоўная вышыня і адначасна трагізм нашага зямнога існавання. Маральна-духоўны зрэз жыцця героя, адкрыты пісьменнікам у самых розных праявах, — і падчас выпіўкі ў гаражы, і ў дачыненнях з настаўніцай дачкі, і ў стасунках з начальнікам, які толькі і ведае ў рабочы час разгадваць красворды, і ў бальнічнай палаце, дзе бяда звяла разам самы розны люд, — усё гэта да драбніц высвеціла шчымліва-вострую праблему чалавечай уладкаванасці на гэтай зямлі, сярод людзей, дзе шмат гора і бруду, дзе лёгка згубіць сябе. Як той сусед па бальнічнай палаце, пажылы чалавек, у якога ў разрэзе сіняй майкі выразна віднелася на грудзях татуіроўка — крыж. Усё жыццё праседзеў у турме. Ні кала, ні двара. Не ведае, ці жывая маці. Цяпер вось на вольным пасяленні. Нават прозвішча яго, калі называла ўрач пры першым знаёмстве з хворымі, у палаце не пачулі.

Лёс кожнага пад крыжам. Як яго несці — выбіраем самі. Цёплым вясеннім ранкам, абмытым дажджом, калі Міколу выпісвалі пасля лячэння з бальніцы, раптоўна здарылася непрадбачанае: сусед па палаце з татуіроўкай крыжа не падняўся са свайго ложка. Не хацелася змірыцца ні розумам, ні сэрцам: навошта так жорстка? Няхай не склалася ў чалавека, але ж мог бы жыць. Ды і хацеў, і планы ладзіў, нават збіраўся ехаць на радзіму ў Яраслаўль.

Аднак з логікай мастацкага рашэння не паспрачаешся — яна выстройваецца логікай учынкаў, пададзеных у мастацкіх формах. А перад шанцам жыць усе роўныя: за бальнічнай палатай і блізкія людзі, і сонца, і вясна. Усё гэта трэба проста цаніць пры жыцці.

У сваіх творах Адольф Варановіч сутыкае нас на дарогах, якія ён, вясковы хлопец, адмераў уласнымі нагамі, з самымі рознымі персанажамі. Усе яны па-свойму цікавыя, кожны мае сваё ўяўленне, як лепей уладкавацца ў гэтым жыцці; кожны шукае сваю папараць-кветку. Тут у асноўным людзі, якія пераехалі ў горад, дзе, як яны мяркуюць, толькі і можна знайсці сваю долю, або тым ці іншым чынам менавіта сённяшнім сваім звязаныя з вёскай. Думаецца, гэта невыпадкова, бо псіхалогія такога чалавека бліжэй да светаўспрымання пісьменніка.

Выразна прасочваецца заканамернасць: пра каго б Адольф Варановіч ні пісаў: пра студэнта Андрэя, што на летнія канікулы прыехаў да бацькоў у вёску (апавяданне "Новая хата"); пра дзяўчыну Любу, у якой у вёсцы адзінока памірае маці ("Халодны вецер над зямлёй"); пра сем'і і Пятра і Анюты і іх дзяцей Валю і Сяргея, між якімі ўзніклі драматычныя калізіі ("Нажніцы"), — адназначна выяўляецца дамінанта, што лучыць іх у адным мастацкім радзе; яна выводзіць на вызначальны маральна-эстэтычны камертон, які агучвае трывогу за чалавека, боль за яго няўдачы і страты, за неўладкаванасць лёсу. Менавіта гэта тонкая духоўна-псіхалагічная сфера, дзе ў чалавеку сутнаснае, дзе гартуецца і выпрабоўваецца яго годнасць і прызначэнне, — прадмет мастацкага асэнсавання і адлюстравання.

У мяне няма сумнення, што гэту дамінанту ў сваёй творчасці Адольф Варановіч намацаў адразу; яна і павяла мастацкі пошук, акрэсліла яго гуманістычную скіраванасць і сэнс. Магчыма, адбылося гэта інтуітыўна, на аснове асабістага светаўспрымання як у чалавека, якога ў самым маленстве апаліла вайна; потым, калі аціхлі яе грымоты на палях бітваў, вясковым хлапчуком яшчэ доўга зведваў яе наступствы, найперш — голад і холад. Разам з тым у бядоце, выкліканай нішчымніцай, поўна спазнаў цану чалавечай дабрыні і спагады. Гэта — на ўсё жыццё, гэта — замест усёй яго творчасці.

У ранніх апавяданнях (першы зборнік "Высокі падмурак", 1978) пісьменнік па сваім светаадчуванні аптыміст, ён настроены на светлае ўспрыманне рэчаіснасці, хаця ў ёй — а гэта вёска ў цяжкія пасляваенныя гады і ў перыяд 60—70-х гадоў — было шмат вострых сацыяльна-грамадскіх і духоўных праблем. Яны ў той ці іншай меры закранаді ўсіх. Таму і няма ў герояў поўнай радасці. Яна змяшана са смуткам і трывогамі. У танальнасці апавяданняў скразіць няўлоўнае адчуванне хісткасці ўсяго, што ладзіць чалавек на гэтай грэшнай зямлі. Урэшце — яно, гэта адчуванне, відаць, заўсёды з тымі, хто дамагаецца сваёй мэты, хоча штосьці сумленна, у згодзе з самім сабой палепшыць для сябе і для тых, хто жыве побач з намі.

Так непрыкметна, зусім натуральна акрэслівалася маральна-эстэтычная дамінанта творчасці Адольфа Варановіча. Яе сарцавіна — у скіраванасці на чалавека, на яго сацыяльна-псіхалагічную і маральную існасць. Узгадаем узнёслы настрой студэнта Андрэя, які з бацькам і іншымі мужыкамі падчас канікулаў летам ставіць у Заброддзі новы дом для сястры ("Новая хата"); смутак старога Марціна, у якога сын Васіль з'ехаў у горад і толькі зрэдку наведвае бацькоўскую хату ("Ластаўкі пакідаюць гнёзды"); шчымліва-радасную сустрэчу былога вяскоўца Валодзі са школьным сябрам Аркадзем, які праездам у горадзе па справах ("Скрыжаванні"). Пісьменнік сцвярджае, перадусім мастацкім ладам і логікай твораў, што гэтыя героі — няхай пакуль і не ўсё ладзіцца як мае быць — знойдуць тое, што патрэбна ім у жыцці, бо на іх баку чалавечая дабрыня і адвечная сялянская руплівасць. Яны абавязкова атрымаюць перамогу ў змаганні са сваімі слабасцямі, якія ў апавяданнях перадаюцца праз сумненні і перажыванні, праз ваганні і імкненне да светлага.

Зазначу, што ў тым жа зборніку ёсць апавяданні, дзе аўтар будуе сюжэт на аснове сутыкнення розных характараў. Героі ўступаюць у канфлікты між сабою, каб ахаваць свае інтарэсы і погляды. Менавіта так выяўлены характары Валі, жонкі мясцовага дзівака Івана Кавалькова, і дзядзькі Сымона (апавяданне "Суседзі"). Яны не баяцца прамога сутыкнення з Васілём Субачам, тутэйшым багацеем, які, не працуючы насуперак тадышнім нормам у грамадскай гаспадарцы, разжыўся на агурках, што прадаваў недзе па больш высокіх цэнах; яны разумеюць усю моц супольнасці вясковага люду, каб агулам агорваць праблемы, якія закранаюць інтарэсы ўсіх.

Варта зазначыць, што ў ранняй творчасці маральна-эстэтычны камертон пісьменніка ў сваім гучанні меў часцей лірычныя адценні. Адчувалася шмат асабістага аўтара; сюжэт часам разгортваўся на аснове перажыванняў і настрояў ("Жураўліная песня", "Вячэрні звон"). Іншы раз ствараўся ўражанне пэўнай камернасці.

Такое гучанне, аднак, не паслабляла галоўнага — настроенасці на выяўленне ў чалавеку духоўна багатага, прычым у плыні нашай паўсядзённасці. Менавіта ў яе праявах — і добрых і кепскіх, а не ў захмарных высях — пісьменнік шукаў тое, што дае значнасць і сэнс чалавечай існасці. Такая думка апладняе мастацкую сарцавіну многіх ранніх апавяданняў.

Як правіла, выспяванне таленту — няўлоўны і складаны працэс. Тут няма адналінейнай заканамернасці. Талент сам дае імпульсы для свайго дынамізму. Відаць, у гэтым уся яго сутнасць, якая непазбежна сама сябе раскрывае. Талент Адольфа Варановіча ў непрадказальна-пакручастых варунках перамен, што абрынуліся на нас з дзесятак гадоў таму, разгортваўся ў накірунку, зададзеным у першых сталых апавяданнях, — у накірунку філасофска-эстэтычнага асэнсавання рэчаіснасці, духоўнага і сацыяльна-псіхалагічнага пачатку ў чалавеку. Пісьменнік асвойваў новыя тэмы і праблемы, што рэзка азначыліся на зломе часу. Разам з тым новыя грані набывала майстэрства. У тэкставай тканіне менш становіцца другарадных персанажаў, яна як бы атрымлівае дадатковае святло, у якім нязмушана дзейнічаюць і выяўляюцца характары. Мастацкая прастора, ачышчаная ад элементаў выпадковасці ў паводзінах герояў, пашырае свае аб'ёмы і павялічвае глыбіню, у выніку ў ёй болей розных фарбаў. Сюжэтная дзея вызваляецца ад другасных момантаў, якія здрабняюць вобразы, вядуць да іх фрагментарнасці. Прыкметна паменела лірычных апісанняў, звязаных з асабістым настроем аўтара. Паглыбляўся і абвастраўся псіхалагізм прозы, дзеянні герояў атрымліваюць большую матываванасць, а гэта значыць — жыццёвую дакладнасць. Асабістае падымаецца да ўзроўню мастацка значнага, а гэта не што іншае, як эфект уздзеяння жывога слова пісьменніка. Напрыклад, як у апавяданні "Там, дзе нашы сляды" ("Полымя", №2, 1994). Згодна сюжэту, гэта ўспамін-згадка пра далёкае мінулае, загляд у сваё дзяцінства. Калі ж ацаніць больш абагулена-філасофскі, як вынікае з мастацкай рэалізацыі задумы, — гэта паглыбленне ў вытокі, дзе не проста бацькоўская хата, а калыска духоўнай сталасці і жыццёвай мудрасці; калі ж не складваецца лёс, як у брата Антона, якога жыццё пашматала фізічна і надламала маральна, то гэта значыць, што наракаць трэба толькі на ўласны выбар. Цікава, што пісьменнік чаргуе рэтраспекцыю з рэаліямі нашага дня, чым дасягаецца непаўторны малюнак рэчаіснасці ў часавым яе ракурсе.

Наогул, прыём рэтраспекцыі, якой даецца філасофскае напаўненне, пісьменнік апошнім часам ужывае даволі часта. Тут свая логіка: мінулае перадаецца ў повязі з сённяшнім, чым ствараецца непарыўнасць плыні жыцця. Бывае, аднак, згадка, як зачэпка, — і разгортваецца ланцужок успамінаў, з якіх выштукоўваецца лінія ўчынкаў і паводзін, а гэта значыць — лінія лёсу героя. Скажам, у апавяданні "Жывая душа", якое, дарэчы, дало назву аднаму са зборнікаў. Завязка, як і заўсёды, звычайная. Герой Сцяпан Куліцкі, выхадзец з вёскі, сядзеў на балконе сваёй гарадской кватэры. Ля яго ног ляжаў сабака Бім. Гаспадар, заспакоены празрыстаружовымі фарбамі вераснёўскага адвячорка, то перабіраў у памяці сваё мінулае, калі яшчэ былі бацька і маці, то вяртаўся да рэалій сённяшняга дня; то ён лагаднеў душой, то засмучаўся. Адным словам, плынь роздуму і разваг на фоне штодзённых праблем. Але галоўны роздум Сцяпана — для чаго мы існуём на зямлі?! Для героя апавядання свет, які акружае нас, паўстае ў адзінстве жывога, дзе ўсё галоўнае. Інакш — адзінота, якая пазбаўляе жыццё сэнсу, проста забівае яго.

У зборніку "Жывая душа" высвецілася яшчэ адна грань таленту Адольфа Варановіча — асацыятыўнасць мастацкага мыслення, яго метафарычнасць. У апавяданнях утвараецца моцная плынь свядомасці, яна цячэ непарыўна ў асацыяцыях, лучыць у адзін паток завязкі, якія складаюць сюжэтную дзею.

Маральна-эстэтычны камертон пісьменніка агучвае новыя цікавыя праявы ў лёсах герояў, дае ім псіхалагічнае паглыбленне. Апавяданні, напісаныя ў апошнія гады, служаць таму важкім доказам. Падкрэслю, што ў іх даволі выразна азначылася такая мастацкая з'ява, як філасофска-алегарычная ўмоўнасць. Яна пагружае героя ў стан тонкага псіхалагізаванага самавыяўлення, падчас на ўзроўні падсвядомага, скіроўвае вобразы да сімвалічнасці, чым пашыраюцца межы мастацкіх магчымасцяў. Найперш трэба назваць апавяданне "Галалёд" ("Полымя", № 7, 1996). Яно — пра нашу рэчаіснасць, што літаральна перанасычана вострымі сацыяльнымі праблемамі, перад якімі простыя людзі проста безабаронныя.

А завязка і на гэты раз вельмі будзённая: Іван Габрусёнак, супрацоўнік рэдакцыі, зімовым ранкам спяшаецца на працу. Аўтар у першых радках настройвае на сур'ёзны лад: "Было марозна і ветрана. Снег суха рыпеў пад нагамі..." За лаканізмам фразы і экспрэсіяй праглядваецца намёк на холад і няўтульнасць нашага быцця.

Натоўп на прыпынку; цесната і штурханіна ў тралейбусе; маладая жачына ў парваных панчохах — усё гэта сюжэтныя вузлы, спятыя болем за чалавека, яго духоўную беднасць і матэрыяльнае жабрацтва. Прычым вузлы гэтыя завязваюцца ў сэрцы героя, таму і крывавяць, і ён, Іван Габрусёнак, зведвае вострую асабістую віну за бязладдзе, якое творыцца наўкола. Ён нават у кулаку ў кішэні зацісну грошы, каб пры нагодзе неўпрыкмет у тралейбусе падаць маладзіцы. Менавіта праз асабістае тут дасягаецца мастацкая дакладнасць фактаў жыцця.

Безумоўна, у апавяданні галалёд — гэта не толькі з'ява, выкліканая надвор'ем. Яна з пункту гледжання філасофска-алегарычнай умоўнасці — холад у душах, няпэўнасць у спадзяваннях на заўтра, разлад у розумах. Гэта ў рэшце рэшт небяспека самастойна зрабіць хоць бы адзін крок на дарозе, якая тоіць у сабе непрадказальнасць.

У такім жа мастацка-філасофскім ключы апавяданне "Бульба" ("Полымя", № 10, 1997), у якім расказваецца нібыта пра звычайную для нас і ў цэлым прыемную справу — нарыхтоўка на зіму. Дзея адбываецца ў адным з навукова-даследчых інстытутаў. Запасы бульбы хочуць зрабіць яго супрацоўнікі, цяпер пенсіянеры, якім жывецца зусім нясоладка. Пісьменнік такім чынам выводзіць сюжэтную лінію, што чытачу адкрываюцца многія недарэчнасці і беды нашага быцця, галоўнае ж — духоўна-ідэйны разлад у грамадстве.

Пры ўсім тым, што ў наша жыццё ўрываюцца павевы, звязаныя з працэсам сацыяльна-духоўных перамен, маральна-эстэтычны камертон у творчасці Адольфа Варановіча не мяняе свайго гучання. Настроенасць тая ж — гэта вера ў чалавека, яго ачышчэнне, а не суд над ім, як можа каму падацца. Пацвярджэнне гэтаму можна знайсці ў апавяданнях "Першыя замаразкі!" ("Полымя", № 12, 1999), "Пацалунак на снезе" ("Полымя", № 1, 1999) і інш. У іх, як і раней, — трывога за чалавека, бо ён часта, як у галалёд, збіваецца з дарогі, таму бывае несправядлівы і жорсткі; у іх, як і заўсёды, — боль за чалавека, бо ён у сваёй недасканаласці адступае ад высокай існасці, накрэсленай Богам. Пісьменнік гуманістычнай скіраванасцю сваёй творчасці імкнецца сцвярджаць духоўна і маральна багатае, якое толькі і здольна ўпрыгожыць наша зямное існаванне і надаць яму сэнс.

Наталля КУЗЬМІЧ

КРЫТЫКА

Імклівы рух драўляных коней...

ВЕРШ Аркадзя КУЛЯШОВА "КАРУСЕЛЬ", 1978 г.

Назва гэтага верша для Аркадзя Куляшова не з'яўляецца арыгінальнай. У яго выдатнай лірычнай нізцы "Юнацкі свет" ёсць "Карусель", датаваная лютым 1939 года. Але нам здаецца, адзінае і галоўнае, што збліжае творы, — не тэма і нават не вобраз лірычнага героя, а толькі тое, што напісаны яны адной асобай. Дачка паэта, Валянціна Аркадзьеўна, у свой час таксама засведчыла: "Ад той "Каруселі" да гэтай — шлях у цэлае жыццё". Апошняя "Карусель", напісаная 3 лютага 1978 года, сталася для Куляшова знакавай, апошняй у прамым сэнсе: наступным днём, 4.02.1978 года, ён раптоўна памёр.

Думаецца, пры іншым раскладзе лёсу паэт хутчэй за ўсё вярнуўся б да "Каруселі", каб удасканаліць яе сюжэтна-кампазіцыйную будову, бо ў творы назіраецца пэўная расплывістасць думкі, хаатычнасць руху вобразаў, што ўвогуле не характэрна для паэтыкі Куляшова 60—70-х гадоў. Пацверджаннем могуць служыць словы прызнанага крытыка Р. Бярозкіна, які пісаў: "...у Куляшова, нават у самых складаных выпадках, ёсць вынашаны замысел, думка, ідэя".

Трэба адзначыць, што ў творы аказаліся зрушанымі некаторыя традыцыйныя аўтарскія акцэнты. Напрыклад, тыповы для паэзіі А. Куляшова хранатапічны вобраз дарогі ("бітая дарога") як выказванне ідэі руху, жыццёвай перспектывы тут адыгрывае ў асноўным толькі дэкарацыйную ролю. На першым жа плане знаходзіцца хранатоп замкнёнага часу — каруселі — кола, якому наканавана вечнае кружэнне. Лірычны герой падсвядома імкнецца ўвайсці ў яго рытм, зліцца з яго рухам, але разам з тым ён выразна адчувае і ўсю недасяжнасць сваіх парыванняў, перажывае пачуццё адрынутасці, выключанасці з працэсу. Гэтае перажыванне адчужанасці паглыбляецца з кожнай новай страфой, новым радком. Яго не можа знівеляваць нават штораховая дэманстрацыя паэтам сімвалу свабоды і вальналюбства — "негадаванага, незвычайнага табуна". Толькі ж коні тут падаюцца незвычайнымі хіба сваёй карусельнай несвабодай. А ўвогуле, у вершы яны — адно фон, асацыяцыя, аблямоўка ідэі, што спрабуе прабіцца-акрэсліцца ў перадапошняй страфе:

Прыпыніся, мой табун грывасты,
І хутчэй вазьмі мяне з сабою.

Калі не ведаць Куляшова-паэта, можна сцвярджаць, што "Карусель" ёсць не што іншае, як працяг улюбёнай творцам тэмы звароту да мінулага. Аднак ідэя верша значна глыбейшая за банальную тугу па бесклапотным дзяцінстве. Тут за фасадам фантасмагорыі мройных вобразаў нам бачыцца патаемнае жаданне змяніць сам рытм рэальнага жыцця, імкненне не толькі пасумаваць па знябытым, але дасягнуць фізічнага і перш за ўсё духоўнага абнаўлення. Калі ж прыгадаць, што здарылася з паэтам праз некалькі гадзін пасля напісання апошніх радкоў, то магчыма нават дапусціць, што такім чынам — несвядома, праз верш — ён памкнуўся аформіць прадбачанне хуткай завершанасці сваёй жыццёвай дарогі...

Лексіка-фразеалагічная сістэма "Каруселі" грунтуецца на шырокім выкарыстанні паэтам рытарычных пытанняў і зваротаў. Гэтыя стылістычныя фігуры ў нашым выпадку прыходзяцца як мага да месца, бо арганічна засяроджваюць увагу чытачоў на праяве пачуццяў лірычнага героя, выклікаюць каларытныя асацыяцыі. Не менш важную ролю для разумення пафасу твора адыгрывае ў ім скразная метафара-адухаўленне: **вечны імклівы рух драўляных коней** — сімвал адноснасці часу ў дачыненні да лёсу асобна ўзятага чалавека.

Традыцыйная для Куляшова тэндэнцыя да актыўнага ўжывання лірычных эпітэтаў у гэтым вершы некалькі парушана — у ім пераважаюць эпітэты выяўленчыя (**"шэрай, вараной, чырвонай** масці", **"барадатае**страхоцце", "табун**грывасты**" і інш.). Сустракаецца і няўдалы, на нашу думку, прыклад выкарыстання эпітэта ("**былыя** сурмы"). Само слова "сурма", даволі рэдкае і выпадковае ў беларускай мове (сурма — украінскі народны музычны інструмент), прыцягнула да сябе такі ж выпадковы эпітэт.

У вершы маецца адзін з распаўсюджаных тропаў (параўнанне), сэнс якога можа не адразу ўспрыняцца чытачом адэкватна, асабліва ў сувязі з дапушчанай аўтарам у наступных радках паэтычнай вольнасцю:

Майго маленства коні, —
З памяці выходзьце, як са стайні,
Вось ён цукар на маёй далоні:

Як музыкі граюць, б'юць літаўры, —
Мабыць, "Ва саду лі ў агародзе".

Тут мы бачым надзвычай рэдкі для паэтыкі Куляшова прыклад выкарыстання анакалуфу — стылістычнай фігуры, у якой парушаны граматычныя сувязі паміж словамі.

Верш "Карусель" напісаны пяцістопным харэем, памерам, што выдатна перадае гранічна напружаныя перажыванні лірычнага героя. Выкарыстанне жаночай рыфмы яшчэ больш узмацняе і без таго высокую ступень элегізму твора. Разам з тым вершу ўласцівы і элементы экспрэсіўнай, пафаснай інтанацыі, якая рэалізуецца ў лексіцы і сінтаксічных пабудовах. Эмфатычнасць слова дасягае свайго піку ў завяршальнай страфе, дзе надзвычай удала персаніфікуецца вобраз дзяцінства:

Праплывае міма пабрацімства,
Коні, коні дыхаюць гарача.
Каруселі кружаць, а дзяцінства
У баку стаіць маё — і плача.

Нам думацца, што верш "Карусель" яшчэ неаднойчы будзе прыкоўваць да сябе ўвагу даследчыкаў, бо спасціжэнне яго глыбіннага сэнсу дае магчымасць наблізіцца да рэальнага разумення асобы самога паэта.

Сяргей УКРАІНКА

г. Магілёў

Нота любові і пяшчоты

О Нёман — песня майго сэрца,
Краса палёў, краса нізін!
Люблю твой спеў, што ўдаль нясецца,
Люблю цябе, як родны сын!

Паэту-песенніку Адаму Русаку, узгадаванаму ў Наднямонні, у слыннай вёсцы Пясочнае Капыльскага раёна, што размясцілася на самым беразе яшчэ нешырокай тут рачулкі, здаецца, уласнай прыродай было наканавана плаціць вечную даніну любві бацьку-Нёману. За сябе, за аднавяскоўцаў, за ўсіх землякоў. І ён услаўляў яго не па абавязку, не з прымусу, а натхнёны шчырай любоўюі бязмежнай удзячнасцю рацэ дзяцінства.

Ды хіба адзін Русак быў адданы блакітнай роўнядзі плыні, мілым сэрцу хвалям! Уладзіслаў Сыракомля, Адам Міцкевіч, Якуб Колас, сотні іншых паэтаў — хто не схіляў сваю галаву і не ўздымаўся талентам перад веліччу Нёмана-ракі, Нёмана-з'явы, Нёмана-дара!

Але ўсё, што ў розныя гады было напісана пра Нёман, "блукала" ці па вуснай народнай творчасці, ці па асобных выданнях, аўтарскіх зборніках. А вось кнігі, якая ўвабрала б у сябе ўсё, што дагэтуль сказана пра раку, адзіную з вялікіх, што бярэ пачатак на Беларусі, не было. І гэта пры тым, што найбольш таленавіта, найбольш усеабдымна не напісана ні пра адну з іншых нашых рэк. Ні вершаваным радком, ні прозай.

Між іншым, пра Заходнюю Дзвіну, Дняпро ўжо выйшлі асобныя кніжкі, а Нёман аказаўся абдзелены такой увагай. Раней была, праўда, спроба сабраць пад адну вокладку "нёманскія" творы літаратараў, з'явіўся ў свой час і адпаведны зборнік, але гэта было далёка не тое, чаго вартая найпершая беларуская рака. Да таго ж, як слушна заўважыў даследчык Наднямоння Уладзімір Кісялёў, рабілася тая кніга па камандзе, і таму ёй бракуе творчага падыходу.

...Свята выхаду ў свет сапраўднай анталогіі панямонскай творчасці прыпала на вясну новага веку. Ужо ў гэтым ёсць свая сімволіка: творцы XIX, XX стагоддзяў шлюць нашчадкам пажаданні і заклік шанаваць і берагчы наш агульны Нёман гэтаксама, як ставіліся і ставяцца да яго яны. Найкаштоўнейшы падарунак усёй беларускай грамадскасці зрабіла выдавецтва "Юнацтва" на чале з дырэктарам Алесем Камароўскім, выхадцам з прынёманскага краю, са знакамітай стаўбцоўскай Мікалаеўшчыны. А першая прэзентацыя кнігі адбылася на Уздзеншчыне, адкуль Нёман пачынае свой бег да Балтыкі, напачатку, праўда, стужачкай-ручайком Нёманцам і толькі пасля абдымак-зліцця з Лошай і Вусай паўнаводнай ракой.

Галоўны ўкладальнік кнігі "Бацька наш Нёман", паэт таксама мікалаеўшчынец Яўген Хвалей віншуе ўсіх, хто прыйшоў у гэты дзень у Уздзенскі гісторыка-краязнаўчы музей у сувязі са знамянальнай падзеяй. Слова бяруць пісьменнікі Алесь Махнач, Васіль Шырко, навуковец Уладзімір Кісялёў — усе яны прыклалі руку да Нёманіяны, а таму маюць магчымасць і прыгадаць цікавае з панямонскай літаратурнай спадчыны, і ацаніць зробленае выдаўцамі. "Дырыжор" сустрэчы, загадчыца раённага аддзела культуры Ганна Міхальчук запрашае таксама да размовы мясцовых аўтараў і чытачоў Віктара Сабалеўскага, Валянціну Рогач, Івана Сурмана, Людмілу Салавей. Прысутных вітае намеснік старшыні райвыканкама Міхаіл Лапотка.

Прыгожая ўрачыстасць, дастойная вялікай Кнігі, у якую толькі з Уздзеншчыны ўключана каля 20 аўтараў. У тым і адметнасць, перавага кнігі, што яна раўнапраўная, што яна — кніга ўсіх, дзе побач са знакамітымі імёнамі знайшлося месца і пакуль малавядомым паэтам, нават пачаткоўцам. У кожнага з іх свой талент, свой творчы почырк, але ўсіх аб'ядноўвае любоў да нашай Бацькаўшчыны, нашай прыроды. І кніга яшчэ раз пераканаўча сведчыць гэта ўсёй грамадскасці, усёй краіне, запрашаючы ўсіх нас паважліва ставіцца да навакольнага асяроддзя.

Экалагічныя праблемы нёманскіх вытокаў спецыяльна не акрэслены ў новым выданні, аднак гэта не азначае, што іх не існуе. Алесь Махнач, які ведае ледзь ці не кожны куст у вярхоўі Нёмана, з жалем канстатаваў, што першасны вадазбор ракі цяпер не што іншае, як сетка меліярацыйных каналаў. Як вынік неўтаймаванай меліярацыі ў 70-я гады, яны парушылі натуральны ландшафт, "зблыталі" вадатокі, разбурылі крыніцы. І цяпер ужо як такога вытоку Нёмана няма — "згубіўся" ў сетцы меліярацыйных каналаў. Арганізатары прэзентацыі кнігі пабывалі на так званым умоўным месцы пачатку Нёмана, непадалёк ад вёскі Верх-Нёман Лашанскага сельсавета, дзе ўстаноўлены сімвалічны камень з надпісам і высаджаны дубкі. На большае наша краіна "не цягне". Беларускі Валдай, як бачым, не змог адбыцца ні раней, ні пакуль і ў наш час.

І як бы ў процівагу гэтаму кніга "Бацька наш Нёман" узнімае нас да высокіх катэгорый маральнасці, спадчыннасці, захаванасці і пераемнасці лепшых народных традыцый. Увогуле, на думку ўдзельнікаў сустрэчы, гэты збор твораў атрымае высокую ўхвалу і павінен мець адпаведную адзнаку. Як гімн роднаму краю ён лагодзіць душу і выдатным мастацкім афармленнем, мае сваю адметную ноту — мякка-бэзавую танальнасць. Гэта ноты вясны, пяшчоты, любові.

Мікалай КАРОЛЬ

XIII З'ЕЗД БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

Дык будзем жа вольнымі і падуладнымі толькі Богу

З ВЫСТУПЛЕННЯ

Не маючым сапраўднага, рэальнага суверэнітэту, нам, старадаўнім літвінам, з скупое ласкі даравана хіба культурная аўтаномія, якая нібы дзеля смеху і на здзек даецца пакорным, пастаўленым на калені "инородцам", як гэта ёсць у Польшчы з упартымі мазурамі, крутога нораву кашубамі ці людзьмі зацішных пушчаў — курпамі. Альбо яшчэ нязводнымі палабскімі славянамі ў Нямеччыне.

Беларусам-літвінам дазволена апрануць вышываную кашульку, падпаясаць яе паяском, тканым у бела-чырвоны "казельчык", і віхурна станцаваць пад воплі і крыкі "Лявоніху" ці "Крыжачка", альбо на якімнебудзь базары заспяваць песню "во славу срамного удальца", ці на пасашок.

Мы ўжо, нібы леаніды, што распаліся са зоразбору, ператвараемся ў касмічны пыл. Аднак пад магільным каменем, пакладзеным на нас жорсткаю рукою, чуйнай крыніцай прасочваецца жывое, неўміручае слова. У трудным высілку беларуская мастацкая літаратура намагаецца выжыць. Наша класіка заўсёды клікала здрыгануць блудны свет і панесці светач свой, сталёвым радком пілаваць краты і ўздымаць абоесечны меч на тых, хто, спрадаўшы ўсё роднае — ад слова да святой зямлі і роднай хаты на ёй, хоча ператварыць нас у ваўкалакаў ці чужынцаў.

Літаратура не цвецікі-люцікі і ласкі майскія — гэта словы вядомага рускага паэта, — а жывы і балюча-чуйны нерв. Я прачытаў у прэсе і краем вуха чуў з радыё тых, хто прэтэндуе на нейкага кіраўнічага ў літаратуры, заступніка і настаўніка ці што? Але найперш, як мне здалося, дамагаецца камер-юнкерства ці флігель-ад'ютанцтва.

І вось для такога фанабэрыстага настаўніка няхай напамінкам будуць словы Тургенева (даруйце, мо я часам мыляюся ў імёнах), але, здаецца, Тургенеў, гаворачы пра раман Талстога "Вайна і мір", заўважыў: ніводная самая рэзкая рэцэнзія не перакрэсліла творчасць Бабарыкіна, як найвялікшая і найталенавітая кніжка графа Талстога.

Так што вучыць адзін аднаго трэба найперш уласнымі творамі, а не парадамі, да якой групоўкі прыналежаць, ці да смехаты складзенымі ці спісанымі пастановамі з забытых сталінска-жданаўскіх дырэктыў.

Няхай для нас будзе разумнае і неабходна-спадручнае, што сказаў нехта з старажытных: "Бог усіх адпусціў свабоднымі і прырода нікога не зрабіла рабом". Дык будзем жа вольнымі і падуладнымі толькі Богу.

Вячаслаў АДАМЧЫК

А. Бароўскі, Ю. Станкевіч і А. Ждан

Б. Пятровіч, В. Аксак і В. Куртаніч

Фота Ул. КРУКА

ЧАСАПІС

Дыялог на сумежжы культур

Знаёмячыся з выданнямі, якія выходзяць у абласных і раённых цэнтрах, асаблівае задавальненне адчуваеш тады, калі сустракаешся з такімі, што закранаюць праблемы нацыянальнага адраджэння, асэнсоўваюць багатую беларускую гісторыю. Гэта тычыцца і асобных газет, якія, не абмінаючы надзённых праблем дня, вяртаюцца і ў падзеі даўнія, і часопісаў рознага кірунку, што памятаюць пра гістарычную дзялянку. У шэрагу падобных выданняў і альманах "Магілёўская даўніна". Гэтым разам гаворка пра яго спецыяльны выпуск (восьмы нумар з часу выхаду альманаха),

які з'явіўся ў межах праграмы "Polonica-Albaruthenica-lithuanica" Магілёўскага таварыства "Брама". Дарэчы, выдадзены ён коштам асабістых узносаў сяброў рэдакцыйнай рады "Магілёўскай даўніны", МТ "Брама" з дапамогай фундацыі IDEE і ТАА "Геліос". Называецца гэты выпуск "Край. Kraj" і мае падзагаловак "Дыялог на сумежжы дзвюх культур". Упершыню на Магілёўшчыне зроблена спроба абмену думкамі беларускіх і польскіх аўтараў па надзённых пытаннях развіцця міжкультурных стасункаў. Тэксты матэрыялаў падаюцца на мове арыгінала, адначасова зроблены кароткі пераказ беларускамоўных па-польску і адпаведна польскамоўных па-беларуску. Ды і наклад, як для падобных выданняў, прыстойны: 700 асобнікаў. Што да зместу выпуску, дык, думаецца, багата для сябе інфармацыі атрымаюць тыя, хто аднолькава цікавіцца і беларускай, і польскай культурамі. Дакладней, узаемасувязямі іх, прытым, так сказаць, у магілёўскім варыянце. А што падобная гаворка даўно наспела, слушна заўважыць у невялікім звароце да чытача рэдактар "Магілёўскай даўніны" А. Агееў і выканаўчы дырэктар МТ "Брама" Я. Іваноў: "Гісторыя стасункаў беларускай і польскай культур без малага шэсць стагоддзяў. Міцкевіч і Сыракомля, Баршчэўскі і Чачот, Агінскі і Манюшка, Орда і Лялевель, Дамейка і Дыбоўскі ды шмат іншых імёнаў, што яднаюць Польшчу і Беларусь, зяўляюцца своеасаблівым сімвалам іх агульнага лёсу. Але, на жаль, гэтыя славутыя прозвішчы ў свой час зніклі з масавай свядомасці беларусаў, як знікла і разуменне таго, што палякі нам такія ж браты, як і ўкраінцы, і рускія. Усё гэта, безумоўна, ёсць вынікам той савецкай "жалезнай заслоны", якая рабіла Варшаву нашмат больш далёкай ад Беларусі, чым Магадан, а Сахалін больш блізкім, чым Беласточчыну". Сапраўды, сталася так, што ў Беларусі напрыканцы XX ст. (выпуск "Край" пазначаны 2000 годам. — М. Г.) трэба даводзіць неабходнасць дыялогу культур, пабудовы ўзаемапаразумення і развіцця супрацоўніцтва ва ўсіх сферах жыцця між усімі суседзямі, а не толькі з Расіяй і Украінай". У артыкуле А. Гейштара (на жаль, вядомы польскі даследчык не паспеў пабачыць гэтую публікацыю, артыкулу папярэднічае нататка "Памяці Аляксандра Гейштара") "Вялікае княства Літоўскае: прастора і людзі" звернута ўвага на працэсы фарміравання гэтай дзяржавы, гаворыцца пра колькасць насельнікаў, іх этнічным паходжанні. Побач змешчаны артыкулы Я. Рыера "Беларускія і польскія землі ў Сярэднявеччы. Пошукі цывілізацыйнай спецыфікі", І. Марзалюка "Дык усё ж такі, да якой цывілізацыі належалі ў Сярэднявеччы беларускія землі?", А. Седзіна "Нікадзімава — гарадзішча трэцяй чвэрці І-га тысячагоддзя (адзіная рускамоўная публікацыя)", А. Вараб'ёва "Палякі горада Магілёва і Магілёўскай губерні ў палітычных падзеях 1917 года", І. Пушкіна "Грамадска-палітычная актыўнасць палякаў БССР у 20-ыя гады і адносіны да іх з боку дзяржаўнага кіраўніцтва", І. Марзалюка "Невядомая спадчына Сімяона Полацкага" і іншыя. Змястоўнымі атрымаліся раздзелы "Літаратура" (артыкулы М. Хмяльніцкага "Феномен беларуска-польскага літаратурнага сумежжа ў XIX стагоддзі" і Я. Клімуця "Польскамоўная літаратура Магілёўшчыны") і "Пераклады" (артыкул М. Хаўстовіча "Беларускія малюнкі" Ігната Ходзькі і ў яго перастварэнні па-беларуску фрагменты з аповесці І. Ходзькі "Успаміны квестара", а таксама пераклады С. Даніленкам вершаў Ч. Мілаша). Не застанецца чытач абыякавым і да падборак "Апошнія выданні па гісторыі Магілёва", "Выкананні праграмы "Новае гуманітарнае мысленне". Можна даведацца, як праходзіла "Святкаванне 200-годдзя з дня нараджэння Міхалая Рыгоравіча Гартынскага (1799—1887)", а гэта гісторык і перакладчык, які ў свой час падрыхтаваў скарочаны варыянт "Магілёўскай хронікі". Шкада толькі, што ў асобніку, які атрымаў "ЛіМ", ёсць не ўсе старонкі са згаданага матэрыялу.

Міхась ГЕНЬКА

ПАЭЗІЯ

Васіль МАКАРЭВІЧ

Кругі

Памяці М. ТАНКА

Гадамі з ім
Я проста немаўля.
Хто параўнацца з ім сягоння здатны?!
Ён на турэмных нарах размаўляў,
Як роўны з роўным,
З Цэзарам і з Дантэ.

Дармо, што лёс
Няшчадна катаваў, —
З упартасцю і сілай рызыканта,
З усіх бакоў ці раз акантаваў
Ён нават філасофскі камень
Канта.

Вялікія
Збяруцца ў цесны круг.
Сем Муз у іх за спінамі, як сцені.
А ён — ім пра сякеру, то пра плуг,
Якім барозны недзе
Восень сцеле.

І з Марксам
Быў гатовы праз гады
Схапіцца ён пра роўнасць і пра брацтва.
Ды паспрабуй праз лямец барады
Да мудрай дыялектыкі дабрацца.

Багі яны!
Ім не было цаны!
Ставала ў іх і мудрасці і сілы.
А так было прышчэміць да сцяны,
Што літасці, бы слабакі, прасілі.

Ды і яго згіналі у дугу
З партыйнаю суровою апекай.
Змагар, ён не застаўся у даўгу
Перад кругамі вогненнага пекла.

З кагортаю былых таварышоў,
Што бралі шырай і ўзляталі вышай,
Усе кругі, да аднаго, прайшоў,
І ледзь за іх арбіту ён не выйшаў.

Ён малады,
Хоць сілай не тытан,
Не слаў на рэках хвалі вал за валам, —
А возьме ды крутнецца — тут і там
Турбот пакіне для улад завалы.

Цямнота, быццам малады мурог,
Прыляжа мякка да турэмных нараў.
І чуў ён у Лукішках, як ля ног
Дзябёлым шчупаком усплёсне Нарач.

Хрыпеў тытунь у дымным муштуку.
А ён глядзеў, як прагавіта ў высі
У вартавога чэпка па штыку
Хмель за спіной караскаўся
Ды віўся.

Нібыта заіржаўлены затвор, —
Грымеў замок у калідоры гулкім.
І душны спрат выводзілі на двор
На посную турэмную прагулку.

Блішчэў наўзбоч
Штыка даўжэзны клык.
А ён у ступаках, нібы на гала,
Турэмнага падворка жарнавік
Круціў, бы круг, упірыста
Нагамі.

Хоць круг душу
Сціскаў, нібы пятля,
І духатою абдаваў густою,
Перацірaў гады ён спакваля,
І прасяваў на сіта дзён
Жарствою.

У кужалі
Асенняй сівізны,
Дзе на вазку шляхетным, дзе і пешшу,
Давай хутчэй, падпольны сувязны,
Бярыся ў госці за мяжу з дэпешай!

А што такое чуйная мяжа?
Тачыся у гушчар, вылазь на ўзлессе!
Але глядзі, каб на вастрак нажа
Не ўзбіцца неўспадзеў
Ды не ўзлезці.

Ну, а ў Саветах
Дзень ці два чакай,
Як хітры перабежчык ці фальшывец,
Пакуль цябе вачастае ЧэКа
З усіх бакоў паглядам
Не прашыліць.

Ім давядзі, што ты не за касцёл,
А за таго, хто у Крамлі з вусамі.
І за яго узыдзеш на касцёр,
І ў кіпець ускочыш гэтаксама.

Ну а пасля, каб ачуняць крыху,
Глядзеў углыб стагоддзя, бы ў калодзеж.
Ах колькі там ляжала на шляху
То валуноў шчарбатых, то калоддзя!

Хоць не хітрыў
Ніхто і не лаўчыў.
А той, хто стаўся для усіх іконай,
Іх, змагароў, ад бітвы адлучыў,
І аб'явіў па-за прамым законам.

На д'ябла і жыццё і гэткі быт,
Каб лыжкаю заціцы біць паклоны!
Але без крыл які ты барацьбіт!
Не болей, чым пасмешышча і клоун.

Цягнула, як да блізкае радні,
Да яблынь абагуленых і вішань.
Ажно пакуль наўпрост у тыя дні
Да нас ён з-за дратоў густых
Не выйшаў.

Не за жар-птушкай
Гнаўся наўздагон,
А каб са здзекам і з пагардай скончыць.
Ды з полымя ў раз'ятраны агонь
Ён нечакана з галавой ускочыў.

За паваротам — паварот круты,
Дзе ведзьмаку у вернасці клянуцца.
Бо можна у абдымкі Варкуты
З вазка знячэўку на ляту
Кульнуцца.

Чыноўныя не ведалі тузы,
Што будуць мець: фатыгу а ці фігу.
Улетку ападалі маразы,
То бралася зімою на адлігу.

Здзіўляцца,
Войкаць, ведама, дарма,
Як і шчапаць з бярэзіны лучыну.
Да розных дзіў пілсудская турма
У яміне бяздоннай навучыла.

Ён сто вясёлак
З неба мог дастаць,
Тым оды пець, хто лез угору дурам.
Ды нізавошта не хацеў ён стаць
Партыйным слугачом і трубадурам.

Усмешліва глядзеў ён на ману,
Зазнаўшы столькі і пакут і бедаў.
Чытаў з газет газету, як меню,
Крамлёўскіх то прыёмаў,
То абедаў.

А гнеў хаця б зубамі скрыгануў
Дзеля жывой цікавасці спартыўнай.
Ды дзе было, каб вока гругану
Мог глюгай дзеўбануць
Груган партыйны!

За вокнамі раўла і выла медзь.
Ад музыкі душа аж знемагала.
Хоць лоб разбі! Не мог ён зразумець
Крамлёўскае стратэгіі змагання.

Рабілі там, гуляючы з агнём,
На калатнечу класавую стаўку.
Каб за далёкі акіян, на дом,
Паслаць яе з імгненнаю
Дастаўкай.

Не пакідаў ён з болем бедаваць,
Адзеты ў спагаду, ў гнеў абуты,
Што у сябе не ўмеем будаваць,
А дзесьці узнімаем бунт
За бунтам.

Кагал за морам
Сыдзецца бадзяг,
Ды выцадзіўшы гаркаты па гарцу,
На палцы пранясуць анучы сцяг,
І — ўсе яны для нас, лічы,
Змаганцы.

Губляць ім — што?
Магчыма, задарма
На звалцы недзе знойдзеныя транты.
Для іх прыстанкам і жытлом турма.
Ну а жыццё — пустая часу трата.

Ён ведаў:
Хто хітрує — той грабе.
І як было ад гневу утрымацца:
Сядзелі ў нас гадамі на гарбе
Не змагары, а проста утрыманцы.

Якая справа ім да бед Кармы!
На нас глядзелі пільна і азартна.
Іх да адвалу сёння накармі,
Ды адвалі удосталь і назаўтра!

А іх партыйны завадзіла-гном,
Пусціўшы пыл у вочы на расстанне,
Дзеля Крамля пакіне перагной,
І сам, нібыта дым, уміг растане.

Свайго падполля
Ён не мог забыць.
І колькі раз да болю падмывала
Туды памчаць і ўсё перарабіць
На яўцы ў сутарэнні ці ў падвале.

А свет стагнаў.
У стыні стыў Нарым,
Дзе замест сонца месячык двурогі.
Яго у небе несла прама ў Рым
На лёгкіх крылах авіядарога.

Раўлі дзялкі,
Як чэрці на ражне.
Ды у завулку, ля плафонных плашак,
Ён з болем і пакутай бачыў жней
У гэткіх вабных постацях
Манашак.

Дня палатно
Світанак бёрдам ткаў,
Што Калізеем быў з начы абраны.
І перад ім з пашанай Ватыкан
Шырока адчыняў святую браму.

Жыцця і быту куламес і глей,
А не салодкі і смакотны пернік.

Маліўся тут крамольны Галілей,
І клаў паклоны абразам
Капернік.

Хоць папа Рымскі
Ад грахоў, як Бог,
Паэтаў ратаваў і ўсіх прапашчых.
А ён раллі, багіні ўсіх эпох,
Адно уранку спавядаўся нашча.

Пашана густа
Ардэнамі йшла,
Абвітымі тугімі каласамі.
Ён мог іх срэбрам выбрукаваць шлях
Ад Мядзела да Пількаўшчыны самай.

Васцёр на слова
І з агнём хіцёр,
Па вечарах ля Нарачы, на гала,
З галля ён раздзімаў такі касцёр, —
Аж да Стажараў полымя шугала.

Ад маладосці не згубіў ключы.
Гады — бы ўдоўж дылёўка ля дылёўкі.
І са стагоддзя гулкай каланчы
Ён бачыў і глыбока і далёка.

У новы век ісці ён быў гатоў,
З душою апантанай і нядрэмнай.
Ды спатыкнуўся аб граду гадоў,
Рэформ-перабудоў
І ўсякай дрэні.

Па сэрцы боль,
Як брытвай, разане.
Уджаліць ён пякучаю асвою.
Няўжо не так ён нешта разумеў?
Няўжо ў падполлі нешта
Не засвоіў?!

Сярод сяброў бязладдзе і канфуз —
Яны у знакі так усім даліся.
Чаму, хто скажа, высмаглы камуз
Ад кобзы і жалейкі аддаліўся?

Між голля дзён
Вісіць ён нездарма
Зялёнае спакусы хітры яблык.
Пераваротаў з пошасцю чума
Ішлі не ад нябёс, ад гневу д'ябла.

Хіба не ён
На пошленькі манер
Шаптаў употой голасам дарадцы:
Быў акадэмік, ледзь не мільянер.
А стаўся ўрэшце кім?
Ды галадранцам!

Ён пасміхаўся,
Мудры жартаўнік,
Пагрукваючы кульбаю аб камень,
Што вырас з кош вялізны баравік
Пад кіраўніцтвам старшыні
Абкама.

Сябрам, што вершаў валаклі арбу,
І кветку-сон маглі адкуць з металу,
Ківаў на высачэзную трубу, —
Куды фінансы нашы выляталі.

Ах колькі ён
Не спаў і не драмаў.
Сачыў адно, як цемрадзь ноч пластуе.
Ці ведаў ён, што будзе ўсё дарма,
І пойдзе дымам проста упустую.

І як сябе дакорам не катуй,
Асвой пытанне прама ў вочы лезе:
Няўжо людзям, як грамата кату,
Патрэбны і сцягі і Марсельеза?!

Заныя сэрца: хіба з-за выгод,
Пакінуўшы жніво і серп у полі,
Варыўся у катле ён столькі год
Глыбокага і гнеўнага падполля!

Фантазія, нібы галлё вярбы,
Раскінецца ушыр: глядзіце наце!
А, можа, ўся мітрэнга барацьбы
Ні больш ні менш, як выдумка
Юнацтва.

Гады былыя і былая даль
Пазначаны даўно асобай метай.
Прынізіў час ягоны ідэал,
І змызгаў да канца
Святую мэту.

Ахвярны дух
Даўно пайшоў на звод.
Няма герояў на высокі подзвіг.
Ды знаў, і — на смяротны эшафот
За ўсё былое без вагання пойдзе.

Пад кнігаўкі балючае кі-гі,
Пячоры абмінаючы кратовы,
Гады яго ляглі, нібы кругі,
На зрэзе дня гісторыі крутое.

Не верыў,
Што сляза плыла з вачэй,
Хоць знаў наперад: скону не баіцца!
У турму сягоння загрымець лягчэй,
Чым трапіць у суседнюю бальніцу.

І боль,
Што, пэўна, доўга галадаў,
Да забыцця ягонага, да змогі,
Як звер клыкасты, грыз ды і глыдаў
Разбітыя, натруджаныя ногі.

Свет ведаў:
Звада хай глядзіць савой,
І ля стырна збяруцца нават чэрці,
А ён нідзе ад барацьбы сваёй
Ніколі нізашто не адрачэцца.

На пажыццёвым тлумным кірмашы
Адных яна ўзнімае, іншых губіць.
А ён і т а м глыбока у душы
Дні маладосці без канца
Галубіць.

ПРОЗА

Вера ЛОЙКА

ЗІМОВЫ ДОЖДЖ

АПАВЯДАННЕ

ШТО МОЖА БЫЦЬ горш, чым прачнуцца зімой пад раніцу ад таго, што па шыбінах і па даху барабаніць сапраўдны дождж? Ляжыш і ўяўляеш сабе шэрае нізкае неба, брудную гразкую дарогу, набрынялае вільгаццю паліто з кіслым пахам сырой воўны, бо ад гэткага дажджу не схаваешся ні пад якім парасонам. А боты з наліплымі камякамі зямлі... Святлана ледзь не застагнала ўголас, калі ўспомніла, што аўтобус з раёна ўжо тыдзень як не ходзіць у вёску, а значыць, дабірацца на працу давядзецца пехатой, цэлых пяць кіламетраў. Добра, калі якая машына надарыцца, падвязе, а калі не? Ізноў яна будзе ў настаўніцкай выслухоўваць спачуванні калег, у якіх нядаўна сама вучылася: "Як жа ты, Святланачка, у гэткую далеч дабіраешся кожны дзень? Ой, трэба вам неяк у цэнтр перабірацца". А то яна без іх не ведае, што трэба. Не ад яе тое залежыць. Але нічога, хутка перабяруцца. Калгасныя катэджы, адзін з якіх абяцаны яе Сяргею (першы на чарзе гадоў з дзесяць!), ужо зашклёныя, пачалі шпалеры клеіць. І тады яна таксама будзе прыходзіць на працу за пяць хвілін, у чыстых ботах і сухім паліто, нават у гэткае вось надвор'е. Хай тады так званыя калегі спачуваюць каму хочуць. Як быццам яна не адчувае іхняй зларадасці, маўляў, ну што, ухапіла Бога за бараду? Не надта ж многага ты дасягнула, дзяўчынка, а форсу было, а форсу...

А і праўда, любіла Светка пафарсіць, яшчэ як была школьніцай. Дык і было з чаго. Бацька ездзіў у Польшчу з таварам, дадому ж прывозіў долары. Грошы вадзіліся, і маці штотыдзень купляла любімай дачушцы якую-небудзь новую шмотку. Ні ў кога з аднакласніц не было столькі ўбораў, як у яе. Ды што аднакласніцы, мабыць, і ў школе ніхто ў гэтым не мог з ёю пацягацца. У каго і былі грошы, напэўна, шкадавалі іх траціць. А яе маці для дачушкі нічога не шкадавала. Вунь і шафа, і "сценка" забіты шмаццём, некаторыя рэчы пару разоў толькі і адзетыя былі, нават не мытыя яшчэ. Вядома ж, ёй зайздросцілі. І вучаніцы, і нават настаўніцы, чые дочкі выглядалі куды больш сціпла. Тыя сціпла апранутыя цяпер паканчалі інстытуты і жывуць па гарадах, а хто і за мяжой нават. А яна вось тут грязь месіць, ні жылля свайго, ні адукацыі добрай, ні шчасця...

А ўсё праз тыя танцы ў Зарэччы. Убораў хапала, трэба ж было іх паказваць. Маці дазваляла, бо сама шчэ памятала, як маладой была. На танцы Светка панадзілася бегаць з шостага класа. Спачатку ў свой клуб, пасля збіраліся з дзяўчатамі вялікімі кампаніямі ды ездзілі па суседніх вёсках, калі надарыцца які транспарт. Там яна і напаткала Сяргея. Усё пачыналася нібыта смехам, бо відавочна ж — не пара яны, так, падурэлі і разбягуцца. Ну што можа быць агульнага ў дзесяцікласніцы з калгасным шафёрам, які амаль на два дзесяткі гадоў старэйшы? Ён быў ледзь не равеснікам яе бацькі. Але ж — халасцяк, гаспадаркай не абцяжараны, апрануты пасучаснаму — выглядаў яшчэ хлопцам. Нешта такое мільганула ў яго паглядзе, што абудзіла ў Светцы дзявочае какецтва. Дзяўчат Сяргей перабраў шмат, але ніводнай з іх не ўдалося прывязаць яго да сябе надоўга, не кажучы ўжо, каб назусім. І яе панесла, захацелася быць самай-самай, атрымаць тое, што нікому не ўдавалася. Не каб спыніцца дурніцы ды задумацца: "А ці трэба мне гэта? І што будзе далей?" Хто ж гэта ў шаснаццаць гадоў пра такое думае?

Цяпер думай колькі хочаш — нічога не паправіш?

Яна яшчэ ў школе вучылася, а бацькі пачалі будаваць дом у райцэнтры. Не для сябе, вядома, ім у вёсцы было лацвей — для дзяцей. Ці то Светка, ці то малодшы, Віталік, павінны былі там жыць пасля шлюбу. Ды там і абоім бы месца хапіла. Стаіць цяпер той дом недабудаваны, дождж яго мочыць. А колькі грошай уклалі ў тую будоўлю! Ды яны з Сяргеем неяк давялі б дом да ладу, яна пайшла б працаваць у райцэнтры ў школу, і Паўліку садок быў бы побач, і для Сяргея нешта б знайшлося — шафёр нідзе без працы не застанецца. Дык жа бацька як з ланцуга сарваўся: як гэта яна такое зрабіла. Кажа, хай лепш згніе, чым гэтаму пустадомку дастанецца. Яно і праўда, цяпер яна разумее, як гэта крыўдна, бо Сяргей бацьку ледзь не аднагодак, дык жа адзін змоладу гарбаціў, усё стараўся для сям'і зрабіць, а другі па танцах шастаў, дзевак з толку збіваў, нават на бацькавай гаспадарцы рук не прыкладваў. І грошы ж зарабляў добрыя, а нічога не нажыў. Ну, шмоткі... Дык жа ён іх і не бярог, пабрудзіць ды выкіне. Машыну, праўда, купіў, то адзін смех з той машыны. Родны брат-камерсант купіў сабе іншамарку, а свой стары "Жыгуль" яму ўпёр. "Жыгулю" таму гадоў амаль столькі ж, як і гаспадару, але грошы з яго брат садраў нібы за новую машыну. Трэба ж, як Сяргей да яе ездзіў, дык і не ламаўся той драндулет. Затое цяпер столькі сродкаў на рамонт ідзе, а ўсё роўна машына больш прастойвае, чым ездзіць. Адно адрамантуеш, другое ламаецца.

Не, не гаспадар яе Сяргей, такім, мусіць, і жаніцца не трэба...

На гэтай думцы Светка схамянулася, успомніўшы, што жаніцца ён якраз і не збіраўся. З ёю, ва ўсякім разе. Гэта яна паставіла яго перад фактам, што будзе дзіця. Куды ён мог дзецца? Вось і даказала, здолела тое, чаго іншым не ўдавалася. І што? Бацька ледзь не звар'яцеў. Ён таксама хацеў паказаць усім, як яго дзеці ўладкуюцца ў жыцці. Планаваў гарадскога зяця з выгаднай спецыяльнасцю, з кватэрай, з машынай... Урэшце, калі б нечага й не хапала, ён дапамог бы. Змірыцца ж з яе выбарам не змог. Сказаў: "Сама вырашыла — жыві як знаеш. Вяселле зраблю, больш ні на што не спадзявайся. І жыць ідзі да свякрухі. З мілым рай і ў будане, ці не так?"

Добра яшчэ, маці ўзяла дэкрэтны адпачынак глядзець Паўліка, а то Светка б і педвучылішча не скончыла. Сын нарадзіўся ўлетку, падчас канікулаў, яна два месяцы пакарміла і паехала давучвацца. Што ўжо там была за вучоба, рвалася да дзіцяці, кожны выхадны трэслася ў аўтобусе. То бальнічны які возьме, то так прагуляе, класнай кавалак свежыны прывязе, яна і не заўважыць прагулу.

Але сапраўднае пекла пачалося пасля вучылішча. Жыць прыйшлося ісці да свякрухі. Во ў гэтыя харомы. Усе ў адным пакоі. Парадку ніякага. Светка ўсё прыбярэ, памые, ходнікі пасцеле, глядзіш, свякруха прыйдзе з хлява ў брудных ботах, пассоўвае ўсё, натопча. Яна тое незнарок, проста па звычцы, але ж Свеце ад гэтага не лягчэй. Да таго ж край вёскі, з аднаго боку — лес, з другога — тры пустыя хаты, старыя паўміралі, ніхто не жыве. Нават словам няма з кім перакінуцца. Год прасядзела дома, пайшла ў школу працаваць. Думала, весялей будзе. Якая ўжо тут весялосць, лямку цягнуць. Палова дзяцей напаўдэбілы, абмачыцца могуць проста на ўроку, вядома — бацькі п'яніцы. Сяргей як перастаў на танцы ездзіць, усю сваю прывабнасць страціў. Неяк зірнула Света на яго ўважліва і ледзь не загаласіла. Няўжо дзеля гэтага старога мужыка з трохдзённым шчаціннем, апранутага ў абвіслыя спартыўныя штаны, яна ўсё сваё жыццё зламала? А што зробіш, каму паскардзішся? Трэба неяк жыць. І стала яна марыць пра сваю хату. Сяргей жа ў калгасе ўсё жыццё, тыя, хто пазней за яго прыйшлі, ужо даўно калгасныя кватэры маюць. А яму не давалі як халасцяку, ды ён і не дамагаўся. Вось і стала Светка церабіць яго: дабівайся ды дабівайся. А ён ні ў якую. Яму, маўляў, і тут добра. Ледзь да разводу не дайшло...

Дзверы ў пакой з грукатам адчыніліся, увайшла свякруха, гучна паклікала:

—Сярожа, га, Сярожа! Уставай, чуеш?

Святлану аж затрэсла пад цёплай коўдрай. Колькі разоў яна прасіла, каб старая не грукала гэтак дзвярыма, не размаўляла ўголас, калі яны з Паўлікам спяць. Той — што гарохам аб сцяну. Упарта, пэўна, знарок, працягвае будзіць сына па-свойму.

Грукнулі дзверы, потым другія — на кухні Сяргей доўга не затрымаўся зноў, значыць, не снедаў. Пасля пад вокнамі пачуліся крокі, ляснулі варотцы... Усё. Можна было б падрамаць яшчэ якую гадзіну, але заснуць ужо, мабыць, не атрымаецца, надта ж шмат думак лезе сёння ў галаву. Ні пра што, апроч хаты, яна апошнім часам думаць не магла. Гэта была самая вялікая яе трывога, але і найвялікшая радасць. Яна ўяўляла, як паставіць мэблю, дзе якія павесіць дываны, у думках на ўласнай кухні выстройвала навюсенькія прыгожыя каструлі з набору, падоранага на вяселлі. Шэсць гадоў стаіць на шафе нераспакаваны. Куды тут з тымі каструлямі падзецца? Светка гатуе ў свякрушыных, супакойваючы сябе думкай, што ўсё гэта часова. Сёмы год ужо цягнецца тое часовае. Больш яна не вытрывае. Свякруха касавурыцца, што Света так горача жадае пераехаць ад яе ў сваю хату. Ну, вядома, ёй нявесела заставацца тут жыць адной. Але ў чым перад ёй вінавата нявестка? У тым, што хоча жыць пачалавечы? Так Света старой і сказала падчас нейкай сваркі. Тая і ўсхадзілася: а тут, што — не па-чалавечы? Усё ёй не даспадобы, ніяк не дагодзіш, а каб жылі асобна, можа, і не сварыліся б...

Але колькі ні адцягвай той момант, з-пад коўдры ўсё-роўна прыйдзецца выбірацца. Як яна ненавідзіць гэтае ўставанне ў пастылай чужой хаце, кола абрыдлых штодзённых абавязкаў. У сваёй кватэры, пэўна, яны былі б у радасць. Ну, вось і зараз, палезла ў шафку шукаць цукар, ды зачапіла пластмасавую баначку з-пад ёгурту. З той на брудную кухонную паддогу, бы слёзы, пасыпаліся гарошыны чорнага перцу. Вось так у свякрухі ўсё — без накрыўкі, з самага краёчку. Цяпер паўгадзіны збірай той перац, ды дзе яго збярэш, закаціўся пад шафку, пад зэдлік, на якім стаіць вядро з вадой, пад пустыя пляшкі ды слоікі ў кутку, пад бярэмя дроў ля печы...

Калі перац збольшага быў сабраны, успомніла, што час будзіць Паўліка. Звычайна, калі падыходзіла да яго ложачка, сэрца сціскалася — так шкада было выцягваць малога з-пад цёплай коўдры і цягнуць у садок за пяць кіламетраў. І свякруха ж цэлы дзень дома таўчэцца, ну чаму б не прыгледзець за ўнукам. Не, заладзіла адно: "Старая я ўжо, баюся, чужое дзіця, яшчэ не дагледжу..." О, Госпадзе, гэта родны ўнук — чужое дзіця! Але сёння нервы ў Светы былі наструненыя, толькі зачапі. І калі Паўлік, не хочучы ўставаць, расхныкаўся, яна не вытрымала, дала яму плескача, малы зароў на ўвесь голас, яна пачала крычаць і тут ад парога пачуўся голас свякрухі: "Чаго гэта ты ўсхадзілася з самай раніцы? Хадзем, унучак, я табе есці дам, хадзем, мой харошы". Света і не чула, як старая зайшла ў хату. Калі яны спяць, тая так ціха не ходзіць. Ну дзе тут вытрымаеш, каб не сказаць, што калі ты ўжо такая добрая бабуля, то магла б унука і дома пакінуць, каб не цягнуць яго гэтакім надвор'ем за пяць кіламетраў... Свякруха спакойна адказала, што яна сваіх дзяцей сама вырасціла, а калі ты сабе нарадзіла сына, дык і глядзі яго сама.

Не першы раз яна такое чуе, і адказаць на гэта няма чаго. Так і пацягнуліся да гравейкі, заплаканы Паўлік і яна, злосная, гатовая пасварыцца з любым, хто патрапіць пад руку. Вось толькі дабярэцца да школы...

Ага, лёгка сказаць — дабярэцца! Цёмна, слотна, зімна, людзі спяць мо яшчэ. Не ў кожнай хаце агеньчык убачыш. Праўда, не ў кожнай хаце цяпер ужо й жывуць людзі. А дзе яшчэ ліпяць якія старыя, то скаціны ўжо не трымаюць — чаго ім усхоплівацца гэтак рана. Былі б у вёсцы хоць якія школьнікі, калгас мусіў бы даваць для іх транспарт. А настаўніца — не іх клопат. Нікога яе сямейныя праблемы не турбуюць. Ды яна сама неяк вытрымае, але дзіця... Малое, ні ў чым не вінаватае, чаму яно павінна цярпець? Уставаць на досвітку, цягацца ў садок ды з садка ў гэткую далеч, ды яшчэ і атрымліваць ад маці плескача, калі ў яе дрэнны настрой. А настрой у яе дрэнны амаль заўсёды. Трэба неяк трымаць сябе ў руках, хоць сына не крыўдзіць, тым больш і чакаць той кватэры ўжо нядоўга. Тады і зажывуць.

Тут Паўлік скочыў дзвюма нагамі ў лужыну, пырскі шуганулі на яе новае паліто, трапілі ў боты, пэўна, і сам набраў вады ў абутак. Ах ты, нягоднік, дурэць надумаў, іншага часу не знайшоў, вось табе, вось табе... Абы нашкодзіць, увесь у бацьку ўдаўся, вось і шкадуй такога... А яна так хацела дзяўчынку, каб была паслухмяная, прыгожая, яна б заплятала дачцэ коскі, добра апранала яе, кожны тыдзень купляла б ёй нейкі новы ўбор. Яе дачка была б шчаслівая і ўсё ў яе жыцці складалася б добра, вось тады Света ўсім бы паказала...

Увесь дзень гэтая думка свідравала галаву — кватэра і дачка. Яна павінна атрымаць кватэру і нарадзіць сабе дачку, каб даць той усё, чаго сама не атрымала ў жыцці. Перш за ўсё адправіць яе вучыцца ў горад, ды пастарацца там і ўладкаваць. Ну хіба ў горадзе чалавек гэтак пакутуе, як тут? Там табе і аўтобусы і тралейбусы, а спатрэбіцца, дык і таксі, там крамы, а ў іх — што душа пажадае. Там не трэба ездзіць за дваццаць кіламетраў у райцэнтр, каб палячыць зубы. Там ніхто не прымушае настаўнікаў браць дзялкі буракоў і сушыць улетку сена. Там не трэба заказваць балоны з газам і па некалькі тыдняў чакаць, калі іх прывязуць. Там тратуары, на якіх амаль няма лужын. І ванна, і гарачая вада, і туалет у кватэры...

Вырашыла Паўліка дадому пасля працы не цягнуць, бо калі і заўтра гэтак дабірацца, яна зусім звар'яцее. Пакінула малога ў бацькоў. Тыя ўнука любілі і ніколі не адмаўляліся паглядзець яго. Бацькі, праўда, дома не было, была адна маці, і Светка не вытрымала, сказала той пра сваё рашэнне. Вось атрымаюць яны кватэру і будзе ў цябе, мама, унучка. Так усё ёй і выклала, для якога жыцця яна сваю дачушку народзіць. Маці не даслухала, нібыта ўсё ведала наперад, і спытала:

—Няўжо ты думаеш, што я табе гэтых лужын жадала і гэтых дзялак і вось гэтага... шчасця? Ты іх сама захацела. Так што падумай добра. Ці думаць яшчэ дагэтуль не навучылася?

Тут і бацька прыйшоў. На Свету амаль што й не глянуў, працягнуў рукі да Паўліка, той ускочыў, абхапіў дзеда за шыю. Кашулька вылезла са штонікаў, задралася, а ў грубцы яшчэ не палена, холадна ў хаце. Света падышла паправіць сыну апратку і ўнюхала пах самагонкі. Яна грэбліва скрывілася:

—Дзе гэта ты паспеў ужо?

Бацька прыжмурыў вочы і ўважліва паглядзеў на яе:

—Гэта мая справа. І абнюхваць мяне ёсць каму, дзякуй Богу! І ў цябе, дочачка, здаецца, ёсць за кім сачыць. Вось і спяшайся, давай, а то маладзейшую знойдзе...

Маці прамаўчала, не заступілася, як быццам і не чула нічога.

Глытаючы злыя слёзы, ляцела Света дахаты. Вечарэла, а дарога наперадзе хавалася ў лесе. Не так ужо многа прайсці трэба было тым лесам, недзе з паўкіламетра, а можа, і меней, але было неяк няўтульна, страшнавата. Месца было нейкае неспакойнае. Недзе тут паблізу — у цемры не відно — пры дарозе быў укапаны руль ад машыны — помнік шафёру, што разбіўся на гэтым месцы. А вось старую бярозу, на якой засілілася маладая дзяўчына з Сяргеевай вёскі, было відаць добра. Яна стаяла асобна, нібыта навісала над дарогай. Яшчэ далей — месца, дзе маланкай забіла маладую пару, што вярталася з танцаў. Дзяўчына была тутэйшая, вясковая, адзіная дачка немаладой удавы, а хлопец прышлы, студэнт, што прыехаў на бульбу. Усе гэтыя няшчасці здарыліся так даўно, яшчэ бацькі яе былі нежанатыя, але хадзіць тут было непрыемна нават удзень, што ўжо казаць пра цёмны час. Аднак другой дарогі не было.

Света так унурылася ў свае невясёлыя думкі, што нават не пачула, як ззаду яе дагнала машына і гучна засігналіла. Яна аж падскочыла ад нечаканасці. Смешна, мусіць, гэта выглядала, але, дзякуй Богу, не чужы хто — Сяргей.

—Раней не мог дагнаць. Паўдарогі пешкі адмерала, — ужо не надта злосна, так, дзеля парадку, прабурчэла яна, залазячы ў кабіну. Сяргей прамаўчаў, не агрызнуўся, як звычайна, і гэта яе насцярожыла.

(Працяг на стар. 12)

ЧАСАПІС

Ганаравана яго імем

Адной з лепшых дзіцячых музычных школ сталіцы — вядомай дзесятай школе, што месціцца сёння ў гістарычным цэнтры Мінска, — нададзена імя Яўгена Глебава.

Творы выдатнага беларускага кампазітара, чый зямны шлях завяршыўся амаль паўтара года таму, — у рэпертуарным актыве і сталых прафесійнікаў, і многіх пачаткоўцаў. Але менавіта ў дзесятай мінскай ДМШ Яўгена Аляксандравіча Глебава добра ведалі асабіста. Тут ён часта бываў, сустракаўся з выхаванцамі, педагогамі. Ушаноўваючы добрыя творчыя сувязі з незабыўным майстрам, калектыў школы прыняў імя Яўгена Глебава як асаблівы гонар, як высокую адзнаку сваіх дасягненняў. У той жа час, ганараванне выдатным імем — гэта і адказнасць за далейшую працу, і стымул для новых творчых поспехаў. А музыка Яўгена Глебава заўсёды была і будзе ў рэпертуары юных выканаўцаў, будзе ўшанавана ў эстэтычным досведзе вучняў ды педагогаў — разам з імем яе стваральніка.

Н. К.

Гасцінныя запросіны



Добрай і прыемнай традыцыяй стала ў Брэсцкім абласным тэатры лялек рыхтаваць дабрачынныя акцыі, прымеркаваныя да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Вось і сёлета тут не забыліся на гэтую высакародную справу. І 1 чэрвеня тэатр гасцінна запрасіў да сябе ў госці дзяцей-інвалідаў горада і дзяцей з маламаёмасных сем'яў, якія не заўсёды могуць сабе дазволіць наведаць тую ці іншую дзіцячую ўстанову. Што ж прапанаваў для іх тэатр у гэты дзень? Адну са сваіх самых лепшых работ — спектакль "Дзед і Жораў" паводле твора Віталя Вольскага. Прыгожыя лялькі-марыянеткі, яркая, дынамічная дзея, захапляльная і выразная ігра акцёраў сталі радасным і прыемным падарункам для юных гасцей тэатра.

І. Х.

На здымку: (злева направа) артысты Іван Герасевіч, Сяргей Пяткевіч, Тамара Тэвасян і Юры Цесля ў фінале спектакля "Дзед і Жораў".

ТЭАТР

Віталь КАТАВІЦКІ:

"Мы просім афіцыйнага дазволу на эксперымент..."

Парадаксальная камедыя "Трызненне ўдваіх" — адзін з запамінальных спектакляў гэтага сезона. Галоўны рэжысёр Маладзёжнага тэатра Віталь КАТАВІЦКІ ўвасобіў на сцэне думку Э. Іянэскі, які лічыў, што ў чалавеку ёсць глыбокая тэндэнцыя да разбурэння і самазнішчэння... "Я заўсёды пытаў сябе, чаму людзі не могуць дамовіцца, знайсці кампраміс?" Падсумаваўшы вопыт свайго сямейнага жыцця, В. Катавіцкі даводзіць праз герояў п'есы (а іх толькі двое — Ён і Яна), што знішчальная энергія непаразумення паміж людзьмі ўзнікае ў сям'і, маючы вынікам страшэнныя сусветныя канфлікты.

Сёння В. Катавіцкі працуе над новым спектаклем паводле французскіх сярэдневяковых фарсаў — ягонай прэм'ерай плануецца распачаць наступны тэатральны сезон. На першы погляд, забаўляльны сцэнічны твор будзе насамрэч працягваць тэму духоўнай антрапалогіі, вымагаць ад гледача глыбокага роздуму...

— Новы спектакль паводле французскіх сярэдневяковых фарсаў будзе называцца "Чорт, выстаўлены аслом", — расказвае В. КАТАВІЦКІ. — Фарс, як вядома, — гэта тэатральная п'еса лёгкага, забаўляльнага зместу са знешнімі камічнымі штукарствамі. З французскай мовы ён перакладаецца як "фарш": у сярэднявечча "фарсамі" нашпігоўвалі містэрыі — драмы на біблейскія тэмы. З цягам часу фарсы зрабіліся самастойнымі творамі, якія высмейвалі розныя чалавечыя парокі. У маім спектаклі яны будуць тычыцца любоўнай сферы. У такіх фарсах звычайна пэўны склад герояў: маладая жонка, стары муж, палюбоўнік і абавязкова духоўная асоба, якая прагне плоцевых асалодаў. Спектакль будзе пачынацца з таго, што Люцыфер, паглядзеўшы, што чэрці зусім не прыносяць душы ў пекла, вельмі раззлаваўся. Тады адно нявопытнае чарцянё, якому карцела выслужыцца, заўпэўніла, што здолее разбэсціць усіх людзей на зямлі. Але чалавек такая моцная істота, што і чорт для яго не брат. У рэшце рэшт, нячысты сам становіцца ахвярай людскіх інтрыг.

— Значыць, вы ставіце спектакль, у якім цалкам адмаўляеце чалавеку ў высакародстве?

— Чалавек насамрэч вельмі разбэшчаная істота. Ён такі нахабны матэрыяліст, што можа пацягацца нават з самім д'яблам. Ведаеце, сёння мы глядзім на жыццё вельмі спрошчана. Няма разумення граху, маральнасці, яны сцерліся, зліліся паміж сабой. І існаванне без маральных крытэрыяў мы чамусьці лічым нармалёвым чалавечым жыццём. Таму я і ўзяў фарсы, у якіх сам нячысцік ніякавее ад "нормаў" чалавечага быцця. Праўда, працаваць з фарсамі складана. Яны настолькі шчырыя ў вызначэнні ўсіх рэчаў, там усё настолькі называецца сваімі імёнамі без усялякіх эўфемізмаў. Аднак мы імкнёмся не перайсці мяжу пошласці, так бы мовіць, прыгладзіць, каб гэта было прыгожа, смешна, сексуальна. У быццам бы забаўляльным спектаклі ў фінале прагучыць сумная нотка.



— "Дзядзька Ваня" Чэхава, "Трызненне ўдваіх" Іянэскі, "Чорт, выстаўлены аслом" паводле французскіх сярэдневяковых фарсаў — ці можна знайсці паміж гэтымі спектаклямі сувязь?

— Ведаеце, я заўсёды ставіў толькі тыя спектаклі, якія хацеў паставіць у пэўны момант. Напрыклад, "Дзядзька Ваня" быў прадыктаваны каханнем да жанчыны. "Трызненне ўдваіх" уяўляе сабой своеасаблівае суміраванне ўсіх маіх перажыванняў, звязаных з сямейным жыццём. Фарсы не тычацца майго асабістага жыцця — гэта абагулены погляд на жыццё.

Так я жыву — сублімірую сваё жыццё праз тэатр. А калі атрымліваю асалоду ад сублімацыі, пачынаю разважаць над жыццём з пункту гледжання старонняга назіральніка. Здаецца, даўно можна было б кінуць тэатр, але як мне тады выказацца? Бо творчы чалавек — гэта паравы кацёл, якому неабходны выхад для набалелага. Я працую ў тэатры таму, што магу ўвасобіць на сцэне свае перажыванні.

— І дазваляюць?..

— Зараз ёсць тэндэнцыя да знішчэння асабістай ініцыятывы творцы. Але тыя, хто гэта робяць, не разумеюць, што, пагарджаючы асобай творцы, яны наогул знішчаюць мастацтва. Сапраўднае мастацтва — гэта не канвеер Форда, які без перапынку можа штампаваць прадукцыю. Сапраўднае мастацтва — гэта ўвасабленне глыбокага перажывання чалавека. У сапраўдным тэатры творца адлюстроўвае сваё разуменне жыцця.

Сёння людзі тэатра маюць мізэрныя заробкі. А чалавек у нашым грамадстве ацэньваецца па тым, колькі ён атрымоўвае грошай. А ці паважаюць беднякоў? Цяпер у тэатры працуюць толькі апантаныя людзі, галоўнае для якіх —самавыяўленне. І калі іх пазбавіць гэтай магчымасці, тады, увогуле, загіне само мастацтва. Я, напрыклад, хацеў паставіць "Гамлета". Мне адмовілі з прычыны проста ашаламляльнай: "Навошта "Гамлет"?" Як навошта "Гамлет"??? На маю думку, праекты, звязаныя з класікай, заўсёды павінны быць прыярытэтнымі ў тэатральным мастацтве. Бо ў класіцы і занатавана тая сапраўдная духоўнасць, якая вельмі неабходна сёння. Нават на Захадзе дзяржаўную падтрымку мае ў першую чаргу класічная драматургія, старажытная трагедыя, чымсьці сучасная п'еса.

Тэатр — гэта не палітычная арэна. Ма-

ПРЭМ'ЕРЫ

П'еса Гавела — у Мінску

Ужо не адно дзесяцігоддзе ў Нацыянальным цэнтры творчасці дзяцей і моладзі (старэйшае пакаленне мінчан ведае яго як рэспубліканскі Палац піянераў і школьнікаў) існуе Тэатр-студыя юнацкай творчасці. Гэта цікавы і самабытны калектыў.

Зусім нядаўна тут адбылася прэ'мера спектакля паводле аднаактовай п'есы Вацлава Гавела "Аўдыенцыя", якая была напісана амаль трыццаць пяць гадоў таму, у 1967 годзе, а надрукавана толькі ў часы перабудовы. Твор чэшскага драматурга і прэзідэнта Чэхіі гучыць надзіва актуальна. Ён — пра ўзаемаадносіны ўлады і мастацтва. Тэма, як кажуць, вечная.

П'еса ў пэўным сэнсе камерная. У ёй усяго два героі — Сладэк, адзін з кіраўнікоў піваварнага завода (яго ролю выконвае Уладзімір Кап'ёў), і Ванэк, пісьменнік-"дысідэнт", сасланы сюды, на завод, дзе ён працуе фактычна чорнарабочым (яго ролю выконвае Іван Патапаў). Дыялог герояў, а дакладней, маналог Сладэка, у якім зрэдчас з'яўляюцца рэплікі пісьменніка, прымушае глядзельную залу напружана сачыць за развіццём падзей, інтрыгі і характараў.

Спектакль пастаўлены мастацкім кіраўніком тэатра Наталляй Рачкоўскай. Ёй жа належыць і мастацкае афармленне пастаноўкі.

Магчыма, Тэатр-студыя юнацкай творчасці вядома беларускім аматарам тэатра не ў такой ступені, як хацелася б, але калектыў не робіцца менш цікавым ад таго, што пра яго пішуць менш, чым ён таго заслугоўвае. Найперш у тэатра вельмі арыгінальны рэпертуар. Паводле слоў кіраўніка калектыву Наталлі Рачкоўскай, якая амаль дваццаць гадоў узначальвае тэатр-студыю, любімымі драматургамі ў калектыве з'яўляюцца Яўгеній Шварц (у тэатры ставіліся ягоныя песы "Звычайны цуд", "Дракон", "Цень") і Жан Ануй (тэатр увасобіў дзве ягоныя знакамітыя песы "Жаўранак" і "Антыгона").

Пастаноўка, якая папярэднічала "Аўдыенцыі", — ні больш ні менш, як шэкспіраўскі "Гамлет". Цікава, што прэм'ера шэкспіраўскай трагедыі адбылася ў Берліне на сцэне маладзёжнага цэнтра "Фуксбал", з якім Тэатр-студыя падтрымлівае трывалыя творчыя сувязі. (Моўны бар'ер аказаўся пераадолены вельмі проста: і немцы, і нашы артысты досыць прыстойна размаўлялі па-англійску). Цікава, што супрацоўніцтва з берлінскім маладзёжным цэнтрам доўжыцца ўжо з 1994 года.

Сярод іншых пастановак Тэатра-студыі варта згадаць "Сінюю птушку" М. Метэрлінка (спектакль, адрасаваны дзецям) і п'есу рускамоўнага аўтара, які жыве за мяжой, Аляксея Шыпенкі "Назіральнік". Дарэ-

стацтва — гэта барацьба за маральнасць чалавека. Напрыклад, у спектаклі "Трызненне ўдваіх" я хацеў паказаць, што агульначалавечыя праблемы пачынаюцца з сям'і. Пра якое гарманічнае грамадства мы можам казаць, калі муж не можа знайсці паразумення са сваёй жонкай? Менавіта ў сям'і выбухоўвае знішчальная энергія непаразумення, якая потым укараняецца ў жыцці.

Я ўпэўнены, што ў кожным часе абавязкова ёсць разумныя людзі, якім патрэбна глыбокае, сумнае мастацтва. Я не згодны з тым, што цяпер трэба ставіць толькі забаўляльныя спектаклі, таму што жыццё надзвычай складанае. Наадварот, жыццё цяпер вельмі вясёлае, шабаш проста. Зараз трэба не весяліць, а якраз змушаць задумацца, як і навошта жыве чалавек.

— Прабачце, але вы гаворыце як ідэаліст...

— ...А няма нічога больш пэўнага за гэты ідэалізм. Мастацтва — ідэалізм, рэлігія — ідэалізм. Аднак што можа быць рэальней Бога! Адзін Ён вечны, усё астатняе — другаснае, яно мінае.

— Як сведчаць некаторыя даследчыкі, сёння заходні тэатр перастае быць масавым, народным мастацтвам. Прынамсі, літаратурны тэатр, заснаваны на драматургіі, на слове, якое гучыць са сцэны, сыходзіць у малыя залы, робіцца элітарным відовішчам, разлічаным на знаўцаў, інтэлектуалаў. У падмурку новай культуры, замешанай на эстрадзе, тэлевізійных кліпах, ляжыць забаўка — тэатр, які адпавядае запатрабаванням масавай публікі. Апошнім часам на Захадзе робяцца ўсё больш папулярнымі вулічныя тэатры.

— Тэатр будзе існаваць заўсёды. Будзе заўсёды, пакуль існуюць людзі, якія хочуць, каб іх пачулі. Якім ён будзе: масавым ці элітарным? Напрыклад, рэжысёр Е. Гратоўскі заснаваў тэатр без гледача, у якім некалькі тэатральных калектываў паказваюць спектаклі для саміх сябе, дзеляцца сцэнічнымі знаходкамі. Так, вашая праўда, тэатр — гэта элітарнае відовішча, таму што ён па сваёй прыродзе ўмоўны. І зразумець гэтую ўмоўнасць здольны толькі адукаваны, духоўна развіты чалавек, які можа адчуць, што адбываецца з нерэальнымі героямі і ўбачыць ва ўмоўных абставінах рэальны свет.

На маю думку, сёння тэатр павінен ісці ў малыя залы, дзе адчуваецца энергетычны кантакт паміж акцёрам і гледачом. Бо тэатр заснаваны на глыбокай энергетычнай сувязі людзей. А энергетыка гэтая мае межы. Гучанне голасу акцёра павінна адпавядаць яго пачуццю. Калі пачуцці акцёра і яго выразныя сродкі раскаардынаваны — узнікае няпраўда.

Цяпер тэатрам неабходна даць магчымасць быць, так бы мовіць, "групоўкамі па інтарэсах", не патрабаваць ад іх бясконцага вытворчага працэсу, а даць магчымасць знайсці сябе, свой твар праз эксперымент. Такім чынам Літва ўзгадавала Э. Някрошуса, Расія — А. Васільева, Л. Додзіна і інш. Мы не просім дадатковага фінансавання, а толькі афіцыйнага дазволу на эксперымент. Менавіта тады Беларусь адкрые штосьці новае ў тэатральным мастацтве.

Гутарыла
В. БАРАБАНШЧЫКАВА

чы, калектыў чакае ад гэтага драматурга новую п'есу.

На працягу сезона Тэатр-студыя паказвае каля 15 спектакляў. Часцей іграюць "дома" — на сцэне Нацыянальнага цэнтра, часам арандуюць сцэну Маладзёжнага тэатра.

Так бы мовіць, "штат" у Тэатра-студыі невялікі. Акрамя кіраўніка, гэта рэжысёр і харэограф Людміла Богдан, рэжысёр Іван Патапаў, адзін з кіраўнікоў дзіцячай студыі Уладзімір Кап'ёў. "Дарослых" артыстаў у тэатры няшмат — усяго 15 чалавек. А вось дзіцячая студыя, у якой каля 100 выхаванцаў, мае ажно некалькі груп.

Да канца сезона артысты Тэатра-студыі пакажуць "Аўдыенцыю" яшчэ некалькі разоў, а потым выправяцца ў творчую вандроўку ў Германію. У жніўні калектыў павінен удзельнічаць у міжнародным фестывалі дзіцячых і юнацкіх тэатраў, які пройдзе на Азоўскім моры, у Марыупалі. Фестываль мае назву "Меатыда" (ад грэчаскай назвы Азоўскага мора). Тэатр-студыя плануе паказаць там "Аўдыенцыю" В. Гавела і "Зялёную птушку" К. Гоцы.

Т. МУШЫНСКАЯ

ЮБІЛЕІ

Быць сапраўднымі тюгаўцамі

ТЭАТРУ ЮНАГА ГЛЕДАЧА — 45

Споўнілася 45 год Беларускаму дзяржаўнаму тэатру юнага гледача (адкрыўся 8 красавіка 1956 года). Некалі ў гэты святочны нядзельны вечар пад гарачыя воплескі шчырых прыхільнікаў тэатра міністр культуры Р. Кісялёў уручыў дырэктару У. Стэльмаху ключы ад будынка ТЮГа. (Напярэдадні 4 красавіка адбылася сустрэча з будаўнікамі тэатра — так бы мовіць, апрабацыя памяшкання і калектыву: акцёры ўпершыню выступалі на сваёй сцэне перад гледачамі, паказаўшы ўрывак са спектакля "Як гартавалася сталь" М. Астроўскага). І пачалося паўсядзённае тэатральнае жыццё, пачаліся спектаклі: "Горад майстроў", "Як гартавалася сталь", "Каханне Ані Бярозкі"...

Святкаваць юбілей тэатр будзе ў новым сезоне — распачне яго гэтай падзеяй. А пакуль што з гэтай нагоды ў тэатры адбылася сяброўская вечарына. (Вельмі прыемна, што на ёй прысутнічала Святлана Кавязіна — дачка стваральніка дзіцячага тэатра Беларусі Мікалая Кавязіна, які арганізаваў і ўзначальваў даваенны Тэатр юнага гледача БССР у 1931—1937 гадах).

Пачалася вечарына з традыцыйнага гуказапісу фрагмента са славутага спектакля тэатра "Папараць-кветка" І. Козела, які больш за 10 гадоў упрыгожваў яго афішу, з якім тэатр у 1958 годзе выступаў на Усесаюзным фестывалі тэатраў юнага гледача ў Маскве і атрымаў дыплом 1-ай ступені.

Са святам, "сямейным" святам павіншаваў прысутных дырэктар тэатра Юры Вута і заявіў, што не ведае іншых тэатраў, дзе б так неафіцыйна, па-сямейнаму ставіліся да такога ўзросту, як 45. Скразной дзеяй вечарыны, якую вёў галоўны рэжысёр Андрэй Андросік, стала гісторыя тэатра. Акцёры ўспаміналі, як усё пачыналася.

Усхвалявана гаварыў Віктар Лебедзеў (працуе ў тэатры з верасня 1956 г.), як усе акцёры любілі свой тэатр, ганарыліся ім, як хваляваліся за спектаклі, радаваліся поспехам адзін аднаго, перажывалі няўдачы. Нагадаў, колькі таленавітых людзей "прайшло" праз ТЮГ, колькі іх было сярод тых, хто пачынаў тэатр, і якіх, на жаль, сёння ўжо няма з намі: Л. Мазалеўская, У. Стэльмах, В. Окалаў, А. Ротар, К. Пельтцар, Я. Глебаў, У. Говар-Бандарэнка і Д. Фефер, П. Дубашынскі, Л. Герлаван, М. Трухан, І. Пешкур, Ю. Міроненка, Ю. Кухаронак, А. Раўдэ, А. Бяляеў, Э. Шаміёнка, І. Ганусевіч, У. Бузук, С. Пятровіч і яшчэ многія-многія.

Людміла Цімафеева ўспамінала, як Л. Мазалеўская, а яна была кіраўніком іх курса ў тэатральна-мастацкім інстытуце, стварала "свой" тэатр. Пры фарміраванні трупы ўлічвала не толькі індывідуальнасці акцёраў, але нават і як яны змогуць разам ужыцца ў калектыве. З гордасцю сказала Л. Цімафеева: "Гэта быў наш тэатр!" Сапраўднай гаспадыняй у тэатры была Л. Мазалеўская. Яна ставіла нацыянальныя п'есы і прызначаныя для моладзі. Лічыла, што не ўмее ставіць дзіцячыя спектаклі — адзіным была казка "Горад майстроў" (дарэчы, спектакль цікавы).

Як сказала Л. Цімафеева, Л. Мазалеўская займалася творчасцю, а дырэктар У. Стэльмах нас "прадаваў". Дзе мы толькі не пабывалі: аб'ездзілі не толькі ўсю нашу рэспубліку, але і Расію, Украіну, Прыбалтыку, Казахстан. Яны (Л. Мазалеўская і У. Стэльмах) заўсёды працавалі ў пары, гэта быў такі зладжаны тандэм.

Нашы заснавальнікі, лічыць Л. Цімафеева, унеслі вялікі ўклад у справу жыццядзейнасці ТЮГа (актрыса прапанавала надаць тэатру імя Любові Мазалеўскай).

Цудоўнага акцёра У. Говар-Бандарэнку ўспомніў Міхась Пятроў (сам ён працуе ў тэатры з ліпеня 1960 г.) і прачытаў фрагмент з яго ролі Алега Баяна ў спектаклі "Клоп" У. Маякоўскага. Клара Мізгайла расказала пра добрага акцёра Міхася Пятрова, а пасля разам яны выканалі дуэт са спектакля "Чыпаліна і яго сябры" паводле Дж. Радары. Найлепшыя пажаданні тюгаўцам ад ветэранаў тэатра — Юліі Фляйто і Ксаны Каралёвай, з якімі сустракаўся напярэдні, перадаў Міхаіл Лявонцьеў. Мікола Лявончык (як ён сказаў, нарадзіўся праз тыдзень пасля таго, як быў падпісаны загад аб стварэнні тэатра) прачытаў свае сяброўскія эпіграмы на акцёраў тэатра.



Не былі толькі гасцямі на вечары цяперашнія маладыя акцёры. Яны паказалі эцюд, дзе абыгралі назвы спектакляў, што ставіліся ў тэатры. Вось толькі незразумела, чаму яны беларускі ТЮГ ператварылі ў рускі (рускамоўны), як, дарэчы, і вядучы. Адзіны, хто адчуў неабходнасць роднага слова ў тэатры, быў спонсар гэтай сямейнай урачыстасці — Рыгор Пятровіч Чуйко, генеральны дырэктар агракамбіната "Ждановічы".

Між тым вечарына працягвалася. Рэжысёр тэлебачання Уладзімір Траццякоў, у былым акцёр тэатра, узнагародзіў шматгадовага загадчыка трупы Кацярыну Малюціну (працуе ў тэатры з 1955 г.) сваім "уласным ордэнам" — за службу і храбрасць. Жанна Друцкая (у тэатры з 1962 года) павіншавала Тамару Аляксееву, якая ад самага пачатку і дасюль, вось ужо 45 гадоў, як усё шые і шые касцюмы акцёрам (у свой час была і загадчыкам кравецкага цэха).

А на заканчэнне нагадаю словы са звароту Л. Мазалеўскай да моладзі тэатра ў маі 1956 года (захоўваецца ў архіве тэатра):

"У нас тэатр будучага,.. тое, што мы зараз іграем спектаклі, яшчэ не тэатр. Мы павінны яшчэ стварыць яго... Ад нас залежыць, якое творчае аблічча будзе мець наш тэатр. Мы ствараем традыцыі, атмасферу, увесь уклад нашага творчага жыцця ў нашым тэатры.

Што ёсць у нас каштоўнае? — Маладосць. Але маладосць гэта не пашпартны ўзрост, а гарэнне, страснасць і нястомнасць у рабоце. (...)

Для сапраўднага тюгаўца работа тэатра павінна быць самым галоўным у яго жыцці... Справа стварэння тэатра — гэта не толькі справа дырэкцыі і галоўнага рэжысёра, а ўсяго калектыву...

Моладзь! Будзьце маладымі.

Будзьце сапраўднымі тюгаўцамі".

Дзіяна СТЭЛЬМАХ

На здымку: сцэна са спектакля "Як гартавалася сталь" (100-ы спектакль).

ГОСЦІ

Музыка, даведзеная да экстрэма

Менавіта гэтак можна характарызаваць тое, што пачулі прысутныя на канцэрце-сустрэчы з кампазітарам Дрорам Файлерам (Швецыя). Падзея адбылася ў зале Беларускага саюза кампазітараў і сабрала значную колькасць цікаўных самага рознага ўзросту.

Знаёмства з творчасцю музыканта пачалося з міні-канцэрта, у якім прагучала некалькі інструментальна-электронных кампазіцый. Сапраўды, людзям, якія прызвычаіліся да мілагучнасці класікі, было цяжка прылічыць пачутае да ўласнага разумення такой з'явы, як музыка. Гукі, якія даносіліся з дынамікаў, заглушалі нават грукат вулічнага руху за сценамі залы. Кампазітар іграў на саксафоне і памайстэрску прымушаў яго выдаваць інтанацыі, падобныя да свісту, то да піску, а то і да скрыгату. Напэўна, не кожны з прысутных мог уявіць, што гэты інструмент здольны на такія гукавыя цуды.

Слухачы былі ўражаныя не толькі незвычайнасцю праслуханых кампазіцый, але і творчай індывідуальнасцю іх аўтара. Дрор Файлер скончыў універсітэт у Стакгольме як музыказнаўца, а затым Акадэмію музыкі па класе кампазіцыі. Ён цудоўна валодае ўсімі разнавіднасцямі саксафона; грае на кларнеце і бас-кларнеце, хаця асвойваць музычныя інструменты пачаў у даволі сталым узросце — 27 гадоў. Тым часам ён стварае апрацоўкі класічных твораў, піша музыку да кінафільмаў і ажыццяўляе сцэнічныя пастаноўкі як рэжысёр. У мінулым годзе кампазітару далі заказ на стварэнне музыкі, пад якую будуць атрымліваць свае заслужаныя ўзнагароды лаўрэаты Нобелеўскай прэміі.

Падчас гутаркі са слухачамі Дрор Файлер сфармуляваў свае адносіны да камп'ютэрнай музыкі. На погляд майстра, яна прымушае сумнявацца ва ўсім тым, што чалавек чуў дагэтуль, адмовіцца ад сваіх былых уяўленняў пра музыку...

Прысутныя на вечарыне пазнаёміліся толькі з невялікай часткай разнастайнай творчасці шведскага кампазітара, які працуе ў розных тэхніках і жанрах, піша і шмат сімфанічнай музыкі. А паколькі ён іграе для ўсіх, хто яго запрашае (незалежна ад колькасці слухачоў і наяўнасці матэрыяльнага ўзнагароджання), дык мы можам спадзявацца на новую сустрэчу з Дрорам Файлерам і яго творамі.

Марына МРАЧКО,
студэнтка І курса Беларускай акадэміі музыкі

ЧАСАПІС

Свята на радзіме Коласа

26 мая 2001 года на радзіме народнага паэта Беларусі Якуба Коласа ў Стаўбцоўскім раёне, што на Міншчыне, адбыўся XII музычны фестываль "Сымон-музыка". На яго з'ехаліся юныя прыхільнікі мастацтваў з розных рэгіёнаў нашай Беларусі.

У рамках гэтага маштабнага фэсту праходзіў дзіцячы мастацкі пленэр школьнікаў раёна "Дзе льецца Нёман срэбраводны", танцавальны конкурс "Бусляняткі", а таксама літаратурнае свята "Слова пра Коласа". Яго ўдзельнікамі на гэты раз былі сын Якуба Коласа доктар тэхнічных навук Міхась Міцкевіч, унучка паэта, старшыня дабрачыннага фонду "Сакавік" Марыя Міцкевіч, начальнік аддзела музеяў і выставак Міністэрства культуры РБ Сяргей Іванавіч Маслоўскі (старшыня журы мастацкага пленэру).

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў свята звярнуліся Уладзімір Мазго, Яўген Хвалей і Іван Курбека, рэдактар часопіса "Роднае слова" Міхась Шавыркін, дырэктар Літаратурна-мемарыяльнага музея Я. Коласа Зінаіда Камароўская, прадстаўнікі мясцовай улады намеснік старшыні Стаўбцоўскага райвыканкама Сяргей Галоўка, загадчык аддзела культуры раёна Анатоль Грэкаў.

Праграма свята ўключала таксама наведванне мясцін, якія помняць Коласава маленства, філіялаў музея паэта ў Смольні і Альбуці, ускладанне кветак да помніка Песняру ў в. Мікалаеўшчына. Завяршылася свята відовішчным канцэртам юных спевакоў, танцораў і выканаўцаў, які праходзіў на сцэне Старасвержанскага СДК, непадалёк ад Стоўбцаў.

Г. З.

Фота С. ЛУК'ЯНАВА

Адноўлена праца універсітэта культуры

Пасля перапынку аднавіў сваю дзейнасць універсітэт культуры, які працуе пры Маладзечанскім райвыканкаме і разлічаны на бібліятэчных і клубных работнікаў. Такога кшталту мерапрыемствы патрэбныя для работнікаў культуры, бо даюць магчымасць павысіць інтэлектуальны патэнцыял, пазнаёміцца з цікавымі людзьмі, сустрэцца з выдатнымі прадстаўнікамі беларускай культуры. Акрамя таго, ствараюць умовы для паглыблення ведаў у галіне прававога і працоўнага заканадаўства. Рэктарам універсітэта культуры прызначаны супрацоўнік Маладзечанскай раённай цэнтральнай бібліятэкі Міхась Казлоўскі.

А першая такога тыпу сустрэча прайшла 24 сакавіка г. г., калі да работнікаў культуры раёна прыехалі паэты Віктар Шніп і Людміла Рублеўская. Адбылася шчырая, зацікаўленая гаворка паміж вядомымі літаратарамі і супрацоўнікамі аддзела культуры. Пісьменнікі расказвалі пра свой жыццёвы і творчы шлях, чыталі вершы, а потым адказвалі на шматлікія пытанні прысутных.

Цікавым працягам такога роду мерапрыемстваў стала чарговае пасяджэнне універсітэта культуры, якое адбылося 24 мая. Гэтым разам госцем маладзечанцаў быў вядомы пісьменнік, галоўны рэдактар газеты "Чырвоная змена" Алесь Карлюкевіч. Апантаны краязнаўца, бязмежна ўлюбёны ў вывучэнне гісторыі "нашых малых радзім", ён расказаў пра адноўлены краязнаўчы рух у нашай краіне, пра славутых землякоў, якія з яўляюцца гонарам нашага і суседніх народаў, але амаль, на вялікі жаль, іх імёны невядомыя жыхарам Беларусі. І, як заўсёды, у заключэнне сустрэчы жадаючыя атрымалі магчымасць набыць кнігі пісьменніка з ягоным аўтографам. Цешыць у такога кшталту мерапрыемствах яшчэ і тое, што, акрамя сустрэч з пісьменнікамі і мастакамі, адбываюцца яшчэ і лекцыі з галіна-прававой тэматыкі і працоўнага заканадаўства. Такімі высокапрафесійнымі дакладчыкамі былі прадстаўнікі інспекцыі працы горада Міхаіл Лапушынскі і Славамір Зубрыцкі...

Праца першага паўгоддзя універсітэта культуры завяршылася, і нам засталося толькі чакаць восені, калі на сустрэчу з работнікамі культуры раёна прыедуць і прыйдуць іншыя вядомыя і цікавыя людзі Беларусі, каб расказаць пра ўсё лепшае, чым славіцца наша гісторыя і літаратура.

Наталля ПЛОТАВА

ПЕРАКЛАДЫ

Прапаную чытачам "ЛіМа" апошнюю, чацвёртую, песню паэмы вялікага англійскага паэта-вальнадумца "Прароцтва Дантэ", якую я пераставрыў на беларускай мове. Першая і другая песні гэтай паэмы былі надрукаваны ў "ЛіМе" 10 верасня 1999 г. і 2 чэрвеня 2000 г., трэцяя — у другім нумары часопіса "Полымя" за 2000 г.

Уладзімір СКАРЫНКІН

Джордж Гордан БАЙРАН

Прароцтва Дантэ

ПЕСНЯ ЧАЦВЁРТАЯ

Ёсць шмат паэтаў, можа, самых лепшых,
Што адчувалі, верылі, жылі,
Але душы не выказалі ў вершах

І запаветных дум не прадалі
Стварэнням нізкім. Улюбёнцы Бога —
Яны не мелі лаўраў на зямлі,

Хоць і былі да зор бліжэй намнога,
Чым тыя атрымоўцы ўзнагарод,
Што не стварылі добрага нічога.

Ёсць шмат паэтаў, пра якіх народ
Не чуў ні слова, бо яны лічылі
Заўсёды творчасць лепшай з асалод.

Не для таго, каб іх багатварылі, —
Карыснымі зрабіцца для людзей
Яны з намераў лепшых парашылі

І дораць ім агонь, як Праметэй,
Ахвяраваўшы прыжыццёвай славай.
Аддзячана ад іншых балючэй

Іх сэрца будзе дзюбаю крывавай
Сцярвятніка. Прыкутыя да скал,
Яны ўсе плоццю зробяцца дзіравай.

Хай будзе так! Не знікне наш запал,
Бо мы нязменна ў дух уласны верым,
Хай нават ён пакіне футарал.

Ёсць шмат паэтаў, што ў граніце шэрым
Не менш паэзіі ўмясцілі, чым
Яе ў радках, што сказаны Гамерам.

Лёс можна высвеціць мазком адным
І так узняць карціну, што прыдзірам
Здавацца будзе палатно жывым.

А той, хто пакланяецца кумірам,
Па вечных запаветах жыць пачне,
Бо зможа завалодаць сэрцам шчырым

Бог, перастворaны на палатне.
Паэзія, што думкай насяляе
Паветра, чуйных душ не абміне.

Мастак свой поспех з імі падзяляе
І рызыку, бо часта лёс журбой
Яго трыумф бясспрэчны падмяняе.

Стагоддзі, што мігцяць перада мной,
Ізноў мастацтва ўзвысіць будуць рады,
Як Апелес і Фідый[1], над гурмой.

Разбураныя аркі і аркады
Навучаць тыя формы адрадзіць,
Што створаны былі ў часы Эллады.

Аўзонскі дух[2], якога не скарыць,
У рымскіх працах, зробленых рукамі
Вялікіх італьянцаў, будзе жыць!

Мы здзівім свет сваімі купаламі,
Што будуць купал неба падпіраць
Сваімі залачонымі крыжамі.

Хоць Пантэон[3] не хоча паміраць,
Пачнуць твае адноўленыя храмы
Больш за яго паломнікаў збіраць.

Ніхто такой не бачыў панарамы,
Якую будзе мець галоўны з іх[4].
Свае грахі ля гэтай райскай брамы

Пакінуць вернікі краін усіх.
А будзе архітэктарам сабора
Той геній[5], што мастацтвы ўсе спасціг.

Ён высеча разцом таго, хто гора
Адводзіў ад ізраільцян і вёў
З Егіпта іх, пасля ўтаймуе мора

Вялізных і грувасткіх камянёў.
Ягоным пэндзлем перад Судным тронам
Разліты будуць фарбы тых агнёў,

Якія бачыў я над пантэонам
Для грэшных душ. Галоўны п'едэстал
Таксама будзе дзецішчам ягоным.

А ўзнімецца здзяйсненняў гэтых вал
Прароцтвамі паэта-гібеліна,
Якому ў царствах трох сваіх прывал

Давала замагільная краіна.
І будзе гэты жыватворны век —
Як створаная геніем карціна.

Пакуль мячы і беды чыняць здзек,
Бы ў пустцы кедр, які галінкай кожнай
Зрок радуе, паўстане чалавек

Маёй краіны над зямлёй бязбожнай,
Да неба дзіўны водар данясе.
Свае народы доляю трывожнай

Не будуць надзяляць цары, бо ўсе
Разглядваць будуць бюсты і палотны
І біць паклоны створанай красе.

Адчуе сілу іх тыран мярзотны,
Што знішчыць іх збаіцца, і сатрап,
Якога скульптар ці мастак гаротны

У сваёй рабоце ўвекавечыць, каб
Той збыў яе як сімвал ці эмблему
Тым, для каго з нас кожны — божы раб.

Рабы ж павінны несці па бярэму.
Той, хто народу служыць, — не ілот.
А хто манарху прысвяціў паэму

І для яго свой пралівае пот, —
Як камергер, у золата адзеты,
Што кланяецца ўсім каля варот.

О Сіла, што людзей натхняе, дзе ты?
Чаму па шыях схіленых ідуць
Зямныя ўладары, хоць запаветы

Твае такога права не даюць?
Ці ж можна, што пашаны сын славуты,
Каму натхненне духі з неба шлюць,

З кляймом ганебным, зносячы пакуты,
Пляцецца да трыумфу, як жабрак,
Ці на ланцуг залочаны замкнуты?

Калі ж ён з нараджэння не бядняк —
Чаму яму не дазваляюць страсці
З абдымкаў іхніх вырвацца ніяк?

Фларэнцыя! У радасці і шчасці
Я жыў бы зараз, каб не твой прысуд.
Цяпер цябе я вымушаны клясці,

Бо з-за цябе пакінуў родны кут.
І ўсё ж хачу, каб ты жыла багата,
Свабодна, годна і не знала смут,

І зношу ўладу дробных супастатаў,
Якія будуць самым злосным злом,
Пакуль іх крывадушцы, што заўзята

І так паслужліва ім б'юць чалом,
Не скінуць з тронаў. У грахоў смяротных,
Што робяць подласць нашым рамяством, —

У жорсткасці; у сварак; у мярзотных
Учынкаў, што народжаны былі
Ад смерці ў думках цёмных і няцнотных

І славу тых мяшанцаў набылі,
Ў якіх кроў сына з матчынай змяшана;
У рабства, што ўладарыць на зямлі, —

Ёсць правадыр. Ён родны брат султана.
А самы страшны — горшы супастат.
Фларэнцыя! Люблю цябе аддана.

Не раз, як сумны вязень, што з-за крат
Задумаў уначы зрабіць уцёкі,
Ляцеў праз горы да цябе назад

Забыўшы крыўды, дух мой адзінокі,
Каму здаюцца моцнаю турмой
Пагоркі, мора, далягляд шырокі.

Хоць я і выгнаны табой, я твой!
Але дарма ты мне труну рыхтуеш.
Фларэнцыя! Калі дух змрочны мой

Да духаў родных вернецца, адчуеш
Ты сорам, жаль і мой дастойны прах
Труною непатрэбнаю ўшануеш.

Не вернецца мой прах пад родны дах.
О мой народ! Што я зрабіў такое,
Каб грамадзянін твой у скрусе чах?

Як абражае пакаранне злое
Бязлітасных сугараджан былых!
Яны са мной вядуць вайну за тое,

Што не сцярпеў я іх учынкаў злых.
Мне суджана памерці адзінокім,
Прарочым позіркам вачэй сляпых.

Блукаючы ў тым часе недалёкім,
Калі аслепіць Праўда вочы ім,
Дакладна прадказаная прарокам,

І змусіць іх лічыць яго сваім.

---

[1]*Апелес і Фідый — адпаведна старагрэчаскі жывапісец 2-й паловы IV ст. да н. э. ("рыса Апелеса" азначае найвышэйшую дасканаласць) і старагрэчаскі скульптар пачатку V ст. да н. э., стваральнік статуі Зеўса, якую лічаць адным з сямі цудаў свету.*

[2]*Аўзонскі дух — г. зн. італьянскі. Аўзонія — старажытная назва Італіі.*

[3]*Пантэон — помнік старажытна-рымскай культуры (каля 125 да н. э.), "храм усіх багоў".*

[4]*Галоўны з іх — сабор св. Пятра ў Рыме.*

[5]*Той геній — Мікеланджэла Буанароці (1475—1564), італьянскі жывапісец, скульптар, архітэктар і паэт. Байран згадвае асноўныя працы яго: статую Майсея, плошчу Капітолія ў Рыме, грандыёзную фрэску "Страшны суд" на алтары Сіксцінскай капэлы, купал і алтар сабора св. Пятра.*

ЗІМОВЫ ДОЖДЖ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

— Што ўжо здарылася? — спытала Света і голас яе па-здрадніцку задрыжэў. Ніколі не паказвала яна мужу ні сваёй няўпэўненасці, ні слабасці, ні страху. Такі ўжо характар. Але тут адчула нядобрае і забылася на ўсё. Сэрца падказвала, што нешта на яе насоўваецца страшнае, што разаб'е яе жыццё ўшчэнт. А Сяргей усё маўчаў.

— Я ў цябе пытаюся, ці ў каго?

— Кватэры дзялілі, — нехаця прамовіў ён, Света адразу ўсё зразумела. Ёй падалося, што яна ўсё ведала загадзя, мо яшчэ раніцай. Ну, вядома, яна гэта адчула, яшчэ калі барабаніў па даху агідны зімовы дождж.

— Сказалі, што нам жыць ёсць дзе, можам і пачакаць.

— А каму ж... далі?

— Старшыня сказаў, што ў яго шафёраў больш, чым машын, а вось даярку знайсці — праблема. Аднекуль прыедзе... Пэўне ж, блатная...

І тут яе прарвала. Сябе не памятаючы, яна закрычала, як яна ненавідзіць яго, і ягоную хату, і ягоную маці, і як яна праклінае той дзень, калі яго сустрэла... І нешта яшчэ... і яшчэ... і яшчэ... Яна і не заўважыла, што машына ўжо спынілася каля хаты, і апамяталася толькі, калі Сяргей перагнуўся паўз яе, адчыніў дзверку і выпхнуў з машыны. Света змоўкла ад нечаканасці, а ён, прыжмурыўшы вочы, сказаў грэбліва:

— Ты толькі забылася, што я цябе надта доўга не ўгаворваў. Сама падлезла...

Ён брудна вылаяўся і ляснуў дзверцамі. Машына рванула з месца, развярнулася на выгане і знікла ў цемры.

Свякрухі дома не было. Апошнім часам яна часта сыходзіла вечарамі на баптысцкія сходы, хоць баптысткай сябе і не лічыць. Але царква на могілках стаіць напаўразбураная ўжо мо гадоў дваццаць, у райцэнтр дабрацца немагчыма, тым больш на ранішнюю або вячэрнюю службу, і ўсе, хто лічаць сябе праваслаўнымі, звыкла ходзяць у малельны дом, разважыўшы, што Бог жа ўсё роўна адзін, то якая розніца, дзе да яго маліцца.

Света скінула паліто і брудныя боты і імкліва расчыніла кухонную шафку. Адтуль выпала на падлогу ўсё тая ж баначка з-пад ёгурту. Чорныя гарошыны зноў раскаціліся па падлозе, але яна не стала іх збіраць. Ухапіла венік ды замяла пад шафку. Пасля што-небудзь прыдумае. Недзе ў глыбіні шафкі, яна ведала, стаіць трохлітровік з самагонкай. Вось ён, няпоўны. Тым лепш, не так кінецца ў вочы, што з яго адлівалі. Света пашукала вачыма якога посуду і ўзяла кубак, што стаяў каля вядра з вадой. На падлозе ў кутку знайшла слоік з агуркамі. Падкіслі ў цяпле, ды нічога, сыдуць. Наліла больш як палову кубка і, перасільваючы агіду, выпіла да донца. Нічога не адчула, акрамя смуроду ў роце, які заглушыла агурком і рашуча наліла яшчэ, крыху менш, чым першы раз. Цяпер дайсці да ложка і заснуць, пакуль не прыйшла старая, пакуль не прыехаў Сяргей, пакуль... не стала дрэнна ад выпітай гарэлкі. Прыняць са стала слоік яна забылася...

Ноччу зноў ішоў дождж. Света прачнулася вельмі рана, бо моцна балела галава. Яна ляжала і ўспамінала, як лічыўся ў такіх выпадках бацька, і думала, ці стане ёй лягчэй, калі пахмеліцца. Але высветлілася, што свякруха некуды перахавала слоік з самагонкай. Тады Света зноў легла ў ложак і на працу ў гэты дзень не пайшла.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

У роздуме перад самім сабой

З ДЗЁННІКАВЫХ ЗАПІСАЎ

Адзін я з думкамі маімі,
А іншых мне не трэба.
МіколаХВЕДАРОВІЧ

На працягу некалькіх апошніх гадоў, асабліва з таго дня, калі пасля працы ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" пайшоў на пенсію, я, апроч штодзённай творчай працы, як і многія мае калегі па пяры, рэгулярна вяду запісы ў сваім дзённіку. Гэты занятак для мяне не ў навіну. У 1991 годзе выйшла ў свет мая кніга-дзённік "Па слядах маланкі", у аснову якой былі пакладзены запісы з франтавога блакнота.

Зараз у маім пісьмовым стале ляжыць некалькі тоўстых школьных сшыткаў, спісаных дробным почыркам. Гэта штодзённыя запісы аб усім тым, што ўбачана, пачута, прачытана і перажыта. Часта сам-насам перачытваю свае нататкі, і ўзнікае жаданне падзяліцца тым, пра што пішу, са сваімі чытачамі.

Вось некалькі запісаў з апошніх двух гадоў.

1999 г. 16 кастрычніка.

Напісаўся верш, прысвечаны Віктару Пятровічу Астаф'еву — аднаму з выдатных сучасных празаікаў рускай літаратуры, які жыве ў Краснаярску. Такое прысвячэнне ўзнікла невыпадкова. Пачуццё любові і павагі да гэтага пісьменніка ў маёй душы зацяплілася даўно, асабліва пасля таго, як я прачытаў многія яго творы пра Вялікую Айчынную вайну і пасляваеннае жыццё — раманы "Пабітыя і пакараныя", "Сумны дэтэктыў", аповесці "Пастух і пастушка", "Ода рускаму агароду", апавяданні "Ціхая птушка", "Жыццё пражыць", "Ці ясным днём" і іншыя. Калі ўжо я быў добра знаёмы з творчасцю гэтага пісьменніка, чытаў і перачытваў яго творы, з вялікай радасцю даведаўся, што ў час вайны ў 1943 і 1944 гадах мы знаходзіліся на суседніх франтах — ён на І-м Украінскім, я — на І-м Беларускім, якія разам фарсіравалі Днепр і, працягваючы наступленне, вызвалялі дзве братнія рэспублікі — Украіну і Беларусь. Як высветлілася потым, часці, у якіх мы служылі, былі недалёка адна ад адной. Малодшы афіцэр Віктар Астаф'еў быў паранены ў адным з баёў, як і аўтар гэтых радкоў, але мы не выходзілі са строю, працягвалі змагацца да перамогі. Сёння Віктар Пятровіч з'яўляецца лаўрэатам некалькіх літаратурных прэмій, яго творы вядомы не толькі чытачам Расіі, але і многіх іншых краін.

Даведаўшыся аб усім гэтым, не так даўно я напісаў у Краснаярск ліст Віктару Пятровічу і паслаў яму сваю кнігу франтавой прозы "Па слядах маланкі", напісаўшы на тытульным лісце сваё шчырае прызнанне ў любові і павазе да яго і яго творчасці. У хуткім часе я атрымаў па пошце ад яго тоўсты пакет. Разгарнуў і сэрца забілася ад незвычайнай радасці. Гэта была дакументальная аповесць Віктара Астаф'ева "Зрячий посох", якая нядаўна выйшла асобнай кнігай. Яна цалкам прысвечана жыццю і дзейнасці вядомага рускага літаратурнага крытыка і даследчыка рускай прозы, паэзіі Аляксандра Мікалаевіча Макарава. Калі я прачытаў гэту аповесць, перада мной раскрыліся яшчэ новыя і новыя старонкі нашай баявой і творчай дружбы.

Справа ў тым, што Аляксандр Макараў доўгі час, з дня заснавання ў Маскве Вышэйшых літаратурных курсаў пры Саюзе пісьменнікаў СССР, працаваў на іх выкладчыкам, кіраваў семінарам прозы і паэзіі. А Віктар Астаф'еў, як і я, быў яго непасрэдным вучнем — мы ж абодва вучыліся на гэтых курсах, толькі ў розныя гады — я ў першым наборы, Астаф'еў крыху пазней. І ён расказвае ў сваёй кнізе не толькі пра прафесійную працу вядомага крытыка і даследчыка, а малюе яго як чалавека з вялікай, багатай душой, разумнага настаўніка і дарадцу. У іх — настаўніка і курсанта — узнікла моцная творчая дружба, якая звязвала іх непарыўнымі каранямі жыццёвых і творчых імкненняў. Яны перапісваліся, наведвалі адзін аднаго ў розных мясцінах вялікай Расіі. Ну а ў нас таксама ўзнікла перапіска, абмен кнігамі. Мая дамашняя бібліятэка значна папоўнілася творамі майго былога франтавога і сённяшняга сябра.

Вось чаму я не мог не напісаць і не прысвяціць яму верша, у якім выказаў сваё пачуццё любові і павагі да гэтага цудоўнага пісьменніка.

Былі далей мы ад наменклатуры,
Жылі адной навукаю сваёй,
Вучыліся служыць літаратуры,
А больш таму, каб не хлусіць у ёй...

Ёсць у вершы яшчэ радкі, якія напісаны ад усяго сэрца. І я магу толькі ганарыцца тым, што маю лісты і кнігі ад выдатнага майстра сучаснай рускай літаратуры.

10 ліпеня

Ведучы дзённікавыя запісы, трэба імкнуцца браць прыклад з Янкі Брыля, у якога кожная, нават самая маленькая нататка, кожная заўважаная ім дэталь у жыцці, адносінах паміж людзьмі, кожны малюнак прыроды — маленькая паэма, прытым шчырая, сардэчная, з глыбокім пачуццём, лірызмам і думкай.

Прыгадваюцца радкі пісьменніка, перапісаныя мной у свой сшытак яшчэ ў 1980-м годзе:

"Як гэта цяжка — быць беларускім пісьменнікам у нашай мелкай, бесхрыбетнай правінцыі, у блакадзе моўнага бар'ера, без роднага дома, які ёсць у літоўцаў, армян, эстонцаў. У іх жа няма майго, нашага пачування: як пад нагамі абсоўваецца бераг, як звужаецца кола чытачоў, як мова адыходзіць..."

Прайшло дваццаць гадоў з дня, калі я перапісваў гэтыя радкі. А што змянілася ў нашым жыцці? А нічога. Як забралі Дом літаратара ў пісьменнікаў, так і не збіраюцца вяртаць. Пагаворваюць, што гэта будзе Палац для ўсіх Муз — і для паэтаў, і для кампазітараў, і для мастакоў, і нават для кінематаграфістаў. Ну і як будуць праводзіцца нарады, сходы, пасяджэнні? Хто задумвае зрабіць такую суполку? Было ж, на мой асабісты погляд, нядрэнна, калі пры Зуёнку і Паўлаве асобныя пакоі здавалі пад арэнду, за гэта атрымлівалі нейкія сродкі, тых сродкаў хапала, каб аказаць дапамогу некаторым пісьменнікам і пры жалобных падзеях зрабіць пахаванне за дзяржаўны кошт. А цяпер кожная ўдава адышоўшага ў нябыт мужа, ці маці памерлага сына павінны збіраць апошнія грошы, каб заказаць труну нябожчыку. Так думаю не толькі я адзін. Такое хваляванне ёсць ува ўсіх пісьменнікаў, з якімі мне даводзілася гутарыць на гэтую тэму.

Хвалюешся на кожным кроку сённяшняга жыцця. Вось прачытаў сёння ў артыкуле члена-карэспандэнта НАН РБ Валянціна Канстанцінавіча Лукашова, змешчаным у "ЛіМе": "Знаходзяцца сілы, якія ці то з кар'ерных меркаванняў і жадання дагадзіць чыноўнікам суседняй краіны, што па ўласнай дурноце і невуцтве гатовы ісці на любое самаўніжэнне і прадстаўляць беларусаў другасортным недаразвітым рускім племенем..."

Вучоны мае рацыю. Ён жа гаворыць пра тых "беларусаў", якія не паважаюць не толькі роднай мовы, а наогул культуры, гісторыі свайго народа, не ведаюць і не хочуць ведаць, дзе карані іх радаслоўнай, адкуль і калі заіснавалася Белая Русь як самастойная дзяржава.

Я не палітык, маё прызванне — пісаць пра тое, што сам зведаў і перажыў. Шмат у мяне ёсць публіцыстычных твораў на розныя тэмы. Але аднойчы ў сяброўскай размове Васіль Сёмуха, з якім я разам працаваў у выдавецтве "Мастацкая літаратура", сказаў мне: "Я вас, Пятро Фёдаравіч, ведаю больш як лірыка". Гэтыя словы я ўспрыняў як самую лепшую пахвалу. І вось пасля прачытання заўваг вучонага ў адрас многіх нашых чыноўнікаў і ў мяне сёння ж пачалі складвацца такія паэтычныя радкі:

Кожны школьнік ведае прыкметы,
Чаму зоры свецяць над Зямлёй,
І чаму Зямля праз даль Сусвету
Па арбіце круціцца сваёй.

Прыкмячаем — калі сеяць зерне,
Налівацца ў полі каласам,
Калі сонца на зіму паверне,
Шапкі снегу выкрые лясам.

Ведаем, як журацца дубровы,
Калі вецер зашуміць вакол.
А ці знаем, чаму роднай мовы
Не чуваць у першых класах школ?

Нашы сэрцы поўняцца адчаем,
Што не чуем добрых мы парад.
І зусім таго не прыкмячаем —
Як ідзе культура ў нас на спад.

Галілей не прагнуў гучнай славы
На парозе адкрыцця свайго.
О, каб нашым лідэрам дзяржавы
Хоць часцінку позірку яго!

2000 г. 25 мая.

Май месяц для мяне заўсёды звязаны з успамінамі пра май 1945-га. Не забыць ніколі, як больш паўвека таму назад вяртаўся я з вайны на сваю малую радзіму, у родную вёску, што па-над Бесяддзю каля самага Хоцімска. Але па шляху дамоў завітаў зноў у той кут прыгожай украінскай зямлі Валыні, дзе развітваўся з цудоўнай дзяўчынай Антанінай Рыгораўнай Цішчук. Я яе не застаў у вёсцы Радуў, што ў васемнаццаці кіламетрах ад Роўна: яе бацькі і малодшы брат загінулі ад рук якіхсьці ўнутраных ворагаў пасля ўжо таго, як уся наша савецкая зямля была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Антаніна якімсьці цудам змагла ўцячы ад ашалелых забойцаў і аказалася далёка ад родных мясцін — ажно ў горадзе Ташаузе Туркменскай Рэспублікі. Мне вельмі балюча было перажываць ростань з гэтай цудоўнай дзяўчынай. І тады ж, у пасляваенныя майскія дні, склаліся ў маім сэрцы першыя вершаваныя радкі, якія праз некаторы час стануць пачаткам новай, для мяне самай дарагой, паэмы "Вішнёвы агонь". А ў 1963 годзе яна выйдзе асобнай кнігай пад аднайменнай назвай і пра яе напіша добрую рэцэнзію Антон Пятровіч Бялевіч.

Бялеюць хаты ў ціхіх вёсках,
Сады мяцеляцца наўкол,
І ціха падаюць пялёсткі,
Нібы гусіны пух на дол.
Віецца сонечнай раўнінай
Бальшак — разблытаны клубок.
Ля вокан кожнае хаціны
Гарыць вішнёвы аганёк... і г. д.

Трэба было пабываць на Валыні — незвычайна прыгожым кутку ўкраінскай прыроды, перажыць радасць сустрэчы і цяжкі смутак развітання з дарагім чалавекам, — каб напісаць гэтыя радкі, гэты лірычны твор. Да канца майго жыцця ён будзе для мяне самым дарагім. І не толькі таму, што першыя радкі яго нараджаліся ў маі.

2 чэрвеня.

Напісаў ліст свайму даўняму знаёмаму — добраму нашаму пісьменніку, празаіку і паэту — Міколу Сямёнавічу Купрэеву, які жыве ў Пружанах. Выказаў яму свае ўражанні і чытацкае захапленне ад яго аповесцяў "Паэт з вуліцы Карла Маркса", "Палеская рапсодыя", "Светлае імгненне" і наогул ад яго творчасці. Большасць напісанага ім было апублікавана ў часопісе "Крыніца", які я рэгулярна чытаю. Усе напісаныя Купрэевым аповесці чытаў з незвычайнай цікавасцю: яны прыцягваюць увагу не толькі цікавымі сюжэтамі, зместам, а найперш добрай сакавітай беларускай мовай, сваім стылем, мастацкасцю і вобразнасцю думак, апісаннем роднай прыроды, як і ў Янкі Брыля, Віктара Казько, іншых сапраўдных майстроў мастацкага слова. Мікола Купрэеў добра ведае матэрыял, які кладзе ў аснову пісьма, усё бачыць і заўважае сваімі вачыма, гаворыць аб усім так, як можа сказаць толькі ён і ніхто іншы. А гэта галоўная якасць кожнага цікавага пісьменніка. Не ведаю, што адкажа на маё пісьмо калега па пяры. І ці адкажа? Я ж толькі парадаваўся яго творчым удачам, як радуюся кожнаму добраму прачытанаму вершу, паэме ці новаму раману ў нашай літаратуры.

2001 г. 22 студзеня.

Адзначалі Хрышчэнне Хрыстова. Прызнацца, і я перастаў быць заядлым атэістам. Прыгадваю дні свайго маленства і юнацтва, калі дзед і бабуля расказвалі, як мяне хрысцілі ў Хоцімскай царкве, што стаяла побач з нашай вёскай, затым падлеткам і ў час вучобы ў пачатковай школе хадзіў разам з дзедам у тую ж царкву да прычасця, маліўся разам з ім за ўпакой роднай маці Марыі Яўхімаўны, ставіў свечкі Святой Багародзіцы. Уступленне ў піянеры, затым у камсамол і ў партыю адхілялі ад праваслаўнай веры. І тут нічога ніхто не мог зрабіць супраць.

А сёння склаўся верш пра мае маладыя гады, якія былі так даўно.

Быў фронт. Вячэрняя зара
Ўзыходзіла з-за перавала.
Салдацкай сталасці пара
Маю душу перапаўняла.

Хоць перад боем навіду
Ў сяброў я не маліўся Богу, —
Ды ведаў жа — куды іду
І верыў у сваю дарогу.

Я тою самаю парой
З упэўненасцю, цвёрдай верай
Ўкручваўся ў вайсковы строй
Спіной назад, грудзьмі наперад.

А вось цяпер у нашы дні,
Калі прысніцца зноўку мама,
Хачу да новай вышыні
Прыйсці пад крыж святога храма.

6 сакавіка.

Сёння з рэдакцыі часопіса "Крыніца" пазваніў яго супрацоўнік паэт Леанід Галубовіч і паведаміў мне, што ў апошнім, 6-м нумары змешчаны мой верш "Дзве Марыі". Хоць гэты твор і праляжаў доўга ў партфелі рэдакцыі, але ўсё ж знайшлося яму месца на старонках гэтага цікавага часопіса для нашай моладзі. Яго чытаюць і людзі старэйшага пакалення, бо ў ім часта змяшчаюцца класічныя творы сусветнай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову. Асаблівую цікавасць выклікаюць пераклады з нямецкай Васіля Сёмухі. Але я пра тое, як быў узрадаваны званку маладзейшага сябра па пяры, яго ўважлівасці да мяне.

З Леанідам Галубовічам у нас якаясьці ўзаемная павага адзін да аднаго. Ён заўсёды адгукваецца на мае лісты, не пакідае без увагі ніводзін твор, які я прапаную часопісу; калі што не пойдзе ці будзе надрукавана — ён абавязкова пазвоніць, скажа ўсё, што трэба.

Я здагадваюся — чаму ў малодшага сябра такія шчырыя і сардэчныя адносіны да старэйшага. Ён мяне ў адрозненне ад некаторых іншых маладых людзей паважае як былога воіна-франтавіка, часта ўспамінае ў сваіх нататках. І хоць ён мне аднойчы сказаў, што больш не будзе пісаць вершаў, я гэтаму не магу паверыць. У яго яшчэ, як гаворыцца, шмат пораху ў парахаўніцах. І многія яго кнігі паэзіі ўвайшлі ў скарбніцы беларускай літаратуры. Ён напэўна ж добра помніць, як я асабіста прапаноўваў да друку яго першыя вершы, калі працаваў літаратурным кансультантам у адной з мясцовых газет. Ужо тады ён сваімі таленавітымі творамі звярнуў на сябе ўвагу многіх чытачоў.

Але сёння ў мяне ўзнікла асаблівая прычына ўспомніць пра гэта. Днямі ў сваіх "Зацемках з левай кішэні" Леанід Галубовіч напісаў такія радкі: "Мабыць, мала хто адразу, знаскоку паверыць мне, калі я скажу, і сам тое выпадкова адкрыўшы: што рэдактарам першай кнігі, тады апальнага, сёння ўслаўленага Алеся Разанава "Адраджэнне" (1970) быў паэт-франтавік Пятро Прыходзька". І заканчвае гэтую сваю нататку Галубовіч чамусьці працяжным гукам пад пытальнікам і клічнікам "А-а-а!?"

Чаму ж тут здзіўляцца, дарагі Лёня, і гаварыць: "мала хто паверыць". У канцы сямідзесятых гадоў, працуючы ў выдавецтве "Беларусь", я рэдагаваў шмат якія кнігі нашых паэтаў — старэйшых і маладзейшых. Не раз трэба было прабіваць сцяну, якая ўзнікала на шляху выдання кніг з боку тагачаснага Галоўліта, аддзела прапаганды ЦК КПБ і іншых уладных структур. Я ўжо згадваў, як раскідвалі ў друкарнях набраныя ўжо кнігі Уладзіміра Караткевіча. А мне асабіста даводзілася адстойваць у Галоўліце разам з аўтарам зборнік вершаў Пімена Панчанкі "Снежань". У адным з вершаў, напрыклад, былі такія радкі: "Адны прарастаюць зялёнай травой, другія глінянай галавой". Каму яны перашкаджалі, каб дайшла да чытача тая праўда, якая існавала і існуе вечна ў адносінах да ўслаўлення асобных людзей? А знаходзіліся ж усюды людзі, якія чынілі перашкоды перад чалавечай праватой.

Вось яшчэ характэрны прыклад таго, дарагі мой сябар Лёня Галубовіч, як аўтар гэтых радкоў атрымаў строгую вымову на пасяджэнні Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР за рэдагаванне кнігі паэзіі Анатоля Вярцінскага "Чалавечы знак" у 1968 годзе. У прынятай пастанове было запісана па настойванні самога старшыні камітэта Р. В. Канавалава: "Рэдактару кнігі А. Вярцінскага "Чалавечы знак" паэту Пятру Прыходзьку аб'явіць вымову за палітычныя памылкі, дапушчаныя ім пры рэдагаванні гэтай кнігі". А намеснік Канавалава Анатоль Барушка (я добра запомніў) на тым жа пасяджэнні сказаў: "Я сам здзіўляюся, як гэта паважаны Пятро Фёдаравіч — былы палітрук роты — мог прапусціць такую кнігу!.." Вось як было.

(Працяг на стар. 14—15)

ЧАСАПІС

"Жыў на свеце дзед Васіль..."

Пад такой назвай у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася выстава, прымеркаваная да 90-годдзя з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка, майстра паэтычнага слова, публіцыста, перакладчыка, педагога Васіля Віткі. Семнаццаць гадоў Васіль Вітка быў галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса "Вясёлка". І на адкрыццё выставы сённяшняя рэдакцыя "Вясёлкі" прыйшла амаль у поўным складзе: Уладзімір Ліпскі, Тамара Тарасава, Мікола Чарняўскі, Мікола Маляўка. Яны дзяліліся сваімі ўспамінамі пра Васіля Вітку, чыталі яго творы і ўласныя. Тамара Тарасава для маленькіх гасцей музея, вучняў пачатковых класаў мінскіх школ, зрабіла невялікае падарожжа ў свет загадак і лічылак Васіля Віткі. З вялікай ахвотай і зацікаўленасцю адказвалі дзеці на пытанні. Так адбылося першае знаёмства з творчасцю пісьменніка. Потым усе разам адправіліся да яго ў госці — пайшлі глядзець экспазіцыю. Фотаздымкі, дакументы, кнігі, часопісы, мэбля, асабістыя рэчы — усё прадстаўленае на выстаўцы — архіў пісьменніка, які перадала музею дачка Наталля Цімафееўна Гаўрылавец. На жаль, няма ўжо з намі Цімоха Васільевіча, аднак жывуць яго цудоўныя творы. Не адно пакаленне маленькіх чытачоў вырасла на казках, пацешках, загадках, лічылках Васіля Віткі — дзеда Васіля.

Некалькі нумароў дзіцячага часопіса "Вясёлка" размешчана ў вітрыне. Побач з імі стаіць сам Вася Вясёлкін (прыгожая лялька), які можа правесці нашых маленькіх наведвальнікаў па "кватэры" Васіля Віткі, паказаць любімыя кнігі, рэчы пісьменніка, прачытаць яго загадкі і вершы. Ёсць тут і фотаздымак — дзед Васіль разам з Васем Вясёлкіным працуюць над чарговым нумарам часопіса.

У экспазіцыі стаіць пісьмовы стол, за якім наш вядомы казачнік пісаў свае творы, побач кійкі, з якімі любіў вандраваць, у куточку таршэр і мяккае крэсла — відаць, тут адпачываў дзед Васіль, праглядаў газеты, часопісы, а магчыма, перачытваў тое, што напісаў для сваіх маленькіх сяброў.

Выстаўка невялікая, але вельмі добрая і шчырая. Музей запрашае ўсіх — і маленькіх, і дарослых у госці да Дзеда Васіля, на сустрэчу з героямі яго твораў.

Вольга ГУЛЕВА

Ежы Гедройц і Беларусь

Значную частку чарговага, чацвёртага-пятага нумара бюлетэня "Кантакты і дыялогі" займаюць матэрыялы, аб'яднаныя тэмай "Ежы Гедройц і Беларусь". У артыкуле "Мысліцель, які прадбачыў будучыню", што адкрывае нумар і падпісаны "Рэдкалегія", гаворыцца: "Ёсць людзі, якім дадзена прадбачыць хаду гістарычных падзей. Ведаючы мінулае, асэнсоўваючы сучаснасць, яны могуць зірнуць у будучыню. Сучаснікі, што жывуць толькі днём сённяшнім часта не разумеюць іх, абвяшчаюць ворагамі, здраднікамі. Так было з ураджэнцам Мінска, прадстаўніком старажытнага беларуска-літоўскага роду Ежы Гедройцам. Апынуўшыся ў шэрагах польскай паваеннай эміграцыі, рэдагуючы пад Парыжам знакаміты штомесячнік "Культура", ён павінен быў бы заклікаць суайчыннікаў да чарговага "крыжовага паходу" на ўсход, каб вярнуць "крэсы". А ён заклікаў да зразумення тых народаў, якія там жывуць — беларусаў, літоўцаў, украінцаў. Прадбачыў адраджэнне іх дзяржаўнасці, падтрымліваў іх вызваленчыя памкненні". Памяці Е. Гедройца быў прысвечаны Міжнародны "круглы стол" "Ежы Гедройц і Беларусь". Арганізаваны Польскім інстытутам у Мінску, Таварыствам апекі над Архівам Літаратурнага інстытута ў Парыжы і Грамадскім аб'яднаннем "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў", ён праходзіў 22 лютага сёлетняга года ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Ф. Скарыны. Частка матэрыялаў з гэтага "стала" і апублікавана: "Памяці апошняга грамадзяніна Рэчы Паспалітай многіх народаў" М. Гедройца, "Ежы Гедройц і беларуская перспектыва Л. Уладыкоўскай-Канаплянік", "Ежы Гедройц і посткаланіяльнае мысленне" І. Бабкова, "Будзем яго паслядоўнікамі" Т. Нягодзіша, "Беларуская тэматыка на старонках "Культуры" І. Тамільчык, "Ежы Гедройц у беларускім друку" В. Грышкевіч, "Рэгіянальная культура Смаргоншчыны ў бачанні польскага празаіка Збігнева Жакевіча" Т. Кляшчонак, "Край" прымае выклік "Культуры" Я. Іванава, "Захаваем гістарычныя сядзібы" І. Барчанкі. Прадстаўлены ў нумары і іншыя публікацыі: "Пабудова інфармацыйнага грамадства ў Беларусі: мара ці рэальнасць" А. Градзюшкі, "Трэба ехаць!" Я. Запрудніка (насустрач з'езду беларусаў свету). Ёсць падборкі "Рэцэнзуем кнігі", "Надрукавана пра кантакты ў Беларусі і ў свеце".

Кантрамарка ад дзядзькі Валодзі

З УСПАМІНАЎ

Ён пасяліўся пасля вайны з жонкай і двума дзецьмі якраз у тым самым доме, дзе асталяваліся мае бацькі. У суседнім пад'ездзе. На старой іржавай шыльдачцы з назваю вуліцы можна было яшчэ прачытаць: "Лагойскі гасьцінец". Менавіта так — з мяккім знакам пасля "с". Не бачыліся мы гадоў з дзесяць. Можа, нават крыху болей. Тым не меней я адразу пазнаў у мажным мужчыне таго самага артыста, які некалі, да вайны яшчэ, выконваў ролю Пана ў бацькавай "Цудоўнай дудцы". Прэм'еру іграліў памяшканні Чырвонага касцёла, дзе тады месціўся зусім яшчэ малады Беларускі тэатр юнага гледача. Пан, памятаю, быў злосны, бязлітасны. Але я, седзячы ў першым ад сцэны радзе, па-дзіцячы западозрыў, што гэта толькі гульня. Акцёрская гульня. Бо з-пад калматых броваў глядзелі добрыя шэрыя вочы, якім ніяк не ўдавалася набыць злосны выраз. А цяпер, без панскага кунтуша, без грозных вусаў і броваў, у цывільным, ладна паношаным шэрым гарнітуры, чалавек выглядаў дабраком з дабракоў.

—Добры дзень, Алік, — павітаўся ён са мною, называючы мяне імем, да якога я прывык змалку. І я адказаў так, як прызвычаіўся яшчэ здаўна:

—Дзень добры, дзядзька Валодзя!

Вусны ягоныя расплыліся ў задаволенай усмешцы:

—Бач ты, не забыўся пра нашыя завядзёнкі. А я думаў: і па-беларуску гаварыць ужо развучыўся. У вас жа, на флоце, свая мова: палундра, віра, майна...

Запас марской тэрміналогіі ў яго, відаць, скончыўся, і ён зноў пасур'ёзнеў:

—Ты ў адпачынку ці зусім ужо?

—У адпачынку, — сумнавата адказаў я, але тут жа дадаў больш бадзёра: — Аднак неўзабаве зусім вярнуся.

—Гэта ж амаль дзесяць гадоў на флоце, — нават прысвіснуў ён.

—Амаль дзесяць, — пацвердзіў я.

—А што рабіць будзеш на сушы?

—Як не ўладкуюся дзе ў рэдакцыю, падамся ў Гродню. Боцманам наймуся ў параходстве, — бяспечна адказаў я. Такая задумка ў мяне сапраўды была і здавалася нават адной з самых верагодных.

—Ну, гэта яшчэ пабачым, — засмяяўся ён. — Чытаў твае вершы ў "Бярозцы", у "Чырвонцы"...

І раптам памяняў тэму:

—У цябе на заўтра нічога не запланавана?

—Нічога, — пацінуў я плячыма.

—Ну, дык вось, — ён дастаў з нагруднай кішэні невялікую блакітную паперчыну, — гэта табе кантрамарка. У тэатр імя Янкі Купалы. Далучайся да мастацтва, пляменнічак!

Увечары, па-святочнаму прыбраны ў чорную мічманскую тужурку з залатымі якарамі на лацканах, у бялюткай кашулі пад чорным гальштукам, я не без пэўнай боязі набліжаўся да ўваходу ў тэатр. Але ўсё было добра. Нават дапамаглі месца знайсці паважныя і ветлівыя білецёркі. Відаць, роспіс на кантрамарцы меў для іх нейкую сілу.

Адным радам паперадзе мяне, крыху наўскос і направа, я ўгледзеў знаёмую з далекаватых гадоў маленства постаць. Невысокага росту чалавек з аблыселай галавой, пукатымі вачыма з ружовымі прожылкамі на бялках аглядаўся па баках, шукаючы некага ў публіцы.

Раптам пагляд ягоны прыпыніўся на мне. На нейкі момант на змаршчыністым твары адбілася здзіўленне.

—Ці не сын Вольскага?

—Так...

—Той самы, што ў Падблоні з намі таптуху па затоцы цягаў?

—Той самы...

—Ледзь пазнаў, — ён пацягнуўся рукой цераз рад, каб павітацца са мной. — А ты? Ці пазнаў мяне?

—Андрэй Александровіч, — упэўнена адказаў я. І як было не пазнаць!.. Яго тады ад той самай таптухі і забралі...

—Малайчына, — пахваліў ён і дадаў, крыху спахмурнеўшы: — А некаторыя нават і прызнавацца не хочуць...

На спектакль ён прыйшоў таксама па кантрамарцы. І таксама — ад дзядзькі Валодзі. І толькі тут я, да вялікага свайго сораму, даведаўся, што дзядзька Валодзя — Уладзімір Мацвеевіч Стэльмах — дырэктар гэтага самага тэатра. Тэатра, які носіць імя Янкі Купалы. Лепшага, можна сказаць, драматычнага тэатра Беларусі. З матчыных лістоў я ведаў, што амаль праз год, як я пайшоў на вайсковую службу, ва Уральск прыехаў адкліканы з арміі Уладзімір Стэльмах. Ён і стаў дырэктарам Другога Беларускага драматычнага тэатра, які знаходзіўся ў эвакуацыі і ў якім я пэўны час рабіў за памочніка мастака. На ягоную долю выпала перавозіць тэатр у Арэхава-Зуева, што ў Падмаскоўі, а потым і ў родны для тэатра Віцебск. Неўзабаве Уладзіміра Мацвеевіча перавялі ў Мінск і даручылі ўзняць з руінаў, амаль стварыць нанова тэатр оперы і балета. А цяпер...

Нечаканая навіна ўзрадавала мяне.

Да пачатку спектакля заставаліся лічаныя хвіліны. Я паспеў толькі даведацца ў Андрэя Александровіча, што працуе ён у рэдакцыі аўтазаводскай ці трактаразаводскай, не памятаю дакладна, шматтыражкі. Пацікавіўся, ці ёсць у рэдакцыі вакансіі, на што ён з даволі сумнай усмешкай, па знаёмай мне здаўна звычцы крыху скасабочыўшы галаву, адказаў:

—У хуткім часе будуць...

Святло ў зале згасла. Пачынаўся спектакль...

Паказвалі "Рамэа і Джульету". Шчыра прызнаюся, напачатку мяне трошкі бянтэжылі хрыплаваты голас Рамэа — Барыса Платонава і не зусім юны выгляд Джульеты — Ірыны Ждановіч. Але праз колькі хвілін я ўжо ўвесь быў ва ўладзе сцэны...

Пасля спектакля падзяліўся сваімі першапачатковымі сумненнямі і далейшымі ўражаннямі з дзядзькам Валодзем. Ён засмяяўся:

—Дык гэта ж, хлопча, і ёсць адзнака высокага майстэрства, сіла мастацкага пераўвасаблення...

Ён яшчэ шмат чаго гаварыў. Але я не ўсё запомніў. Занадта навукова здавалася мне сёетое. І што ж тут дзіўнага? Са мной гутарыў тэатразнаўца...

Ці шмат прамінула часу з тае пары, ці мала, але аднаго разу ў тым самым двары зноў сустракаюся з дзядзькам Валодзем.

—Ну што, пляменнічак, прывыкаеш да цывільнага жыцця?

—Амаль прывык ужо.

—Вось і добра, — ён узяў мяне пад руку і адвёў крыху ўбок, быццам хацеў паведаміць нешта надзвычай важнае, нават таемнае. — Ці ведаеш ты, што ў Мінску новы тэатр вось-вось адкрыецца?

—Новы тэатр? — здзівіўся я.

—А яшчэ журналіст, — папракнуў ён і дадаў зусім сур'ёзна: — Тэатр юнага гледача!

—Ён жа быў некалі! — успомніў я. — І вы яшчэ Пана іграліў "Цудоўнай дудцы"...

—Быў, — задаволена згадзіўся ён. — І пана іграў. А цяпер — новы будзе. Ужо і дырэктар прызначаны...

—Вы?! — само сабой вырвалася ў мяне.

—Я, — амаль урачыста пацвердзіў ён.

—А галоўны рэжысёр? — пацікавіўся я.

—І галоўны рэжысёр ёсць, — адказаў Уладзімір Мацвеевіч. — Любоў Іванаўна Мазалеўская. Ты павінен ведаць яе. Па Віцебску.

Так, сапраўды, я ведаў Любоў Іванаўну. Перад самай вайной, займаючыся ў Віцебскай мастацкай вучэльні, даволі часта наведваў тэатр. Бачыў Мазалеўскую і на сцэне і ў жыцці. Не заўважыць, не запомніць яе было немагчыма. Асабліва ўразіла мяне тады ейная Любоў Яравая ў аднайменным спектаклі па п'есе К. Транёва.

—Дык Мазалеўская ў Мінск пераехала? — зноў прадэманстраваў я сваю недасведчанасць.

—А ты і не ведаў? Разам з Паўлам Малчанавым. Памятаеш яго?

Паўла Сцяпанавіча я таксама добра памятаў. У той самай "Любові Яравой" ён іграў паручніка Яравога.

А Уладзімір Мацвеевіч працягваў:

—Ён у купалаўскім працуе, а яна ў рэжысуру падалася. Прыходзь на адкрыццё тэатра, — сказаў мой старэйшы сябар на развітанне.

—Куды?

—У былы Палац піянераў. Там ужо рамонт канчаецца. — І дадаў: — А можаш хоць сёння ці заўтра ў клуб хлебазавода прыходзіць, дзе мы пакуль што рэпеціруем...

З таго часу і пачалося маё працяглае сяброўства з Беларускім рэспубліканскім тэатрам юнага гледача. Я стараўся не прапусціць ніводнай прэм'еры, быў у курсе ледзь не ўсіх тэатральных спраў. Некалькі разоў Уладзімір Мацвеевіч

У роздуме перад самім сабой

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 13)

А якія ж "памылкі" дапусціў я разам з аўтарам кнігі? Толькі тыя, што ў кнізе былі змешчаны дзве цудоўныя паэмы "Зазер'е" і "Дажынкі" пра жыццё беларускіх сялян у нашы пасляваенныя гады. Асабліва не падабалася чыноўнікам ад наменклатуры паэма Анатоля Вярцінскага "Дажынкі", у якой апавядалася пра старую жанчыну-калгасніцу, якая ў час жніва памірала на полі ад знямогі, ад голаду, а старшыня калгаса гаварыў ёй: "Чаго ты прыдурваешся, кабета".

Пройдзе нейкі час, і кніга Анатоля Вярцінскага "Чалавечы знак" будзе ацэнена літаратурнай крытыкай і шматлікімі чытачамі як адна з лепшых у пасляваеннай беларускай паэзіі. У ёй аўтар закрануў глыбокія карані, на якіх трымалася (ды і трымаецца цяпер) наша сельская гаспадарка, якая беднасць і безвыходнасць існуюць у многіх калгасах, дзе людзі амаль нічога не атрымліваюць за сваю непасільную працу. Гэтую тэму ў тыя ж часы закрануў яшчэ адзін вядомы пісьменнік Аляксей Кулакоўскі ў сваёй аповесці "Дабрасельцы". Але і яго спасціг цяжкі лёс: ён быў зняты з работы, адхілены ад пасады галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць".

Вось так было, дарагі мой малодшы сябар Леанід Міхайлавіч! Ты мог бы пра гэта даведацца толькі ад старэйшых пісьменнікаў, бо тады ты яшчэ быў зусім малым хлапчуком і многага чаго не ведаў. Цяпер наша моладзь павінна ведаць пра ўсё, што перажылі, вынеслі ў сваіх сэрцах і на сваіх плячах іх дзяды і бацькі, але не толькі ведаць, а і рабіць усё, каб больш тое блюзнерства, тая коснасць у жыцці не паўтарыліся ніколі.

10 сакавіка.

Зноў вяртаюся да часопіса "Крыніца", які перачытваю амаль увесь, як гаворыцца, ад коркі да коркі. Вялікую цікавасць выклікалі больш, шырэй прадстаўленая ў часопісе творчасць цудоўнага беларускага паэта Аркадзя Маркаўкі і выказванні аб ім многіх нашых пісьменнікаў, а таксама невялікая аповесць калумбійскага пісьменніка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі Гарсія Габрыэля Маркеса "Крывавы след на снезе" ў добрым перакладзе з іспанскай Валерыя Буйвала. Прыцягвае ўвагу і вялікая падборка вершаў Ганада Чарказяна ў цудоўным перакладзе з курдскай Рыгора Барадуліна. Апошні і ў перакладах з розных моў паказвае сваё сапраўднае майстэрства, як і ў арыгінальных творах.

Усё гэта вельмі добра. Але вось адна публікацыя ў гэтым нумары часопіса выклікала ў мяне проста непаразуменне. У раздзеле "Анкета", дзе розныя пісьменнікі выказваюць свае ўражанні і даюць ацэнкі прачытаным творам, кнігам сваіх калег па пяры, ёсць такі запіс:

"Адмоўнай з'явай лічу выхад у свет кнігі Я. Хвалея накладам 11 тыс. (?) "Пра наступствы наркаманіі сярод падростаў". Кніжка бяздарная і бязглуздая, як і паэтычныя кніжкі таго ж аўтара, як і ўся творчасць гэтага пісьменніка". Гэта напісаў намі ўсімі паважаны, таленавіты празаік Юры Станкевіч. Я не хачу з ім спрачацца. У кожнага ёсць і павінна быць свая думка адносна творчасці іншых. Але, мне здаецца, такія словы, як "бязглуздая і бяздарная", трэба даказваць канкрэтнымі фактамі і прыкладамі з кнігі, якую крытыкуеш.

У ацэнцы Юрыя Васільевіча, на жаль, гэтага няма, ёсць толькі агульныя абвінавачванні ў адрас аўтара кнігі. І мне захацелася выказаць сваю нязгоду з такой ацэнкай. Я звярнуўся да адной з кніг Яўгена Хвалея "Квадры памяці", якая знайшлася ў маёй дамашняй бібліятэцы, перачытаў яе і пераканаўся, што яе аўтар не такі ўжо "бяздарны" паэт. У яго ёсць шмат добрых вершаў, напісаных шчыра, сардэчна, са сваім вобразным мысленнем. Вось некалькі радкоў з верша "Маладзік":

Маладзік... Яшчэ не ветах...
Лёс, мяне не абдзялі...
Дай адчуць мне болі веку,
Дай спазнаць мне праўду веку
На маёй святой зямлі.

Мне здаецца, пасля такога верша нельга называць паэта бяздарным. У той жа кнізе Яўген Хвалей піша: "Пры жыцці любіце чалавека... Любіце, пакуль не зачынена века. Любіце — пакуль на вуснах усмешка".

Думаю, гэта не агульныя словы, а шчырая споведзь паэта перад сваімі чытачамі і перад самім сабой. Яе не трэба ігнараваць. І кожны твор, напісаны кім бы то ні было, павінен

і Любоў Іванаўна даручалі мне перакладаць п'есы на беларускую мову. А калі Мазалеўскую праз нейкія там інтрыгі вымусілі пакінуць тэатр, мы разам з Уладзімірам Мацвеевічам ездзілі у Ждановічы, дзе на дачы жылі ўлетку Любоў Іванаўна з Паўлам Сцяпанавічам, каб угаварыць яе вярнуцца на пасаду галоўнага рэжысёра. І нам гэта ўдалося. А дапамог сусед Мазалеўскай па дачы Аркадзь Куляшоў...

Неўзабаве дзядзька Валодзя прапанаваў мне паспрабаваць сілы ў драматургіі.

—"Папараць-кветку" бачыў? — спытаўся ён напачатку.

—Бачыў.

—Ну, і як?

—Выдатна! — не прамарудзіў я з адказам.

—А хто аўтар?

—Іван Козел.

—Ды я не пра гэта. Галоўнае, што ён — звычайны вясковы настаўнік. Праўда, Любоў Іванаўна дапамагала яму. Думаю, што і табе яна ў дапамозе не адмовіць.

З далейшай размовы высветлілася, што тэатр мае пільную патрэбу ў п'есе паводле беларускага фальклору. Я абяцаў падумаць.

Першымі сваімі задумкамі падзяліўся з Петрусём Макалём, з якім мы моцна ў той час сябравалі. Прачытаў яму нават некалькі радкоў, што прасіліся ў будучую п'есу:

Чутка ёсць на Беларусі,
Што прыносіць шчасце бусел...

Пятрусь тут жа дадаў:

Вось ён, бусел, на страсе.
Што ж нам шчасце не нясе?..

Гэта было ў вёсцы, пад Талькай. Я зірнуў у вакно і сапраўды ўбачыў на страсе суседняй хаты бусла...

Так пачалася наша сумесная праца над п'есай-паданнем "За лясамі дрымучымі". Між іншым, мы ніяк не маглі прыдумаць назву. Ужо і апошняя кропка пастаўлена, а назвы ўсё няма. Прапанавала нам яе Любоў Іванаўна. Так яна і прыжылася.

На зборы трупы п'есу чытаў я. Вельмі хваляваўся. Уладзімір Мацвеевіч, які сядзеў побач са мной, скарыстаўшыся зручным момантам, шапнуў мне:

—Супакойся. Усё добра...

Пасля таго, як прагучала апошняя рэпліка і я з палёгкай прамовіў "Заслона", у зале запанавала цішыня. Я зноў захваляваўся.

—Ну, як? — пачуўся нарэшце голас Любові Іванаўны. — Хто хоча выказацца?

Тут падняўся высокі, крыху няўклюдны Вацлаў Окалаў, адзін са старэйшых артыстаў тэатра.

—Гэта ж фантан! — у голасе яго гучала захапленне. — Ставіць! І неадкладна!

Гул згоды змяніў нядаўнюю цішыню.

—Значыцца, так, — гучна і рашуча падвяла вынік нядоўгага абмеркавання Любоў Іванаўна,— п'есу прымаем і ставім.

Уладзімір Мацвеевіч ціснуў рукі мне і Макалю і радаваўся так, нібы быў яшчэ адным сааўтарам.

Ставіла спектакль сама Мазалеўская. І ён меў даволі трывалы поспех.

А яшчэ праз колькі часу Уладзімір Мацвеевіч прапанаваў мне пасаду загадчыка літаратурнай часткі.

—Любоў Іванаўна згодная, — дадаў ён для большай пераканальнасці.

Пасля нядоўгіх ваганняў я пакінуў рэдакцыю часопіса "Бярозка", дзе працаваў да гэтага, і канчаткова знітаваў сваё жыццё з тэатрам юнага гледача.

Узаемаадносіны з кіраўнікамі тэатра ў мяне заставаліся найлепшыя. Асабліва — з дырэктарам. Я па-ранейшаму зваў яго дзядзькам Валодзем, а ён мяне — Алікам ці пляменнічкам. Віктар Лебедзеў — малады ў той час акцёр, а цяпер ужо народны артыст Беларусі — аднаго разу пацікавіўся нават:

—Вы што, сапраўды сваякі?

Давялося растлумачыць, што ў гады майго маленства на Беларусі не называлі старэйшых па імю і па імю па бацьку, а вось так: дзядзька, цётка...

У трупе тэатра, побач з гадаванцамі Мазалеўскай, якіх яна прывяла з сабой адразу з тэатральнага інстытута, працавалі і старыя артысты: Уладзімір Говар-Бандарэнка, Вацлаў Окалаў, Паліна Ротар, Леў Міхайлаў, Юлія Фляйто... Некаторыя з іх выступалі разам з Уладзімірам Мацвеевічам яшчэ на даваеннай цюгаўскай сцэне, некаторыя ў вайну заставаліся ў акупаваным Мінску і нават іграліі ў гарадскім тэатры, за што і былі асуджаныя ды сасланыя ў адпаведныя мясціны. Толькі пазней вярнуліся ў Мінск. Мяне дзівіла, што ў той складаны і няпэўны час дырэктар ставіўся да іх гэтак жа шчыра і па-добраму, як да ўсіх астатніх. Некаторых асмельваўся нават да ганаровых званняў прадстаўляць. Па некалькі разоў. Хаця меў праз гэта непрыемнасці...

Вельмі любіў Уладзімір Мацвеевіч гастролі. Проста жыць без іх не мог. Любоў Іванаўна давала яму ў гэтых адносінах поўную волю. І тэатр ездзіў. Паказваў свае спектаклі ў Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Рызе, Вільні, Таліне. Да цалінных земляў Казахстана дабіраўся.

Дзе б ні праводзіліся гастролі, Уладзімір Мацвеевіч сваю ўступную вітальную прамову нязменна пачынаў словамі:

—Мы прывезлі вам, дарагія сябры, сардэчнае прывітанне ад сінявокай сястры Беларусі!..

Сінявокая Беларусь... Відаць, дужа любіў наш дырэктар Бацькаўшчыну. Таму і не мог абысціся без гэтых слоў. І прамаўляў іх гэтак шчыра, гэтак пранікнёна, што зала абавязкова адказвала выбухам воплескаў...

Мінаў час. Пайшла ад нас Любоў Іванаўна. Назаўсёды пайшла. Перавялі на іншую работу Уладзіміра Мацвеевіча. Пасля доўгіх ваганняў прызначылі на пасаду дырэктара мяне. Я шмат у чым стараўся быць падобным да свайго мудрага і добрага папярэдніка. Ці ўдавалася, ці не — не мне меркаваць.

Уладзімір Мацвеевіч быў нястомны ваяр тэатральнага мастацтва. І пайшоў з жыцця як сапраўдны баец. У нейкай вышэйшай навучальнай установе ішоў агляд студэнцкай мастацкай самадзейнасці. У складзе журы быў і Уладзімір Стэльмах. І раптам — сэрца! І ўсё...

А мне ўсё ўспамінаецца тая кантрамарка. Кантрамарка ад дзядзькі Валодзі, якая адыграла ў маім жыцці вельмі важную ролю, адчыніўшы ўваход у свет тэатра.

Артур ВОЛЬСКІ

Мае пажаданні Сямёну Букчыну

Прачытаў я ў "Народнай волі" артыкулы Сямёна Букчына "Повисле", і захацелася мне адгукнуцца, бо ў падзагалоўку канкрэтызуецца: "Белорусско-польские заметки". Аўтар пачынае сваю гаворку паведамленнем пра варшаўскія вуліцы Тамка і Новы Свят. З Тамкі на Новы Свят найбольш зручна хадзіць па вуліцы Фоксаль, на якой калісьці знаходзіўся Дом савецкай навукі і культуры. Дырэктарам яго на нейкім этапе з'яўляўся беларускі гісторык Лойка Леанід Вікенцьевіч. У 1982 годзе, калі не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы адзначалася стагоддзе з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа Л. В. Лойка як саветнік Пасольства СССР на дыпламатычнай машыне вазіў беларускіх удзельнікаў урачыстых мерапрыемстваў на Беласточчыну, дзе юбілеі нашых песняроў шырока адзначаліся ў розных мясцінах. Потым ужо, у 90-х гадах, Л. В. Лойка ў Мінску з'яўляўся рэдактарам часопіса "Беларуская мінуўшчына". А яшчэ ж у канцы 70-х — пачатку 80-х гг. саветнікам Пасольства СССР у Варшаве працаваў беларус Каўка Аляксей Канстанцінавіч, які сваё жыццё прысвяціў справе даследавання гісторыі беларускай культуры, працуючы ў Акадэміі навук Расійскай Федэрацыі ў Маскве. Ён, у прыватнасці, з'яўляецца аўтарам добра вядомай скарыназнаўцам манаграфіі "Тут мой народ. Францішак Скарына і беларуская літаратура XVI — пачатку XX ст." (Мінск, 1989).

Паколькі ў самым пачатку павялася гаворка пра вуліцу Тамка, то яшчэ хацелася б нагадаць, што тут, недалёка ад вуліцы Фоксаль, жыве сям'я Юрыя Туронка, самаахвярнага і дасведчанага даследчыка беларускай гісторыі і культуры. Пад канец 2000 г. беластоцкая беларуская газета "Ніва" апублікавала цэлую серыю артыкулаў "Сага сям'і Туронкаў". Я калісьці меў аказію пераканацца, што ў гэтай сям'і і дарослыя і дзеці дома гаварылі і, я перакананы, сёння гавораць толькі па-беларуску. Я згадаў гэта, калі пару (ці некалькі) месяцаў таму назад па нашым радыё пачуў, як у нейкай перадачы нашчадкі К. Крапівы і П. Глебкі гаварылі толькі па-руску. У нас тут беларуская мова нават у такіх сем'ях не збераглася.

На вуліцы Тамка прыблізна ў тым самым раёне перад смерцю жыў Міхал Федароўскі, славуты аўтар шматтомнага збору беларускага фальклору "Люд беларускі на Русі літоўскай".

Шмат чаго нашаму чытачу можна было б расказаць пра тое, што ў Варшаве ў XX стагоддзі рабілася і робіцца сёння для беларуска-польскага ўзаемазбліжэння і ўзаемаразумення ды і для вывучэння гісторыі беларускай культуры і літаратуры. У Варшаўскім універсітэце некалькі дзесяцігоддзяў плённа працуе кафедра беларускай філалогіі, якую з 1976 г. узначальвае прафесар Аляксандр Баршчэўскі, вядомы ў Беларусі пад паэтычным псеўданімам Алесь Барскі. Яго 70-гадовы юбілей у лістападзе 2000 года ўрачыста адзначаўся ў Мінску і ў Саюзе пісьменнікаў, і ў беларускім друку. Беларускай справе прысвяціла сваё жыццё і яго жонка Ніна Баршчэўская. Слухачы беларускіх перадач Польскага радыё добра ведаюць яе голас.

Пры жаданні нешта ж можна было б сказаць пра многіх дзеячаў беларускай культуры і літаратуры: і пра Аляксандру Бергман, аўтара манаграфій пра беларускія справы ў міжваеннай Рэчы Паспалітай, а таксама пра жыццё і дзейнасць Браніслава Тарашкевіча. Яе муж Сяргей Бергман, які памёр у мінулым годзе, калісьці сядзеў у адной камеры з Кузьмой Чорным. У Варшаве жылі не толькі Міхал Федароўскі, але і Рамуальд Зямкевіч, і Лявон Вітан-Дубейкаўскі, і іншыя дзеячы беларускай культуры і літаратуры.

Не дзе-небудзь, а ў Варшаве зарадзілася ідэя стварэння Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Праўда, у "Праграме" Трэцяга Міжнароднага кангрэса беларусістаў (Другая сесія, Мінск, 4—7 снежня 2000 г.) паведамляецца: "Першы, устаноўчы, Міжнародны кангрэс беларусістаў адбыўся ў Мінску 25—27 мая 1991 г. На ім была створана Міжнародная асацыяцыя беларусістаў, прыняты яе статут, выбраны камітэт МАБ". А ці дакладна ўсё гэта? Што ж было на самай справе? Дык вось яшчэ ў чэрвені 1990 г. усе ўдзельнікі небывала шырокай Міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай юбілею Францішка Скарыны, атрымалі паведамленне наступнага зместу: "Маем гонар паведаміць Вам, што ў Варшаве ўзнікла ініцыятыўная група, якая ставіць перад сабой заданне паклікаць да жыцця міжнародную асацыяцыю беларусістаў. Добрай нагодай для ажыццяўлення гэтага намеру з'яўляецца ідэя ўшанавання органам ЮНЕСКА 500-годдзя з дня нараджэння Францішка Скарыны — беларускага першадрукара, вучонага і асветніка, і таксама арганізаваная Камітэтам славяназнаўства Польскай акадэміі навук, кафедрай беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, філіялам Варшаўскага універсітэта ў Беластоку, Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы Міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная гэтаму юбілею.

Ініцыятыўная група пасля правядзення кансультацыі з беларускім і польскім асяроддзямі беларусістаў прапануе, каб на ўспомненай канферэнцыі (па рэалізацыі навуковай праграмы) было праведзена першае пасяджэнне, у якім маглі б прыняць удзел усе асобы, зацікаўленыя стварэннем Асацыяцыі. На гэтым пасяджэнні плануецца правесці дыскусію над мэтамі і заданнямі Асацыяцыі, разгледзець праект статута і зацвердзіць яго, выбраць праўленне Асацыяцыі". Ад імя ініцыятыўнай групы зварот падпісалі Аляксандр Баршчэўскі і Міхал Кандрацюк.

Пасяджэнне такое адбылося. Старшынёю Асацыяцыі быў абраны Адам Мальдзіс. Думаецца, няма патрэбы паведамляць нашым чытачам, хто гэта такі. І ці маем мы права сёння забываць пра тую падзею, пішучы пра нараджэнне Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў?

Пры аказіі хачу звярнуцца з прапановай да аўтара артыкулаў у "Народнай волі": Сямён Уладзіміравіч, раскажыце, калі ласка, пра дзейнасць Бурага і Лупашкі з Арміі Краёвай каля Гайнаўкі ў пасляваенны перыяд і пра тое, як сучасныя ўлады забараняюць ушанаваць памяць беларускіх ахвяр іх бандытызму і шматлікіх злачынстваў. У апошнія гады ў Польшчы шмат разоў пра гэта пісалася. А гэты ж Лупашка і сёння лічыцца нацыянальным героем. Банда падначаленага яму Бурага забівала беларускіх мужыкоў толькі за тое, што яны былі беларусамі.

Нам сёння цікава было б прачытаць пра Чэслава Сэнюха (ён родам з-пад Любчы на Навагрудчыне), пра яго пераклад паэмы Якуба Коласа "Новая зямля". І пра тое, што найнавейшыя польскія энцыклапедыі пішуць пра беларускую літаратуру, гісторыю ды і пра канкрэтных беларусаў. А яшчэ ж у Варшаве жыве наш зямляк Юрась Гарбінскі, які сёння плённа працуе на ніве беларуска-польскіх сувязей, наладжвае кантакты паміж адпаведнымі інстытутамі нашых акадэмій навук, апублікаваў цікавыя і каштоўныя зборнікі матэрыялаў па гісторыі беларускай грамадскай думкі і культуры. У Вас, Сямён Уладзіміравіч, небывала шырокае поле дзейнасці. І пры жаданні, пры ахвоце можна сеяць і дачакацца вельмі багатага плёну. Я пералічыў далёка не ўсіх людзей і не ўсе праблемы, якія маглі б зацікавіць нашага чытача.

І апошняе. Можа, гэта дробязь. Але мне непрыемна было бачыць слоўца "na margineze" і "на маргинезе". Павінна ж быць "na marginesie" — "на маргинэсе". Нейкая ж розніца ўсё ж такі ёсць. Прачытаўшы гэта, я зразумеў, што ў самым пачатку назва варшаўскага часопіса набыла выгляд "Wiez" невыпадкова. У польскай мове няма такога слова, а ёсць слова "Więź".

Будзем чакаць новых сустрэч.

Уладзімір КАЗБЯРУК

атрымліваць аб'ектыўную, доказную ацэнку. Так, трэба любіць чалавека пры яго жыцці.

19 сакавіка.

Толькі што атрымаў па падпісцы другі нумар за гэты год часопіса "Полымя", пачаў, як заўсёды, перш-наперш чытаць паэзію, змешчаную ў ім. На адным дыханні чытаў адну за адной дзве вялікія памерам падборкі вершаў Казіміра Камейшы і Віктара Шніпа. Абодва паэты і добрыя і розныя, як заўважыў калісьці Уладзімір Маякоўскі. Але ў кожнага з іх ёсць толькі сваё, тое, што ўласціва іхняй паэзіі, — свае назіранні, перажыванні і вобразнае выказванне інтымных пачуццяў, мастацкае асэнсаванне жыццёвых з'яў.

Вось у Казіміра Камейшы:

Хоць сёння не з самага краю
За іншымі мераю след,
Жыву, нібы грошы збіраю
На нейкі зваротны білет.

Лірычны герой гэтага верша "Падарожжа ў дзень" пасля вайны быў яшчэ малым хлапчуком; "на хісткім падножжы трамвайным у час гэты тлумны ўляцеў", але не забывае свайго маленства, вяртаецца ў яго сваімі думкамі, развагамі. І вось ён ужо ў сталым узросце, у другім вершы "Капліца" стаіць перад алтаром, ставіць свечку сваім продкам. У яго ўзнікае святое пачуццё веры, якая перапаўняе душу:

Дагарае ціха свечка
І канчаецца імша.
Пану Богу ў родным свеце
Спавядаецца душа.

Сам паэт разам са сваім лірычным героем спавядаецца перад сваім народам, выказваючы ў адносінах да яго шчырае, сардэчнае пачуццё любові, павагі і вернасці. Такія вершы запамінаюцца надоўга.

У Віктара Шніпа іншае, сваё бачанне свету, але ў кожным вершы прысутнічаюць тыя ж шчырасць і сардэчнасць, глыбокія думкі і перажыванні. Аўтар імкнецца па-філасофску асэнсаваць тое, што робіцца сёння ў нашым жыцці і прапускае кожнае слова праз сваё сэрца. Яго паэзіі характэрны больш баладны лад, кароткае, але глыбокае, эмацыянальнае асэнсаванне кожнай жыццёвай з'явы. Вось у вершы "Згубіцца" лірычны герой заўважае сам, куды вядзе яго шлях:

Згубіцца ў восеньскім густым тумане,
Нібы згарэць у восеньскім агні,
Нібы разбіцца на аэраплане,
Упаўшы з неанёльскай вышыні...

Як гэта пераклікаецца з тымі авіяцыйнымі і наземнымі катастрофамі, якія адбываюцца сёння на ўсёй нашай неабсяжнай матухне-зямлі! Але герой не губляе свайго пачуцця і веры ў жыццё, у самога сябе:

Згубіцца і глядзець у цемру неба
І не баяцца, што жыццё міне,
І будзе нам нічога ўжо не трэба,
Як пылу, што прыгрэўся на акне...

Прыемна чытаць такія вершы, якія выклікаюць у цябе самога глыбокі роздум і перажыванні, пачуцці любові да роднай зямлі. Чытаючы іх, проста радуешся, што наша беларуская паэзія не губляе свайго ўзлёту, а наадварот, набірае новыя вышыні, працягвае ісці слядамі найлепшых яе майстроў — такіх, як Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Пімен Панчанка, Анатоль Вялюгін, Рыгор Барадулін. Тут не ведаеш — каго паставіць першым, каго другім... Усе яны, як і названыя мной два паэты, вартыя таго, каб іх чыталі...

Мінская абласная арганізацыя прафсаюза работнікаў культуры выказвае глыбокае спачуванне дырэктару Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" ШУКАНЗіне Мікалаеўне з выпадку напаткаўшага яе вялікага гора — трагічнай смерці сына Дзмітрыя.

“У будучыню — з надзеяй”

З мая 1991 года рэктарам Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага быў падпісаны загад аб утварэнні на базе філалагічнага факультэта самастойнай структурнай адзінкі — факультэта беларускай філалогіі і культуры. Гэта падзея — яркая з'ява ў справе беларускай нацыянальнай асветы: на працягу 70 гадоў ніводная педагагічная ВНУ не мела беларускага факультэта. І вось першая цагліна была закладзена. Ініцыятарамі, аўтарамі ідэі і непасрэднымі стваральнікамі новага факультэта сталі першы прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Л.Н. Ціханаў (цяпер рэктар БДПУ), дэкан філфака прафесар А. М. Бардовіч (цяпер дэкан факультэта рускай філалогіі), а таксама тагачасныя загадчыкі кафедраў прафесары М.С. Яўневіч і М.І. Мішчанчук. Цікава, з любоўю расказвае пра свой факультэт яго дэкан Аляксандр ЛУГОЎСКІ:

— За першыя тры гады на факультэце беларускай філалогіі і культуры адбыліся вялікія як колькасныя, так і якасныя змены. Яшчэ ў канцы 80-х гадоў на беларускім аддзяленні філфака Мінскага педагагічнага інстытута набіралі на дзённую форму навучання толькі 50 чалавек і 25 (з вялікімі цяжкасцямі) на завочнае аддзяленне. А ўжо ў 1991 годзе на першы курс былі залічаны: на стацыянар — 170, на завочнае аддзяленне — 112 і на вячэрняе аддзяленне — 77 чалавек.

Практычна адначасова з адкрыццём факультэта была створана кафедра тэорыі і гісторыі культуры, якую ўсе 10 гадоў узначальвае прафесар А.У. Рагуля. Новая кафедра з першых дзён свайго існавання распачала грунтоўную культуралагічную падрыхтоўку студэнтаў. Адразу ж 2 курсы на факультэце перайшлі на новы вучэбны план, які прадугледжваў вывучэнне цэлага блока культуралагічных дысцыплін. Праз 5 гадоў упершыню ў нашай краіне быў зроблены выпуск настаўнікаў па спецыяльнасці “Беларускаямова і літаратура, сусветная і айчынная культура”. Школа атрымала якасна новага настаўніка-філолага, які не толькі грунтоўна ведае родную мову і літаратуру, але і добра арыентуецца ў пытаннях духоўнай культуры.

Сёння факультэт, на якім займаюцца каля 2000 студэнтаў, а вучэбны працэс забяспечваюць больш за 150 выкладчыкаў, уяўляе сабою моцны шматвектарны цэнтр па падрыхтоўцы педагагічных кадраў у галіне філалогіі. Стаўшы 10 гадоў таму самастойным, ён не проста змяніў шыльду, ён змяніў змест адукацыі. Творчасць — вось галоўнае крэда, якім кіруецца ў сваёй працы ўвесь педагагічны калектыў факультэта. У 1993 годзе па рашэнні вучонага савета універсітэта пры кафедры беларускай літаратуры (загадчык — дацэнт М.Ф. Шаўлоўская) была распачата падрыхтоўка спецыялістаў па дзіцячай і юнацкай журналістыцы. Жыццёвы і педагагічны вопыт падказваў, што журналістам, якія працуюць у дзіцячых рэдакцыях сродкаў масавай інфармацыі, часта не хапае філалагічных і педагагічных ведаў. Сёння нашы выпускнікі працуюць у рэдакцыях газет “Раніца”, “Чырвоная змена”, “Знамя юности”, “Сям'я”, на Беларускім радыё і тэлебачанні.

Даручэнне да падрыхтоўкі дзіцячых і юнацкіх журналістаў кафедры беларускай літаратуры не было выпадковым. Кафедра для такой дзейнасці мела вялікія магчымасці: тут выконваліся і выконваюцца грунтоўныя навуковыя даследаванні па дзіцячай літаратуры, тут падрыхтавана “Роднае слова” і падручнік для пачатковых класаў (аўтар — дацэнт М.Ф. Шаўлоўская).

Галоўным у працы кафедры беларускай літаратуры, безумоўна, з'яўляецца даследаванне літаратуразнаўчых праблем, і таму заканамерным стаў той факт, што на гэтай кафедры ўпершыню ў Беларусі быў падрыхтаваны і выдадзены пад рэдакцыяй М.А. Лазарука і А.А. Семяновіча чатырохтомны падручнік для ВНУ “Гісторыя беларускай літаратуры”.

Адной з самых прызнаных не толькі ва універсітэце, але і ва ўсёй краіне стала кафедра беларускага мовазнаўства, на якой былі створаны навуковыя школы Ф.М. Янкоўскага і М.С. Яўневіча. Па падручніках прафесара М.С. Яўневіча, напрыклад, беларускія дзеці вывучалі родную мову на працягу 32 гадоў (агульны тыраж падручніка — каля 7 мільёнаў экземпляраў). Шмат гадоў старшакласнікі карысталіся падручнікамі, якія падрыхтавалі М.Ц. Кавалёва і Л.П. Падгайскі. Зусім нядаўна з'явілася новае пакаленне падручнікаў для школы, аўтары якіх — таксама выкладчыкі кафедры беларускага мовазнаўства. Манаграфіі, слоўнікі, дзесяткі падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў — такі далёка не поўны пералік навуковых прац кафедры.

Пашыраюцца навуковыя і педагагічныя сувязі кафедры з суседнімі краінамі. З 1994 года на факультэце беларускай філалогіі і культуры выкладчыкамі кафедры беларускага мовазнаўства вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па польскай мове, а за 1999 года — па літоўскай. Па ініцыятыве кафедры наш педагагічны універсітэт заключыў пагадненні аб супрацоўніцтве з Польскім інстытутам у Мінску, Пасольствам Рэспублікі Польшча ў Беларусі і Вільнюскім педагагічным універсітэтам.

Увогуле, факультэт беларускай філалогіі і культуры рыхтуе спецыялістаў па чатырох замежных мовах: польскай, літоўскай, англійскай і нямецкай. Дзве апошнія з'яўляюцца асноўнымі спецыяльнасцямі. Назіранне сведчыць, што спалучэнне замежнай мовы з беларускай апраўдана. Гэтыя спецыяльнасці карыстаюцца папулярнасцю: конкурс пры паступленні складае да сямі чалавек на месца. Радуе тое, што студэнты, якія абралі замежную мову як спецыяльнасць, дасканала валодаюць беларускай мовай і з павагаю да яе ставяцца.

Можна сказаць, што такая моўная шматвектарнасць уводзіць беларускую мову, літаратуру, культуру, беларускую педагогіку ў еўрапейскі кантэкст. Да таго ж, створаны факультэт народнай культуры, дзе распрацавана і зацверджана “Перспектыўная праграма падтрымкі беларускай мовы” і штогод праводзяцца агульнаўніверсітэцкія конкурсы на лепшую навуковую працу, выкананую на беларускай мове.

Новая рэальнасць ужо на пачатку 90-х гадоў патрабавала карэннага перагляду ўсёй сістэмы навучання, пераадолення замкнутасці і адарванасці ад сусветнага вопыту. Тая традыцыйная сістэма навучання, якая складалася ў педінстытутах на працягу многіх дзесяцігоддзяў, па шэрагу прычын не можа задавальняць грамадства. Па-першае, пры “валавым” падыходзе да падрыхтоўкі настаўнікаў не могуць па-сапраўднаму развівацца здольнасці найбольш таленавітых студэнтаў. Па-другое, у рэспубліцы былі адкрыты новыя тыпы школ сярэдняга звяна (гімназіі, ліцэі, каледжы), якія патрабавалі спецыяльна падрыхтаваных педагогаў. Узважыўшы ўсё гэта, вучоны савет БДПУ прыняў рашэнне перайсці да шматузроўневай адукацыі, як гэта робіцца ў многіх краінах свету. З улікам вопыту краін блізкага і далёкага замежжа і гістарычнага вопыту навучальных устаноў Беларусі была распрацавана канцэптуальна новая, нацыянальна адметная сістэма падрыхтоўкі бакалаўраў і магістраў. Факультэт беларускай філалогіі і культуры адным з першых прыступіў да яе ўкаранення. Сёння гэта сістэма прызнана педагагічнай грамадскасцю і паспяхова рэалізуецца многімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Беларусі.

У апошнія гады выпрацавалася стройная сістэма пераемнасці ў навучанні паміж факультэтам і двума педагагічнымі каледжамі горада Мінска, якія працуюць па агульных вучэбных планах і агульных вучэбных праграмах, што дае магчымасць маладым людзям без перашкод і лішняй затраты часу перайсці з сярэдняй у вышэйшую навучальную ўстанову. За свае 10 гадоў факультэт беларускай філалогіі і культуры стаў добра вядомы ў свеце, пра што сведчыць праведзены на яго базе Другі міжнародны кангрэс “Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя”. На гэты форум, які ўжо набывае статус традыцыйнага, сабраліся навукоўцы з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Літвы, ЗША, Канады і іншых краін свету, каб падвесці вынікі тысячагадовага гісторыка-культурнага развіцця этнасаў, для якіх Беларусь стала роднаю.

Факультэт сталее, замацоўвае свой міжнародны аўтарытэт, таму можна глядзець у яго будучыню з надзеяй і ўпэўненасцю.

Гутарыла
Маргарыта ПРОХАР

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА — ЛіМ — ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; рэдакцыя газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Галоўны рэдактар
Алесь ПІСЬМЯНКОЎ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Вольга БАРАБАНШЧЫКАВА
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Павел ВЕРАБ'ЁЎ,
Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ — *намеснік галоўнага рэдактара,*
Алесь ГАЎРОН — *адказны сакратар,*
Мікола ГІЛЬ,
Алесь МАРЦІНОВІЧ,
Яўген РАГІН,
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ,
Віктар ШНІП — *першы намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі — 284-8461
намеснікі галоўнага рэдактара — 284-8525, 284-7985
АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-8204
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7985
літаратурнага жыцця — 284-8462
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7985
паэзіі і прозы — 284-8204
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно і тэлебачання — 284-8153
выяўленчага мастацтва, аховы помнікаў — 284-8462
навін — 284-8462
мастацкага афармлення — 284-8204
фота-карэспандэнт — 284-8462
бухгалтэрыя — 284-8462

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
(г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79)
Індэкс 63856 Наклад 2806
Нумар падпісаны ў друк 14.6.2001 г. у 17.30
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ 3351

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Суфлёр

ПАДКАЗКІ—АНОНСЫ—ПАРАДЫ АД "ЛіМа"

Беларускі Дзяржаўны універсітэт культуры

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ АСПІРАНТАЎ НА 2001 ГОД

з адрывам і без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:

05.25.03 — Бібліятэказнаўства, бібліяграфіязнаўства і кнігазнаўства
13.00.05 — Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці
17.00.09 — Тэорыя і гісторыя мастацтва
24.00.01 — Тэорыя і гісторыя культуры
24.00.03 — Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў

Правілы прыёму — агульныя. Прыём дакументаў да 20 верасня 2001 года. Уступныя экзамены з 1 па 30 кастрычніка 2001 года.

Дакументы накіроўваць па адрасе: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, аспірантура. Даведкі па тэлефоне 222-83-41.

"Што ж ты мне сэрца параніў?.." *Фота Ул. КАГУЦЕНКІ*

Яўгеній БАРАТЫНСКІ

Эпіграмы

У невуцтве
захопленым сваім
На свой аршын ён славу
нашу мерыць;
Ды ён забыў:
няма кляйма на ім,
І аднаму запалу свет
не верыць.
Як свеціцца
сяброўскаю лухтой!
Страшэнна
задаволены сабой!
Ён хваліцца душой
сваёй дыхтоўнай.
Галубчык мой!
Павер без дурнаты,
Што з дурняў,
нам вядомых, безумоўна,
Смяшнейшы
і ярчэйшы толькі ты.

●

Хто ён, мой лаяльнік
нязменны?
Хто ён, прадажнік
мой патрэбны?
Зайздроснік
неадступны мой?
Не варта думаць: —
родны, свой!
Часцей, чым друг,
нам вораг важны, —
Спрадвеку свет
-так паўстае;
О, як ён, вораг,
нам прыязны,
Той, што прырода нам дае!

●

І ты паэт, і ён паэт;
Ды ў вас
адрозненне знаходзяць:
Твае радкі у друк выходзяць,
Выходзяць і яго, —
ды ў свет.

●

У сваіх вершах
сумам дыша;
Дудзеннем іх наводзіць сон.
Не гавару: нашто ён піша,
Навошта іх чытае ён?

●

Пад Пушкіна не першы год
Крамзоліць
нешта вершаплёт,
Ды не займее
славы слыннай,
І кацяня я бачу ў ім,
Што ціха мяўкае зусім
На голас зычны, Лебядзіны.

●

Не трэба браць
парнаскага пяра,
Яно не ваша,
прыгажуні-павы!
Красуням не замнога
ў ім дабра,
І ім Амур даў іншыя забавы.

Ці вам любоў з-за
рыфмаў забываць,
Смяюцца з рыфмаў
(так даўно вядзецца),
Бруі іх лёгка зносіць,
не ўтрымаць —
На пальчыках
чарніла застаецца.

●

Кіпцюрастая лятуха,
Эпіграма-рагатуха.
Непаседай паўстае,
Трэцца там яна, дзе твары,
І, убачыўшы пачвару,
Тут жа ўчэпіцца ў яе.

Пераклаў
Юрась СВІРКА